WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЛІСТАПАДА 2011 г.
АЎТОРАК
№ 208
(27072)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎРУЧЫЎ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖАНЫМ ЛЮДЗЯМ КРАІНЫ

Галоўныя рэсурсы Беларусі — гэта праца і талент яе грамадзян. Аб гэтым 31 кастрычніка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод і Дзяржаўных прэмій заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Фота БЕЛТА.

Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч.

Як адзначыў Прэзідэнт, гэтая цырымонія асаблівая, паколькі на ёй прысутнічалі не толькі людзі, удастоеныя высокіх званняў, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі, але і лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі, якая ўручаецца раз у два гады. «Гэтыя ўзнагароды сімвалізуюць тую вяршыню, да якой вы ішлі, пераадольваючы цяжкасці і шукаючы аптымальныя рашэнні».

Прэзідэнт падкрэсліў, што апошнія гады патрабаванні да саіскальнікаў дзяржпрэмій значна ўзраслі. Важнейшымі крытэрыямі сталі перавага іх распрацовак над сусветнымі аналагамі, канкурэнтаздольнасць на рынках і ўклад у забеспячэнне нацыянальнай бяспекі. У сваю чаргу аўтары праектаў у галіне культуры павінны былі атрымаць высокія ацэнкі калег і спецыялістаў, а таксама заслужыць шырокае прызнанне грамадства.

З удзячнасцю і пажаданнямі будучых поспехаў кіраўнік дзяржавы ўручыў дыпломы і ганаровыя знакі групе металургаў з Магілёва. Яны не толькі распрацавалі перадавую тэхналогію ліцця, але і арганізавалі прадпрыемства, якое выпускае інавацыйную прадукцыю, запатрабаваную як у краіне, так і за яе межамі. Дзяржаўнай прэміі ўдастоіліся таксама распрацоўшчыкі кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці. «Эфектыўныя канструктарскія рашэнні значна павысілі канкурэнтаздольнасць і перавагу нашых машын. Гэта дае магчымасць БелАЗам утрымліваць больш за 30 працэнтаў сусветнага рынку велікагрузнай тэхнікі ва ўмовах моцнай канкурэнцыі з боку транснацыянальных кампаній».

Аляксандр Лукашэнка ўручыў узнагароды ўрачам-траўматолагам, якія стварылі сучасную тэхналогію хірургічнага лячэння артападычнай паталогіі тазасцегнавога сустава ў дзяцей і падлеткаў. «Гэта методыка рынцыпова новая ў сусветнай медыцыне і называецца «беларускай». «Дзякуй вам за высакародную, адданую працу. Ваша распрацоўка не толькі павысіла прэстыж Беларусі ў сусветнай супольнасці, але, што самае галоўнае, дапамагла вярнуць здароўе многім юным грамадзянам Беларусі і іншых краін».

Акрамя таго, за ўклад у развіццё айчыннага мастацтва Дзяржаўных прэмій удастоены архітэктары і мастакі. У тым ліку стваралнікі мемарыяла «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» і серыі графічных работ «Вароты мінулага». Ордэны, медалі і ганаровыя званні таксама атрымалі многія дзеячы культуры, прызнаныя майстры, якія прысвяцілі сваё жыццё музычнаму і тэатральнаму мастацтву, вядомыя журналісты і спартсмены.

Высокіх дзяржаўных узнагарод таксама ўдастоены ваеннаслужачыя і супрацоўнікі праваахоўных органаў. «Мы ўзнагароджваем людзей, якія мелі непасрэднае дачыненне да раскрыцця тэракта ў мінскім метро. І тых, хто ахоўвае парадак нашай Радзімы кожны дзень», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «У рэспубліцы не дапусцілі разгулу злачыннасці і хаосу. Беларусь застаецца мірнай і з'яднанай краінай», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, на фоне ўзброеных канфліктаў, якімі ахоплены сучасны свет, кожны разумее, што галоўнае ў жыцці — гэта чыстае неба над галавой, спакой і ўпэўненасць нашых людзей у заўтрашнім дні. Прэзідэнт адзначыў, што ўвесь час расце прэстыж воінскай службы, аўтарытэт органаў унутраных спраў, і ў гэтым вялікая заслуга тых, хто атрымаў сёння ўзнагароды.

Звяртаючыся да ўзнагароджаных, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яны яшчэ раз пацвердзілі праўдзівасць слоў аднаго з антычных філосафаў, які гаварыў: «Як шмат спраў лічыліся немагчымымі, пакуль яны не былі зроблены».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Планета людзей

НАРОДЖАНЫЯ ЎЧОРА — 7-МІЛЬЯРДНЫЯ ЖЫХАРЫ

Учора свет адзначыў Дзень сямі мільярдаў. Памятныя сертыфікаты 7-мільярднага жыхара Зямлі атрымалі ці атрымаюць сёння ўсе дзеці, якія нарадзіліся ў Беларусі 31 кастрычніка.

Прадстаўнік ААН у Рэспубліцы Беларусь Антоніус Брук, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар Старавойтаў і першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч наведалі ў сімвалічны дзень радзільнае аддзяленне РНПЦ «Маці і дзіця», павіншавалі матуль траіх нованароджаных (Алісы Папкоўскай, Станіслава Барысевіча і Арнольда Шціля) і ўручылі ім памятныя сертыфікаты з падарункамі. Падобная акцыя адбылася ў барысаўскім радзільным доме.

Дзень сямі мільярдаў сапраўды носіць сімвалічны характар, паколькі атрымаць дакладны разлік насельніцтва свету немагчыма: нават у развітых краінах да 3 працэнтаў насельніцтва не ўлічваюцца падчас правядзення перапісу. Як вядома, падчас дасягнення планетай 6-мільярднай мяжы насельніцтва было вырашана прызнаць гэта дзетанарадждэнне за хлопчыкам з Сараева (Боснія і Герцагавіна). Аднак на гэты раз, кажа спадар Антоніус Брук, ААН вырашыла проста павіншаваць 31 кастрычніка ўсіх парадзіх у розных краінах. Наогул можна меркаваць, што 7-мільярдны жыхар, хутчэй за ўсё, — ураджэнец Індыі, дзе, паводле статыстыкі, сёння самая вялікая колькасць нованароджаных. Паводле разлікаў, у 2025 годзе Індыя стане краінай з самай вялікай колькасцю насельніцтва. А вось колькасць насельніцтва Еўропы дасягне максімальнага значэння — 0,74 млрд — прыкладна ў 2025 годзе, пасля чаго пачнецца яе скарачэнне.

Сёння насельніцтва Зямлі знаходзіцца на стадыі самага імклівага яго росту за ўсю гісторыю. Штогод яно павялічваецца прыкладна на 78 млн чалавек — гэта адпавядае насельніцтву Канады, Аўстраліі, Грэцыі і Партугаліі разам узятых. Спатрэбілася 250 000 гадоў, каб колькасць людзей на планеце дасягнула 1 мільярда ў 1804 годзе. Крыху больш як за стагоддзе была пераадолена мяжа ў 2 млрд. Усяго 32 гады спатрэбілася для дасягнення адзнакі ў 3 млрд. А вось межы ад 5 да 6 млрд і ад 6 да 7 млрд свет пачаў пераходзіць за 12 гадоў. Аднак, паводле прагнозаў ААН, ужо ў 2050 годзе на Зямлі будзе пражываць 9,3 млрд людзей.

«Мы ўвайшлі ў свет сямі мільярдаў: з сямю мільярдамі надзей і магчымасцяў, — сказаў журналістам Антоніус Брук. — Давайце ў гэты дзень пацвердзім наша імкненне зрабіць свет лепшым. Давайце бачыць за лічбамі канкрэтных людзей і інвеставаць у іх, уключаючы тых дзетак, якія нарадзіліся сёння». Унікальны момант у чалавечай гісторыі, несумненна, уяўляе сабой адначасова дасягненне і выклік. З аднаго боку, чалавецтву неабходна рашаць праблемы, якія ніколі яшчэ не існавалі, а з другога — адкрываюцца ўнікальныя магчымасці. Сёння ў свеце людзі ва ўзросце да 25 гадоў складаюць 43 працэнты насельніцтва. Ад кожнай краіны і кожнага ўрада паасобку залежыць, наколькі прадукцыйна будзе выкарыстоўвацца гэты рэсурс. У 1950 годзе на кожнага чалавека, старэйшага за 65 гадоў, ва ўсім свеце прыпадала 12 чалавек працаздольнага ўзросту. Зараз гэты паказчык роўны 7, а да 2050 года ён, верагодна, будзе складаць усяго 3.

У Беларусі, колькасць насельніцтва якой складае крыху больш за адну тысячную долі ад колькасці насельніцтва зямнога шара, як у люстэрку адбіваюцца ўсе асноўныя агульнаеўрапейскія дэмаграфічныя тэндэнцыі і праблемы, уключаючы зніжэнне ўзроўню нараджальнасці, паскарэнне працэсу старэння насельніцтва, павелічэнне міграцыйных патокаў. «Відавочна, што дэмаграфічныя выклікі патрабуюць працягу паслядоўнай комплексная палітыкі па змякчэнні негатыўных дэмаграфічных тэндэнцый, стабілізацыі колькасці насельніцтва», — адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар Старавойтаў.

Святлана БАРЫСЕНКА. Фота БЕЛТА.

Міхаіл КАВАЛЁЎ:

Погляд эксперта «Звязды»

«Апусціць курс да шасці тысяч насамрэч рэальна»

Пра курс беларускага рубля, інфляцыю і дэвальвацыю карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з прафесарам Міхаілам Кавалёвым, дэканам эканамічнага факультэта БДУ.

— Больш за тыдзень таму мы выйшлі на адзіны курс беларускага рубля. Як вы ацэньваеце гэты крок урада?

— Крок абсалютна правільны. Думаю, што яго можна было зрабіць і раней. Галоўнае зараз, каб не атрымалася так, як было першыя тры месяцы года, калі, з аднаго боку, спрабавалі ўтрымаць курс, а з другога, друкавалі новыя грошы. Мы павінны выразна і ясна разумець, што калі мы друкуем новыя грошы, яны ў рэшце рэшт праз два ці дваццаць дзён, ці два месяцы будуць прад'яўлены на валютную біржу для канвертацыі ў валюту. Таму курс можа ўтрымаць, нават наадварот — вярнуць яго да старога курсу ў пяць тысяч, толькі адно: жорсткая крэдытна-грашовая палітыка. Я лічу, што мяккай яна становіцца ў сілу не столькі эканамічнай неабходнасці, колькі эканамічных інтарэсаў асобных структур, людзей. Што тут хаваць: інтарэсы і стымулы многіх знаходзяцца ў фірмах, якія звязаны з імпартам. Сапраўды, сектар, звязаны з імпартам, развіваўся ў нашай краіне вельмі дынамічна. Туды пайшлі лепшыя людзі, каб атрымліваць большы заробак. І гэтым фірмам, натуральна, пастаянна патрабуецца «падсілкоўванне» беларускімі рублямі. Ім не важна, што пры гэтым закупляецца: імпартаёмістыя спажывецкія тавары, сучасныя даільныя сістэмы, сучаснае еўрааздабленне для пабудоў... Справа тут не толькі ў тым, што гэта так ужо патрэбна нам усім, а яшчэ і ў тым, што шмат у каго ёсць эканамічныя інтарэсы. І пакуль мы іх не пераломім, сітуацыю змяніць будзе цяжка.

Тыя ж самыя банкі. **Ва ўсім свеце банкі крэдытуюць экспарт. У нашай краіне за апошнія тры гады (з маўклівай згоды Нацыянальнага банка) банкі навучыліся крэдытаваць толькі імпарт: крэдытуючы альбо насельніцтва, альбо тыя фірмы, якія купляюць імпартныя тавары. Вось новае кіраўніцтва Нацыянальнага банка павінна абвясціць галоўным лозунгам у краіне, на мой погляд, паварот усёй грашова-крэдытнай палітыкі ад імпарту да экспарту.** Гэта будзе дастаткова балюча: страта пэўных працоўных месцаў, страта інтарэсаў многіх тых, хто прызвычаіўся дапамагаць накіроўваць частку бюджэту на куплю чагосьці імпартнага ў роднасныя фірмы. Але гэтым трэба «перахварэць». Трэба ўсім зразумець, што будучыня краіны, даходы ўсіх у краіне звязаны толькі з адным — з экспартам нашай прадукцыі. Патрэбна развярнуць банкаўскую сістэму да крэдытавання не імпарту, а пакупнікоў нашай прадукцыі за мяжой. Асабліва гэта тычыцца расійскіх банкаў — іх заснавальнікі павінны дапамагчы ім (такі прыклад ужо дала пара «БПС-Банк» і Ашчадбанк Расіі). Толькі ў гэтым выпадку курс у нас стабілізуецца і мы, як і кітайцы, наадварот не будзем ведаць, куды падзець валюту. І па вялікім рахунку — няхай на мяне не крыўдуюць банкі за тое, што я кажу — гэта інтарэсы доўгатэрміновыя, інтарэсы не толькі краіны, але і банкаў. Калі яны засвояць крэдытаванне замежных пакупнікоў беларускай прадукцыі (не абавязкова самі — сумесна са сваімі партнёрамі за мяжой; так, як гэта робяць турэцкія, нямецкія, кітайскія банкі — любыя банкі, любой краіны), тады ў нас будзе ўсё нармальна з валютай, тады ў нас будзе стабільны курс. Калі ўважліва паглядзець, **многія кажуць, што нас у цяперашнюю сітуацыю прывялі пяцьсот долараў зарплаты напрыканцы мінулага года. Я, як вучоны, які ўмее лічыць, магу сказаць, што гэта не было галоўным.** Доля зароблена платы ў валавым унутраным прадукце нашай краіны і на канец мінулага года займала дастаткова ўмераны кавалак. Эканоміка гэта вытрымала. **Нас «зрубіла» тое, што ўсе грошы, якія насельніцтва прынесла ў банкі (больш за 27 трыльёнаў беларускіх рублёў), былі аддадзены насельніцтву ж на куплю імпартных спажывецкіх тавараў, а не айчынных.** У нас было прынята рашэнне аб стымуляванні куплі айчынных тавараў. Яно засталося, скажам так, дзесьці ў завуголлі. І аб ім мала ўспаміналі. А падобныя захады, напрыклад, вывелі Кітай з крызісу. **У кітайцаў было вельмі проста: ты прывёз і здаў стары халадзільнік — табе далі беспрацэнтны крэдыт на куплю новага, але свайго, нацыянальнага. Гэта ж рабілі і немцы. Мы ж гэта не пакінулі ў баку, думаючы, што ўсё і так пройдзе. Гэта значыць сёння мы расплачваемся за тое, што наш цэнтральны банк своечасова не ўмяшаўся ва ўсе гэтыя працэсы, не прытармазіў. Ён мог увесці нарматыў спажывецкага крэдытавання. Аднак ён не толькі не зрабіў гэтага, але і працягвае эмісію.** Калі мы паглядзім на эмісійныя працэсы, то самыя вялікія яны былі якраз не напрыканцы мінулага года, а ў першыя тры месяцы гэтага, калі ўжо насоўваўся крызіс, праблемы з валютай. А Нацыянальны банк працягваў «друкаваць» грошы. **Ён толькі ў асабіста свае калгасы «закачаў» каля 1,5 трыльёна беларускіх рублёў. Але зразумела, што ім былі патрэбны не рублі, а валюта на куплю замежнага даільнага абсталявання.**

СТАР. 2

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества	Лот № 1. Капитальное строение (здание магазина) с инвентарным номером 212/С-1048 общей площадью 354,4 м. кв.
Собственник (владелец) имущества	Индивидуальный предприниматель Кириллов Михаил Терентьевич
Местонахождение (адрес) имущества	г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 68
Стоимость имущества	Лот № 1 — 401 280 000 белорусских рублей (с учетом НДС)
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 68, 22 ноября 2011 года в 11.00
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области, 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс. (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00
Условия и порядок проведения торгов	**Лицо, желающее принять участие в торгах, до начало торгов обязано:** **1.** Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. **2.** Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 11 ч. 00 мин. 22.11.2011 г. Минимальная величина первого шага — 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

1, аўторак,	20.00 — 21.00	**18, пятніца,**	18.00 — 21.30
4, пятніца,	2.30 — 6.30	**20, нядзеля,**	21.30 — 24.00
5, субота,	7.30 — 22.00	**21, панядзелак,**	0.00 — 1.30
6, нядзеля,	2.00 — 17.30	**23, серада,**	0.00 — 2.00
9, серада,	4.30 — 6.30	**25, пятніца,**	0.30 — 2.30
11, пятніца,	15.30 — 19.00	**27, нядзеля,**	1.00 — 3.00
14, панядзелак,	2.30 — 6.00	**29, аўторак,**	1.30 — 6.00
16, серада,	4.30 — 15.30		

Напярэдадні Дзядоў

ЗАМУРОЎШЧЫЦА ВАЛЯНЦІНА

Умінчанкі Валянціны Галабурды адна з тых самых прац, пра якія людзі ўзгадваюць толькі ў асаблівыя — самыя сумныя хвіліны жыцця. І гэта зразумела. Але без гэтай працы, тым не менш, ужо немагчыма ўявіць жыццё нашай сталіцы, як і наогул сучаснае жыццё.

Валянціна працуе ў калумбарыі крэматорыя. І ўжо толькі таму пасада замуроўшчыцы — асаблівая, незвычайная і ў нечым унікальная. Унікальнасць, магчыма, якраз не ў тым, што не кожны змог бы працаваць у такім сумным месцы. Бо журба журбой. А ўмець дзяліць з людзьмі іх гора, спачуваць, зрабіць апошняе развітанне напоўненым асаблівым пачуццем — гэта сапраўды не кожнаму дадзена. Без стану душы і яе чысціні тут ужо ніяк не абысціся. Валянціна Іосіфаўна Галабурда робіць гэта кожны дзень больш за чвэрць стагоддзя. Яна, калі быць гістарычна дакладным — першы спецыяліст у краіне па гэтай частцы. Як сведчыць жыццё, апынулася тут зусім не выпадкова. Атрымалася, што сама для сябе гэтае месца працы і стварыла.

— Будаўніцтва крэматорыя пачалося ў 1980 годзе, генпадрадчыкам узвядзення гэтага спецыфічнага аб'екта быў сталічны будтрэст № 4, — прыгадвае Валянціна Іосіфаўна. — Я працавала тады ў брыгадзе маляроўатынкоўшчыкаў. У 1986 годзе крэматорый быў адчынены і пачаліся першыя запаўненні ніш калумбарыя скрыначкамі з прахам. Патрэбен быў замуроўшчык. Прапанавалі мне. Людзям трэба было ўжо аказваць паслугі, я не змагла адвярнуцца ад чужой бяды. Праца насамрэч нескладаная — усяго толькі ўмураваць як след мармуровую плітачку. Але людзі, на вачах якіх ты робіш гэтую працу, павінны адчуваць, што ты неабыякавы да іх гора. І яшчэ. Як ніколі раней адчула тады, з якой пашанай іншыя могуць ставіцца да самай, здаецца, простай працоўнай прафесіі — тынкоўшчыка. Гэта мяне таксама кранула. Так і засталася працаваць далей.

Спачатку хацеў працікавіцца, колькі жалобных шыльдачак умуравана ўжо яе рукамі. Але хіба гэта тая статыстыка, якой трэба хвалісца ці ўражваць? Гледзячы на сцены калумбарыя з безліччу жалобных акенцаў, уявіў гэтую невысокую хударлявую жанчыну спачатку з урнай у руках, а потым і з кельмай, і падумаў: як добра, што ёсць усё ж у гэтым свеце людзі, якім наша бяда ніколі не стане чужой.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ ПАДАРАЖЭЕ

Адзін з найбуйнейшых беларускіх аператараў сотавай сувязі, ЗП «Велком» абвясціў пра павышэнне кошту паслуг сувязі на 15% з 30 лістапада гэтага года. «Тарыфы на выклікі і дадатковыя паслугі будуць акруглены да аднаго рубля адпаведна з правіламі арыфметычнага акруглення, тарыфы на разавыя ўнёскі і спецыяльныя паслугі — да 50 рублёў», — паведамляецца на афіцыйным сайце аператара.

Не зменяцца толькі выплаты па ўжо заключаных дамовах за абсталяванне, набытае ў растэрміноўку. Новыя ж тарыфы будуць апублікаваны 30 лістапада 2011 года. Яны таксама будуць даступныя па тэлефонах інфармацыйна-даведачнай службы.

Што да іншых аператараў мабільнай сувязі, то ТАА СП «БелСел» змяняла тарыфы ўжо ў сярэдзіне кастрычніка, а з 1 лістапада павялічыла кошт міжнародных званкоў. Цяпер званкі ў Расію, ва Украіну, Малдову, Казахстан каштуюць 1440 рублёў за хвіліну, у краіны Еўропы і Балтыі — 2100 рублёў, ва ўсе астатнія краіны — 3900 рублёў. ЗАТ «БеСТ» (гандлёвая марка life:)) з 1 лістапада павялічыла кошт паслуг інфармацыйна-забаўляльных сервісаў. СТАА МТС наконт змены тарыфаў пакуль што захоўвае маўчанне, затое нагадвае абанентам, што з 1 лістапада змяніўся парадак аплаты паслуг сувязі: цяпер пры аплаце трэба ўказваць не 7-значны, а 9-значны нумар тэлефона — з кодам аператара.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ЗАТРЫМАЛІ НАРКАДЗЯЛКА. І НЕ АДНАГО

У гарадку Мікашэвічы Лунінецкага раёна жыў сабе хлопец. Прыгожа жыў. У свае 23 гады меў дзве іншаматкі, здымаў кватэру, купляў дарагое адзенне, не адмаўляў сабе ні ў якіх забавах. Пры гэтым Васіль нідзе не працаваў. Сваім даходам ён даўно зрабіў гандаль наркатычнымі рэчывамі. Заўсёды меў пры сабе даволі шырокі асартымент атруты: марыхуана, амфетамін, опій.

Збываў свой тавар наркагандляр каля кавярні, дзе збіралася моладзь. Тут яго і затрымалі пры спробе прадаць чарговую дозу наркотыка. Малады чалавек змешчаны ў ізалятар, на яго аўтамабілі накладзены арышт. Самому распаўсюджвальніку пагражае да 13 гадоў пазбаўлення волі. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў, у выніку праведзеных аператыўна-вышукоўых мерапрыемстваў у Мікашэвічах заведзена 7 крымінальных спраў па фактах распаўсюджвання наркотыкаў. Гэты горад вядомы на Брэстчыне як адзін з ачагоў распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі. Як вядома, гэтая небяспечная зараза спадарожнічае асяродку наркаманаў.

Яна СВЕТАВА.

ЖАНОЧАЯ ВОПРАТКА НА 200 МІЛЬЁНАЎ

Паблізу вёскі Перавалачная Талачынскага раёна супрацоўнікі аддзела ДАІ затрымалі грузавую аўтамашыну «Мерседэс» пад кіраваннем жыхара Брэста, які перавозіў без адпаведных дакументаў жаночую вопратку на агульную суму 200 мільёнаў рублёў. Тавар канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

УСЁ, ШТО ДЛЯ БЫТУ — НА ВЫСТАВЕ «ЗДАБЫТА»

На працягу пяці дзён запар — з 31 кастрычніка па 4 лістапада — у сталічным выставачным комплексе «Белэкспа» па вуліцы Янкі Купалы, 27 наведнікаў вітае XV міжнародная спецыялізаваная аптовая выстава-кірмаш «Культбытгасптавары-2012».

СТАР. 2

Фота Марыны БЕЛУНКОВАЙ.

МАЗ пачне выпускаць школьныя аўтобусы

Мінскі аўтамабільны завод прэзентаваў журналістам шэраг сваіх навінак 2011 года, сярод якіх школьны аўтобус МАЗ 241, бартавыя аўтамабілі і два самазвалы.

— Заказы на школьныя аўтобусы ў нас былі і раней, але тады існавалі іншыя, больш прыярытэтныя напрамкі, і таму займацца распрацоўкай менавіта гэтага віду транспарту мы не былі гатовыя, — расказвае **Васіль ВЛАДЫЦКІ, намеснік галоўнага канструктара аўтобуснага падраздзялення МАЗа**. — А зараз Міністэрства прамысловасці паставіла перад намі сур'ёзную задачу — стварыць школьны аўтобус.

Доследны ўзор школьнага аўтобуса праходзіць выпрабаванні, якія павінны завяршыцца ў лістападзе. А ўжо з пачатку 2012 года, як мяркуе Васіль Міхайлавіч, аўтобус пачне выпускацца серыйна.

Але паколькі ў школьным аўтобусе перавозяцца дзеці, ён мае некаторыя адрозненні ад звычайных маделяў. У прыватнасці, ён можа быць толькі жоўтага колеру, а на бакавінах абавязковыя надпісы «Школьны» (у варыянце, распрацаваным для расійскага рынку, надпісы павінны быць не «Школьны», а «Дзеці»).

СТАР. 6

Фота БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Управляющий по делу о банкротстве ИП «Фадиат» Монтик Д.Н. – организатор торгов СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже транспортных средств ИП «Фадиат»:

№ лота	Наименование лота	Количество	Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС)	Шаг торгов, бел. руб. (5% от начальной цены)	Задаток, бел. руб. (5% от начальной цены)
1	**Грузовой автомобиль SCANIA R 113M, рег. номер АВ 5275-4, 1995 г.в.**	1	124958664	6247933	6247933
2	**Грузовой прицеп «FLOOR», рег. номер А 4278 А-4, 1988 г.в.**	1	14410296	720515	720515

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

Торги состоятся 15 ноября 2011 года в 15.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ИП «Фадиат», р/с 3012000000057 в филиале № 6 ОАО «Белгазпромбанк» г. Гродно, код 194, УНП 500059754.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенной копии свидетельства о государственной регистрации; для физического лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 15.00 14.11.2011 по адресу: 230001, г. Гродно, а/я 27 или по факсу: 8(0152)526859. Задаток должен поступить на указанный счет не позднее 15.00 14.11.2011.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)6309211, тел./факс 8(0152)526859.

КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ НБ РБ з 1.11.2011 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	8 450,00	1 чэшская крона	479,90
▼1 еўра	11 850,00	1 польскі злоты	2 731,05
1 латвійскі лат	16 827,64	▼1 расійскі рубель	281,00
1 літоўскі літ	3 431,96	1 украінская грыўня	1 055,59

КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ ДЛЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ Цэнтрабанк РФ

USD	30,1245
10 UAH	37,6321
10000 BYR	35,4406
EUR	42,1833

Агенства «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ФІНАНСАВАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ НАРМАЛІЗУЕЦЦА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што фінансавая сітуацыя ў Беларусі нармалізуецца. Аб гэтым ён заявіў 29 кастрычніка, выступаючы ў Таджыкскім тэхнічным універсітэце імя акадэміка М.С. Асімі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы, які знаходзіўся з афіцыйным візітам у Таджыкістане, 29 кастрычніка наведаў парламент Таджыкістана, дзе адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй ніжняй палаты Шукурджонам Зухуравым.

Затым Прэзідэнт выступіў перад студэнтамі і выкладчыкамі Таджыкскага тэхнічнага ўніверсітэта імя акадэміка М.С. Асімі. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што цяпер усё больш відавочна праглядаецца тэндэнцыя падштурхоўвання свету да пагражальнага хаосу. «Мы ўсё часцей становімся сведкамі бяспраўнага ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, кіраўніцтва якіх па тых ці іншых прычынах непажаданае ўладным асобам. Думаю, што вы добра разумееце, пра каго я гавару». «Яны не спыняюцца ні перад чым, каб дабіцца сваіх мэт. Калі ім гэта патрэбна, у ход ідзе шантаж. Калі і гэтага мала — будуць бамбіць і забіваць». Беларусь імкнецца наладжваць узаемавыгадныя кантакты з рознымі дзяржавамі і рэгіёнамі свету, аднак узнікаюць пэўныя цяжкасці, якія ў асноўным датычацца адносін з Еўрасаюзам і ЗША. «Адкрыта скажу, ускладненні тут узнікаюць не па нашай віне. Мы шчыра імкнёмся да наладжвання добрасуседства і канструктыўнага ўзаемадзеяння».

Пры гэтым ён сказаў, што Еўрасаюз для Беларусі з'яўляецца важнейшым гандлёвым партнёрам, буйным інвестарам. Тавараабарот Беларусі з краінамі ЕС на 5 працэнтаў перавышае тавараабарот з галоўным палітычным і эканамічным партнёрам — Расіяй. «Але вы ведаеце, як паводзіць сябе Еўрасаюз: нейкая дэмакратызацыя, чытай — хаос і развал. Але ні вам, ні нам такая дэмакратызацыя не патрэбна. Мы павінны працаваць у сваіх інтарэсах, інтарэсах свайго народа».

У пацвярджэнне важнасці гандлёва-эканамічнага партнёрства паміж Беларуссю і Еўрасаюзам Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь забяспечвае бесперабойны транзіт тавараў і энергарэсурсаў у ЕС, ахову граніц, спыняе нелегальную міграцыю. «Таму цікавасць да дыялогу і выбудоўвання нармальных адносін павінна аб'ектыўна прысутнічаць з абодвух бакоў. Пры гэтым мы не стаім з працягнутай рукой, выпрошваючы супрацоўніцтва, — мы яго прапануем».

Прэзідэнт заклікае Еўрасаюз і ЗША адмовіцца ад стэрэатыпаў у адносінах з Беларуссю і расчысціць шлях для поўнафарматнага ўзаемадзеяння. «Двайныя стандарты, якія прымяняюцца еўрапейцамі, спробы націску і санкцыі не стануць канструктыўным элементам палітыкі. Улэўнены, даўно прыйшла пара адмовіцца ад гэтых штучных бар'ераў, замшэлых стэрэатыпаў і расчысціць шлях для поўнафарматнага ўзаемадзеяння, якое адпавядае спадзяванням нашых народаў». Гэта датычыцца і адносін з ЗША. «Не мы былі ініцыятарамі цяперашніх цяжкасцяў у нашым дыялогу. Наадварот, Беларусь заўсёды была адказным партнёрам Злучаных Штатаў у барацьбе з тэрарызмам, наркатрафікам, адмываннем грошай і гандлем людзьмі». Беларусь таксама аказвае пэўнае садзейнічанне Вашынгтону ў вырашэнні афганскай праблемы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што шматвектарнасць з'яўляецца фундаментальным прынцыпам знешняй палітыкі Беларусі. «Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з любой дзяржавай або міжнароднай арганізацыяй. Умова ў нас простая — захаванне прынцыпаў роўнасці і неўмяшання ва ўнутраныя справы». «Беларусь з цікавасцю прыглядаецца да работы Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, мы зацікаўлены ва ўзаемадзеянні з Арганізацыяй Ісламскага супрацоўніцтва, у якой Таджыкістан з'яўляецца паўнапраўным членам».

Усё часцей робіцца заява аб набліжэнні новага крызісу, наступствы якога будуць сумныя для эканомік розных краін. «Наш адказ на гэты выклік мы бачым у кансалідацыі намаганняў, у энергічным развіцці інтэграцыі на постсавецкай прасторы. У цяперашнім свеце без падтрымкі надзейных саюзнікаў і партнёраў наперад рухацца немагчыма. Таму Беларусь заўсёды была ініцыятарам і актыўным удзельнікам інтэграцыйных працэсаў, асабліва ў Еўра-Азіяцкім рэгіёне». Менавіта ў гэтым рэгіёне размешчаны галоўны палітычны і эканамічны партнёр Беларусі — Расія. На думку кіраўніка дзяржавы, брацкія адносіны паміж беларусамі і расіянамі далі магчымасць значна рушыць наперад у інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнт закрануў таксама ўнутраную сітуацыю ў Беларусі і складанасці, што ўзніклі ў яе валютна-фінансавай сферы. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэтыя цяжкасці на 90 працэнтаў былі справажаваны звонку. Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў, што ад негатыўнага ўплыву беларуская адкрытая эканоміка поўнасцю застрахавацца не можа. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што за апошнія гады істотна павялічылася цана для Беларусі на пастаўляемыя з Расіі энергарэсурсы. «З-за АЭП, да якой мы імкнуліся, мы таксама шмат заплацілі», — адзначыў Прэзідэнт, маючы на ўвазе ажыятаж з увозам патрыманых аўтамабіляў з-за павышэння мытных пошлін. «І мы спынілі ўсім і ўся раздаваць валюту, свабодна ёю гандляваць, што прывяло да фарміравання некалькіх курсаў на валюту». «Дзякуй богу, мы гэты курс ужо звялі. Мы выбудоўваем нармальную фінансавую сітуацыю. Для гэтага нам было дастаткова двух-трох месяцаў. Думаю, што гэта не праблема. Гэта пытанне, якое нас многаму навучыла», — лічыць Прэзідэнт. Пры гэтым ён адзначыў, што самае галоўнае — гэта тое, што ў краіне захоўваецца рост эканомікі, практычна адсутнічае беспрацоўе, рэалізуюцца сацыяльныя гарантыі дзяржавы.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, з сур'ёзнымі фінансавымі цяжкасцямі цяпер сутыкаюцца многія краіны, фінансавыя сістэмы шэрагу краін і цэлых рэгіёнаў блізкія да калапсу. «Возьмем, напрыклад, Еўропу, якая заўсёды была для нас узорам дабрабыту і ўстойлівасці. Сёння Грэцыя знаходзіцца на грані дэфолту. Да гэтай мяжы набліжаюцца Іспанія, Партугалія, Італія, Ірландыя, іншыя дзяржавы. Увесь Еўрапейскі саюз адчайна спрабуе выратаваць еўро». «Атрымліваецца, глабальны фінансава-эканамічны крызіс, які ўзнік у свой час у Злучаных Штатах, іх нічому не навучыў. І яны, як кажуць, зноў наступаюць на тыя ж граблі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Таджыкістан 29 кастрычніка завяршыўся.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Апусціць курс да 6 тысяч...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак у апошні час усе галіны ўлады заявілі цвёрда, што эмісія будзе спынена. Статыстыка амаль пацвярджае гэта. Ну, а калі рублёў будзе мала, то яны будуць цаніцца нават больш, чым долар. Але трэба разумець, што гэта вельмі балючы працэс. У першую чаргу, не вытрываюць неэфектыўныя імпартаёмістыя прадпрыемствы. Яны могуць быць нават горадаўтваральнымі. Аднак мы ўсе ўжо зразумелі, галоўнае — гэта стабільны рубель. Быў бы ён стабільны, мы б і зараз атрымлівалі зарплату ў 500 долараў. І я яшчэ раз падкрэслю, што гэты заробак не быў празмерным для нашай краіны. **Дэвальвацыя была выклікана нястрымным спажывецкім крэдытаваннем, з аднаго боку, настроем усёй эканомікі на закупку імпарту — з другога.**

Галоўнае, каб мы зараз не захапіліся так званым квазі-імпартам, калі мы змешваем дзве субстанцыі і атрымліваем медпрэпарат у паўтара раза даражэйшы за гатовы імпартны. Таму імпартазамяшчэнне павінна быць толькі там, дзе яно эфектыўна. Інакш гэта проста завуаляваная спроба купіць імпарт пад падставай быццам бы рэалізацыі праграмы імпартазамяшчэння. Калі ў нас будзе жорсткае патрабаванне, каб у нас было ўсё эканамічна эфектыўна, то тады высветліцца, што патрэбна шукаць вытворцу ўнутры краіны. Больш за тое, у нас цяпер з'явілася больш магчымасцяў у межах Мытнага саюза.

Я ўпэўнены, што калі Нацыянальны банк да канца года пратрымаецца, не будзе займацца эмісійным крэдытаваннем, то курс стабілізуецца, а магчыма нават адкоціцца яшчэ назад. Таму што нават восем тысяч за долар — сёння празмерна.

— Нацбанк прагназуе ў пачатку наступнага года курс у 7-8 тысяч. Наколькі гэта рэальна?

— Гэта ўсё залежыць толькі ад аднаго: ад умення Нацбанка лічыць, што кожны новы трыльён рублёў, які выпушчаны ў абарачэнне, паніжае курс нацыянальнай валюты яшчэ дзесьці мінімум на паўтысячы беларускіх рублёў. Калі ён сцісне грашовую масу, тады штосьці атрымаецца (нядаўна прыняты ўказ Прэзідэнта (ад 21 кастрычніка 2011 года №477 «Аб унясенні дапаўнення і змянення ва ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 2001 года №320». — **Аўт.**), які забараняе камерцыйную дзейнасць Нацбанку, дае на гэта надзею). Прыклад Еўропы нам паказвае, што бывае тады, калі дзяржава залазіць у вялікія даўгі.

— Вы казалі пра курс у пяць тысяч. Ён таксама рэальны?

— Перакананы, што калі б у перыяд безуладдзя ў Нацбанку не было нястрымнай эмісіі, то курс у пяць тысяч быў бы ўтрыманы. Зараз да яго ўжо немагчыма вярнуцца. Але калі мы будзем займацца больш экспартам, калі Нацбанк будзе трымаць грашовую масу, то прынамсі да шасці тысяч насамрэч рэальна апусціць курс. Да таго ж я не выключаю, што з мэтай стабілізацыі курсу на больш нізкім узроўні можна было б прадаць не паўтоны, як гэта зрабіў Нацбанк, а дзесьці тон пяць золата. Справа ў тым, што ў нас даволі вялікія золатавалютныя рэзервы. Значная частка іх зафіксавана ў золаце (31 тона). І дзеля больш хуткага выхаду з крызісу мне як эканамісту здаецца, што можна было б зрабіць так, як калісьці зрабілі ЗША, калі адмянілі залаты стандарт і фактычна адмовіліся забяспечваць золатам свой долар. Мы маглі б пайсці няхай не на продаж, але хоць бы на заклад.

Аднак яшчэ больш важна не дапусціць росту цэнаў. Калі цэны вырастуць адэкватна пройдзенай дэвальвацыі, то ўжо будзе бессэнсоўна ўтрымліваць курс. Мы шмат казалі аб антымanапольным рэгуляванні, аб стварэнні, можа быць, аналагу расійскай ФАС (Федэральная антымanапольная служба. — **Аўт.**), якая займалася б больш жорстка стварэннем канкурэнтнага асяроддзя і рынкавым рэгуляваннем цэн. Пакуль гэты накірунак у нас знаходзіцца ў поўным «пралёце».

— А як вы пракаментуеце «кіраванае плаванне» курсу нацыянальнай валюты?

— Нацыянальны банк сёння абяцае, што курс будзе ўсталёўвацца выключна на аснове попыту і прапановы. Тое самае і большасць краін заяўляе. На мой погляд, гэта ўвогуле макраэканамічна правільна, але ў барацьбе са спекулянтамі мне здаецца празмерная празрыстасць тут не патрэбна. Нават у самых развітых краінах свету аб памерах попыту і прапановы, памерах інтэрвенцый становіцца вядома толькі са значным спазненнем. І я не думаю, што Нацбанк робіць правільна, калі аператыўна паведамляе гэту інфармацыю. Гэта фарміруе панічныя настроі. Таму часам выгадней трошкі вытрымаць паўзу. **А яшчэ экспарцёрам трэба ясна разумець, што калі яны не будуць спяшацца прадаць валюту, то Нацыянальны банк можа ў любую хвіліну ўвесці стапрацэнтны продаж валютнай выручкі. Тады курс будзе ў шмат разоў лягчэй утрымліваць.**

— Зараз кажуць, што самае галоўнае — барацьба з інфляцыяй. Ці ёсць зараз рычагі ціску на інфляцыю ва ўрада?

— Як я ўжо казаў, даўно трэба зрабіць магутны дзяржаўны орган антымanапольнага рэгулявання. Калі Міністэрства эканомікі гэтага не робіць, гэтыя функцыі можна перадаць камітэту дзяржкантроля. Але галоўнае, каб ён гэта рабіў не адміністрацыйнымі метадамі, а так як гэта прынята ў большасці развітых краін. Каб не было такога, як пры Багданкевічу (старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі з 1991 па 1995 гады. — **Аўт.**) у 1994 годзе — інфляцыйна-дэвальвацыйныя гонкі. Таму што інфляцыя можа апярэдзіць дэвальвацыю. Тады спатрэбіцца яшчэ адна дэвальвацыя і гэтак далей. Цэны павінны прынамсі быць нашмат меншымі ў Беларусі. **Калі дэвальвацыя ў нас адбылася амаль ужо ў два разы, то цэны павінны вырасці не болей чым у паўтара раза. І калі дзесьці, у кагосьці яны вырастаюць больш, значыць сюды павінны прыходзіць антымanапольныя органы і цікавіцца, чаму гэта адбылося. З самымі жорсткімі пакараннямі.**

— Наколькі верагодна спрагназаваная на наступны год толькі 20-працэнтная інфляцыя?

— Прагноз рэальны ў тым выпадку, калі ў канцы года атрымаецца абысціся без значнай эмісіі. Не будзе эмісіі — не будзе і інфляцыі. Рэшткавай інфляцыі практычна не будзе, таму што ўжо ва ўсім, за выключэннем паліва і медыцынскіх прэпаратаў, яна ўвайшла ў цану. Многія з запасам закладвалі нават 10 тысяч. **А бензін (думаю, усе добра разумеюць) рана ці позна павінен будзе каштаваць у нашай краіне прынамсі не менш, чым у Расіі — а значыць, прыкладна на ўзроўні аднаго долара.**

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ УМАЦАВАЎСЯ

Учора на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар патаннеў на 50 рублёў, еўра — на 190, а расійскі рубель на 3.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 31 КАСТРЫЧНІКА

«Белінвестбанк»: долар ЗША — 8300 і 8600; еўра — 11500 і 12100; расійскі рубель — 270 і 285.

«Абсалютбанк»: долар ЗША — 8400 і 8540; еўра — 11700 і 11950; расійскі рубель — 272 і 282.

«Парытэтбанк»: долар ЗША — 8430 і 8750; еўра — 11830 і 12150; расійскі рубель — 275 і 295.

НЕАБХОДНАСЦІ Ў ПАВЫШЭННІ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ Ў БЕЛАРУСІ ПАКУЛЬ НЯМА,

заявіла ў эфіры праграмы «Карціна свету» на тэлеканале «РТР-Беларусь» міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна.

«Пакуль такой неабходнасці няма, — падкрэсліла міністр. — Аднак гэта не азначае, што мы не разглядаем варыянт павышэння пенсійнага ўзросту». Марыяна Шчоткіна перакананая ў тым, што разгляд гэтага пытання павінен быць комплексным і шырока абмяркоўвацца. «Працэс павінен быць эвалюцыйным, і гэта не будзе тайнай — прыйшоў, узяў газету і ўбачыў, што пенсійны ўзрост павышаны, — лічыць яна. — Усё гэта трэба абмяркоўваць, бо думкі па гэтым пытанні розныя».

Кіраўнік Мінпрацы і сацабароны нагадала, што ў лістападзе пенсіі ў Беларусі павысяцца ў сярэднім на 22%. «І надалей будзе павышэнне пенсій, яно пералічваецца, грошы ў нас для гэтага ёсць, у фондзе сацыяльнай абароны», — расказала міністр.

Марыяна Шчоткіна таксама звярнула ўвагу на прывілеі Указа № 181, якім нададзены рэкамендацыйны характар прымяненню Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці і дадзены правы наймальнікам самастойна вызначаць парадак і ўмовы павышэння тарыфных ставак (акладаў) работнікаў, а таксама ўстанаўленне выплат стымулюючага характару ў залежнасці ад эфектыўнасці гаспадарання і ў межах існуючых фінансавых магчымасцяў. Міністр адзначыла, што дакумент даў прыватнаму сектару, бізнэсу свабоду ў аплаце працы. Такая аплата будзе залежаць ад эфектыўнасці працы работнікаў. «Рэкамендацыйны характар тарыфнай сеткі, гібкія сістэмы аплаты працы — можна плаціць паводле свайго меркавання, у залежнасці ад эфектыўнасці працы, ад вынікаў працы работнікаў, — падкрэсліла яна. — Сёння дзяржава абсалютна не рэгулюе гэтыя працэсы».

Кар. БЕЛТА.

Абзац

◢ Каля 60 тыс. беларусаў звярнуліся 30 кастрычніка ў службу дакладнага часу, набраўшы тэлефонны нумар 188 — утрая больш, чым звычайна. Больш за тое, у панядзелак да 11 гадзін пазванілі яшчэ 20 тыс. чалавек. Гэта звязана з тым, што сёлета Беларусь услед за Расіяй адмяніла пераход на сезонны час, і, як аказалася, многія дакладна не ведалі, па якім часе будзем жыць.

◢ Рознічны кошт беларускай грэчкі новага ўраджаю не перавысіць Br16 тыс. за кілаграм, паведаміла БЕЛТА нам. дырэктара Дэпартамента па хлебапрадуктах Мінсельгасхарчу Алена Пракопчык. Па яе словах, у крамах яшчэ прадаецца грэчка мінулагодняга ўраджаю, і цэны на яе вагаюцца ад Br19 тыс. да Br25 тыс. за кілаграм. Аднак зараз актыўна ідуць новыя пастаўкі, таму мяркуецца, што цэны на грэцкія крупы знізяцца.

Поўны абзац



◢ Жыхар японскай вёскі Афуната зможа стаць гаспадаром 11 мільёнаў ен (больш за 145 тысяч долараў): у яго рыбацкія сеткі трапіў мех з грашыма. Як звычайна, ён раскінуў сеткі ў прыбярэжных водах Ціхага акіяна. Тым жа вечарам рыбак вярнуўся па ўлоў і знайшоў у сетках вялікі мех, дзе было 1100 купюр наміналам у 10 тыс. ен. Згодна з законамі краіны, калі ўладальнік рэчаў, што знікліі, не заявіць аб прапажы на працягу 6 месяцаў, знаходка будзе аддадзена таму, хто яе знайшоў.

◢ Украінцы зрабілі самы вялікі ў свеце (а мабыць, і адзіны) футбольны мяч з сала. Нацыянальны шэдэўр кулінарнага мастацтва быў прадстаўлены на фестывалі «З любоўю да сала», што праходзіў у мінулыя выхадныя ў Луцку. Прадстаўнікі нацыянальнага праекта «Кнігі рэкордаў Украіны» зафіксавалі наступныя памеры мяча з сала: вышыня — 2,3 м, у абхваце — 6,45 м. Мяч вагой каля 600 кг складаецца з 34 секцый, на кожную з якіх пайшло 17 кг сшытага ніткамі першакласнага прадукту. Цёмныя сеткі мяча, які на працягу паўтара сутак абшывалі салам шасцёра дзяўчат, былі шчодра пасыпаны чорным перцам. На стварэнне такога незвычайнага мяча ўкраінцаў падштурхнуў факт правядзення ў краіне чэмпіянату Еўропы па футболе Еўра-2012. На фестывалі былі прадстаўлены таксама шахматныя фігуркі і макет Хмяльніцкай АЭС — усе з сала.

◢ Вучоныя з Вялікабрытаніі падчас даследавання высветлілі, чаму п'яныя мужчыны лічаць усіх жанчын прыгожымі. Аказваецца, што пад уздзеяннем спіртных напіткаў у мужчынскім мозгу сціраецца мяжа паміж прыгожымі і непрыгожымі тварамі. П'яныя мужчыны проста не могуць вызначыць, наколькі сіметрычным з'яўляецца твар той ці іншай дзяўчыны. А менавіта ж сіметрычнасць рыс твару і вызначае прывабнасць знешнасці чалавека.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЗА ТЫТУНЬ — ГРУЗАВІК?

Полацкія памежнікі ў пункце пропуску «Урбаны» падчас праверкі грузавога аўтамабіля «Сканія» з прычэпам выявілі схаваныя кантрабандныя цыгарэты — 370 пачак.

Польскі кіроўца рызыкнуў аўтамабілем і прычэпам коштам амаль у мільярд рублёў з-за незадэкларованых цыгарэт, якія каштуюць усяго два мільёны рублёў. Дарагое аўто з прычэпам як сродак перавозкі кантрабанды могуць па рашэнні суда канфіскаваць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСЁ, ШТО ДЛЯ БЫТУ — НА ВЫСТАВЕ «ЗДАБЫТА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Летась у аналагічнай аптовай выставе-кірмашы брала ўдзел каля 330 фірмаў і арганізацый, якія выстаўлялі сваю прадукцыю на плошчы 6,7 тысячы квадратных метраў. Сёлетні форум практычна не саступае: каб нават проста няспешна абысці два паверхі аднаго павільёна, зазірнуць у другі павільён, патрэбен час. Напэўна, невыпадкова нават у дзень адкрыцця выстава-кірмаш распачала сваю працу нязвыкла рана для такога кшталту мерапрыемстваў — з 9.30 раніцы. А тэматыка выставы-кірмашу — даволі разнастайная, яна прадстаўляе практычна ўсё тое, што акружае нас у штодзённым жыцці: электратавары, тэлерадыёапаратуру, тавары для рамонту, для гатавання і захоўвання ежы, сервіроўкі стала, працы ў садзе і агародзе, тавары бытавой хіміі...

Хоць форум разлічаны найперш на прафесіяналаў, па традыцыі яго наведваюць і шэраговыя патэнцыяльныя пакупнікі, якія праз нейкі час будуць набываць тыя ці іншыя тавары ў гандлі. Але зараз яны могуць у прамым сэнсе слоў пад адным дахам пазнаёміцца з усімі навінкамі адразу, прыцаніцца да ўпадабанай рэчы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Мурашовай Вользе Дзмітрыеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — **смерцю МАЦІ.**

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырае спачуванне начальніку фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Мурашовай Вользе Дзмітрыеўне ў сувязі з напаткаўшым яе непапраўным горам — **смерцю МАЦІ.**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВАШЫНГТОН УКЛЮЧЫЎ БЕРЛУСКОНІ Ў СПІС ГАНДЛЯРОЎ ЛЮДЗЬМІ

Прэм'ер-міністр Італіі Сільвіа Берлусконі патрапіў у штогадовую справаздачу Дэяржддэпа ЗША, прысвечаную праблеме гандлю людзьмі ў сучасным свеце. Кіраўніку кабінета міністраў Італіі ўзгадалі абвінавачванні ў камерцыйнай сэксуальнай эксплуатацыі мараканкі Рубі, паведамляе газета The Telegraph.

Спіс уключае інфармацыю пра грамадзян, якія ў той ці іншай ступені маюць дачыненне да гандлю людзьмі. Справаздача заснавана на звестках, сабраных падчас вывучэння матэрыялаў са 180 краін свету пра сучасны гандаль рабамі. Акрамя таго, прэм'ер-міністр Італіі абвінавачваецца ў садзейнічанні дзіцячай прастытуцыі (на момант сэксуальнага скандалу мараканка была непаўналетняй).

АХВЯРАМІ СНЕЖНАЙ ЗАВЕІ Ў ЗША СТАЛІ 11 ЧАЛАВЕК

Як мінімум 11 чалавек сталі ахвярамі наймацнейшых снегападаў, якія абрынуліся ў мінулыя выхадныя на паўночны ўсход ЗША. Больш за тры мільёны дамоў ад Мэрылэнда да Масачусетса адрэзаны ад электразабеспячэння, рамонтныя работы зоймуць некалькі дзён.

ВВС адзначае, што ў некаторых раёнах штата Масачусетс выпала больш за 68 мм ападкаў у выглядзе снегу. У Нью-Ёрку ўстаноўлены новы рэкорд: у Цэнтральным парку выпала 25 сантыметраў снегу.

ЯЙКІ І ФАСОЛЯ ЗДОЛЬНЫЯ АБАРАНІЦЬ АД АКІСЛЯЛЬНАГА СТРЭСУ

Вядома, што антыаксіданты здольныя разбураць свабодныя радыкалы, небяспечныя для здароўя чалавека. Традыцыйна іх шукаюць у гародніне, садавіне. Аднак адмыслоўцы прапануюць звярнуць увагу і на іншыя прадукты. Вельмі карысныя яйкі. У іх утрымліваецца антыаксідант лютэін, які абараняе вочы ад макулярнай дэгенерацыі і катаракты. Больш за тое, лютэін з яек засвойваецца ў 3 разы лепш, чым, да прыкладу, са шпінату.

Кансерваваная фасоля патрапіла пад пільную ўвагу адмыслоўцаў у 2004 годзе. Тады супрацоўнікі міністэрства сельскай гаспадаркі ЗША выявілі пэўныя тыпы сушанай фасолі, якія адрозніваюцца павышаным узроўнем антыаксідантаў. Часцей за ўсё фасоля ўжываецца менавіта ў кансерваваным выглядзе. Па канцэнтрацыі фенольных злучэнняў і флаваноідаў у кансерваванай фасолі лідзіруе маленькая чырвоная фасоля.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 01 декабря 2011 г. в 11.30 состоятся открытые аукционные торги по продаже имущества ликвидируемого предприятия РУПП «Меховая фабрика» (продавец), расположенного по адресу: г. Бобруйск, ул. Бахарова, 206, в составе предмета торгов:

Лот № 1: Изолированное помещение с инвентарным № 710/D-62059 (производственный корпус) общей площадью 6 854,2 кв.м
Лот № 2: Изолированное помещение с инвентарным № 710/D-62058 (административно-производственный корпус) общей пл. 3 712,2 кв.м

Продавец (право хозяйственного ведения)	**Республиканское унитарное производственное предприятие «Меховая фабрика», УНП 700067212**, 213823, г. Бобруйск, ул. Бахарова, 206
Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509,** ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369)
Место проведения торгов и подачи документов	**г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»**
Общие сведения	**Лот № 1** / **Лот № 2**
Информация о земельном участке	**Лоты № 1 и № 2** расположены на земельном участке с кадастровым номером **741000000008002873 площадью 0,7370 га,** правовой режим – право постоянного пользования
	Доля лота № 1 в земельном участке составляет – 6400/10000 долей, что соответствует 0,4717 га / Доля лота № 2 в земельном участке составляет – 3446/10000 долей, что соответствует 0,2554 га
Начальная цена предмета торгов	**2 892 000 000 рублей с учетом НДС** / **2 544 000 000 рублей с учетом НДС**
Размер задатка	**10 %, что составляет 289 200 000 рублей** / **10 %, что составляет 254 400 000 рублей**
Характеристика предмета торгов	4-этажное кирпичное помещение с подвалом 1978 г.п., фундамент бетонный, перекрытия ж/б, кровля совмещенная, имеются все инж. коммуникации / 4-этажное кирпичное помещение 1978 г.п., фундамент бетонный, перекрытия ж/б, кровля совмещенная, имеются все инж. коммуникации
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа – РУПП «Меховая фабрика»: р/счет 3012000002388 в филиале 703 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бобруйска, код 760, УНП 700067212**
Условия продажи	Без условий
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукционных торгов
Срок и условия оплаты за предмет торгов	Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка	**с 01 ноября по 30 ноября 2011 г. включительно до 16.00**

Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы: заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц –** нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам–** документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус. (рус.) язык; **представителям юр.лиц и физ. лиц –** легализованную в установленном порядке доверенность.
Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный победителем торгов (претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов (продавец) вправе снять имущество с торгов до объявления его проданным. **Победитель (претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Открытое акционерное общество «Белпромтара» уведомляет своих акционеров, что 18 ноября 2011 года в 15.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Белпромтара»,
расположенного по адресу: г. Минск, 1-ый Твердый пер., 7.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О дополнительном выпуске акций ОАО «Белпромтара».
1.1. Об увеличении уставного фонда Общества.
1.2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
1.3. Утверждение решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Белпромтара».

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 1-ый Твердый пер., 7, начиная с 11 ноября 2011 г. (время работы с 9.00 до 17.00) либо в день проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.45 до 14.45 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра владельцев акций на 01 ноября 2011 г.

Для регистрации при себе необходимо иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Справки по тел.: 291 83 10, 294 66 14. УНП 100230455

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
извещает о проведении 05 декабря 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Склад химических реагентов, инв. № 350/С-45222, площадью 335,9 кв.м**	г. Гомель, ул. Барыкина, 309	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Советского района г. Гомеля	Одноэтажное кирпичное, перекрытие железобетонное, электроосвещение	**246 812 000**	**10 000 000**
2	**Склад стройматериалов, инв. № 350/С-44929, площадью 233,3 кв.м**	г. Гомель, ул. Барыкина, 309	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Советского района г. Гомеля	Одноэтажное кирпичное, перекрытие железобетонное, электроосвещене	**292 454 000**	**11 000 000**

Шаг аукциона – 5 %. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 01 декабря 2011 г. включительно. Для участия в аукционе в адрес Организатора аукцион необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе. 2. Копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. 3.Организациям – резидентам Республики Беларусь – доверенность представителю организации (кроме случаев, когда организацию представляет ее руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации,

ВЁСКА — ІХ ДОМ

У Слаўгарадскім раёне дзве маладыя сям'і з аграгарадка Ржаўка сталі пераможцамі конкурсу на самы ўзорны дом

Узорная сям'я: Сталярэнкі з аграгарадка Ржаўка.

ДЗІЦЯЧЫ КУТОК

Пакуль 8-гадовы Сярожа Сталярэнка чытае ўслых пра «Вялікую таямніцу Хамы і сусліка», яго смяшлівая малодшая сястра, 6-гадовая бландзінка Юля ў модных джынсах, апетытна хрумсціць чыпсамі.

У дзіцячым пакоі — шпалеры з Мікі-Маусамі, яркія пакрывалы на ложках, стол для заняткаў. У малых столькі энергіі, што пераход ад хатняга спакою да вулічнай гульні займае ледзь хвілінку. Юлька і Сярожа бягуць да свайго кутка на падворку (там вясёлыя арэлі і цацачная хатка), абаяльна ўсміхаюцца праз акенца, пакуль паласатаму кату Тайсану не надакучвае пазіраваць. Жывёла кідаецца ва ўцёкі, дзеці даганяюць на аўтамабілі. Усім смешна і радасна!

— Увогуле нам добра жывецца, — радасна паведамляюць дзеці. — Мы любім разам з сябрамі ў схованкі гуляць, качацца на арэлях, прыбіраць наш домік, які тата пабудаваў.

Менавіта гэты дзіцячы закутак адразу зрабіў вялікае ўражанне на журы агляду-конкурсу «Узорны падворак маладой сям'і». Начальнік аддзела па справах моладзі Слаўгарадскага райвыканкама Юрый Данянкоў сказаў: «Відавочна, што ў гэтай маладой сям'і ўсё скіравана на выхаванне і развіццё дзяцей, а гэта вельмі важна».

Наталля і Міхаіл Сталярэнкі сталі пераможцамі конкурсу: пра гэта цяпер нагадвае вялізная карціна з пейзажам, які аддалена нагадвае родныя слаўгарадскія краявіды. Падарунак упрыгожвае сцяну гасцёўні ва ўзорным доме.

— Для таго, каб мець узорны дом, трэба любіць працу, толькі ўсяго, — дзеліцца Наталля.

Яны ўжо 9 гадоў разам: маладыя аднавяскоўцы хадзілі побач, гулялі разам на дыскатэках, а потым і пажаніліся. Спачатку вялікі букет руж на жаночае свята, а потым і вяселле ў снежны Новы 2002 год. Маладыя адзначылі падзею разам са сваякамі і сябрамі ў калгаснай сталовай. Дом дала гаспадарка, нарадзіліся дзеці. Звычайная гісторыя, добрае жыццё.

Цяпер Наталля — загадчыца фермы, а Міхаіл працуе машыністам на станцыі.

— Мы ў горад не рванулі. Мы самі родам з вёскі, і вёска — наш дом.

РАЗАМ ВЕСЯЛЕЙ

— Я тут застануся жыць, — вырашыў Сярожа. — Буду, як татка, працаваць.

— А я буду рабіць, як маці, — посуд мыць і прыбіраць, — падхоплівае сястрычка. — І будуць у мяне сям'я і двое дзетак.

Вясковыя дзеці не толькі вучацца і гуляюць, яны не лянуюцца дапамагаць бацькам па гаспадарцы — як могуць. Падмесці, прыбраць смецце, навесці парадак. Можа, таму вясковы дом Сталярэнкаў уражвае чысцінёй і выклікае не проста зайздрасць, а нават вострае пачуццё уласнай недасканаласці.

— Гэта ўсё для нас саміх: каб было прыемна пасля працоўнага дня прыйсці дадому, адпачыць і заняцца дзецьмі. Калі мы сюды прыйшлі, тут быў толькі дом з голымі сценамі і маленькі хлеў. Усё зроблена сваімі рукамі.

Рамонт бацька робіць самастойна, а ў гаспадыні хапае часу за працай, домам і дзецьмі займацца кветкамі. Каля плота буяюць познія аксаміткі. А вось убачыць сапраўдныя, а не на шпалерах у гасцёўні, жывапісныя вадаспады — гэта пакуль застаецца сямейнай марай. Альбо, калі хочаце, перспектыўным планам.

— Цяпер, вядома, цяжкавата. Рамонт кухні адклалі да лепшых часін. Але ў нас на стале заўсёды здаровае харчаванне — са сваёй гаспадаркі. Агародніну вырошчваем, ад каровы — малочныя прадукты (і дзяржаве прадаём малако), трымаем свіней і курэй, так што мяса і яйкі — таксама свае. Ды і заробак плацяць своечасова. Толькі жыві!

— Жонка і муж — сціплыя людзі, і таму яны не вельмі любяць казаць услых пра пачуцці. Тады спрабуюць расказаць пра лепшыя якасці партнёра: яна — добры чалавек і выдатная гаспадыня, а ён — спакойны, ураўнаважаны, уважлівы.

— Трэба разумець адно аднаго, саступаць, — нагадвае пра адвечную формулу Наталля. — Гэта ж так проста! Калі мы разам — у нас усё атрымліваецца. Мы адно аднаго выслухаем, падтрымаем добрай парадай. Мы — апірышча адно для аднаго.

— Ці можна было б усяго гэтага без жонкі дасягнуць? — неяк здзіўлена перапытвае Міхаіл. — Без Наташы было б немагчыма! Ды і мне аднаму гэта не патрэбна! Удваіх жыць і працаваць весялей.

СУР'ЁЗНЫЯ ЛЮДЗІ

Агарод — гордасць Дзянісавых. Яркімі колерамі радуюць познія восеньскія хрызантэмы. «Дзівочы» вінаград з жоўта-чырвоным лісцем упрыгожвае сценку. На градках расце кваснатая капуста — харчовая гордасць маладой гаспадыні. Аксана — кухар па адукацыі, і таму стравы з карыснай агародніны ёй удаюцца.

— У нас раней кваснатую капусту ніхто і не вырошчваў, а я навучылася на практыцы ў Адэсе рабіць яе кавалкамі ў кляры альбо ў вадкім цесце, — дзеліцца жанчына. — Калі ў першы раз прыгатавала страву аднавяскоўцам, ніхто не мог угадаць, што гэта насамрэч. Меркавалі, што нейкая рыба!

Аксана паказвае падворак і адначасова дае парады, як гатаваць аладкі з кваснатай капустай для дзяцей: пакрышыць дробна, змяшаць з цестам, накладаць на патэльню сумесь лыжкамі, смажыць у алеі. Хутка і смачна: такую страву любяць і малыя, і муж.

Дарэчы, галаву сям'і давялося ўбачыць толькі на вясельных фота. Леанід — механізатар. Зараз ён заняты на восеньскіх палявых работах. Гісторыю іх сумеснага жыцця расказала жонка. Яны ведалі адно аднаго са школы, але ўсё адбылося значна пазней. Выпадковая сустрэча, каханне з аднаго погляду — і вяселле ў Ржаўцы.

— Два чалавекі — адна мэта, — тлумачыць Аксана. — Нам абодвум патрэбна была моцная сям'я, з дзецьмі, гаспадаркай, падворкам. Усё надзейна, ніякіх загулаў. Мы — сур'ёзныя людзі. Можа, гэта і ёсць падмурак для шчасця і ўзорнасці, калі хочаце.

Сям'я Дзянісавых заняла другое месца ў конкурсе-аглядзе, але лідары-аднавяскоўцы адарваліся ад іх толькі на адзін бал. Таму кіраўніцтва Слаўгарадскага райвыканкама віншавала адразу дзве сям'і, і цяпер сцяну ў гасцёўні Дзянісавых таксама ўпрыгожвае пейзаж. Пад новай карцінай — старая швейная машынка.

— Набылі машынку, каб рамантаваць і потым шыць адзенне, — паказвае яна. — Я цяпер вучуся на дыстанцыйных курсах швачнаму майстэрству. А што ж? Гэта эканомія! Маладым сем'ям заўсёды нестае грошай: рамонт новага дома, нараджэнне дзяцей, стварэнне ўласнай гаспадаркі. Але мы робім усё з розумам — і перамагаем.

Цікава, што новыя ідэі для выкарыстання старой швейнай машынкі маці і дачка Дзянісавы шукаюць з дапамогай новай тэхналогіі — у інтэрнэце. Маша, якой толькі 7 гадоў, атрымала камп'ютар з выхадам у сеціва.

— Няхай нашы дзеці будуць, кім захочуць, але галоўнае, каб не адрываліся ад цывілізацыі, — лічыць маладая маці.

СТАРАМОДНАЕ ШЧАСЦЕ

На сцяне ў спальні вісіць сучасная выява прыгожай жанчыны. З такім жа поспехам, падаецца, можна было ўпрыгожыць пакой партрэтам самой гаспадыні: Аксана — 27-гадовая беларуская прыгажуня, нічым не горшая за рэкламную. Стройная: маўляў, ніякага фітнэсу не патрабуецца, калі штодзень шчыраваць па гаспадарцы. Спагадлівая: падымаецца раней за ўсіх, каб прыгатаваць снеданне, выправіць мужа на працу. Напэўна, на хобі часу не застаецца?

— У мяне хобі на агародзе і ў хляве: гэта — бульба і агародніна, свінні і каровы, — смяецца Аксана. — Але калі сур'ёзна, то дзеці — маё хобі, самае любімае, і мэта нашага з мужам жыцця.

У дзіцячым пакоі над ложкам Машы вісяць крылы анёла. Гэтую частку навагодняга строю можна надзяваць для падняцця настрою ўвесь год: вось як цяпер, калі дзяўчынка малюе, а потым зашывае падушку, якая пацярпела ў бойцы. Анёлы і падушачныя бойкі — рэчы цалкам сумяшчальныя ў дзяцінстве.

— Сельскія дзеці гадуюцца самастойнымі людзьмі, якія не страцяцца ў любых варунках, — лічыць Аксана. — Яны будуць загартаваны. У горадзе пражывуць, а вось гарадскія ў вёсцы — сумняваюся. Мае дзеці ўдваіх мне і цяпер дапамогуць на кухні і ў гаспадарцы. І градкі прапалоць, і карову прывязаць, калі маці затрымліваецца і не паспявае. Нават нягледзячы на малы ўзрост.

Вадзік, якому толькі 4 гады, больш цікавіцца яшчэ катом Рыжыкам, які гучна бурчыць нібыта па замове, і машынкамі, што цалкам лагічна для сына механізатара.

— Жыццё рознае: бывае і радаснае, бывае і не вельмі, хапае ўсяго, — падсумоўвае Аксана. — Добра, калі дзіця вяртаецца са школы задаволенае. Добра, калі муж прыходзіць з працы не вельмі стомлены. Я, напэўна, старамодная. Я рада і спакойная тым, што ў маім жыцці парадак. Калі маім блізкім добра — тады і мне добра. Няхай усім навокал будзе добра, во тады мне шчасце!

СЫТНА І ЎТУЛЬНА

Раённы агляд-конкурс «Узорны дом маладой сям'і» праводзіцца на Слаўгарадчыне штогод. У раённай газеце «Прысожскі край» даецца аб'ява, і ўсе сельсаветы заяўляюць сваіх удзельнікаў. Ствараецца спецыяльная камісія, якая аб'язджае ўсе падворкі.

— Мы прыязджалі без папярэджання, — расказаў удзельнік камісіі Юрый Данянкоў. — Але адразу было відаць, што тут жывуць маладыя гаспадары, якія працуюць дзеля дастатку — каб было сытна і ўтульна жыць дзецям і дарослым.

За ўдзельнікаў конкурсу можна было і галасаваць па тэлефоне, і людзі шмат казалі добрых слоў пра маладыя сем'і, у якіх можна многаму навучыцца.

Дарэчы, перамога не дае матэрыяльнай выгады: дзецям уручылі школьныя прыналежнасці, іх бацькі разам з карцінамі атрымалі ад мясцовых улад падзякі за актыўную жыццёвую пазіцыю. Але ёсць маральнае задавальненне, прызнанне грамадскасці. Быць узорам для людзей і самім імкнуцца да лепшага — гэта ганаровая і добрая справа.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Слаўгарадскі раён.

Аксана Дзянісава, яе дзеці і кваснатая капуста.

КОШТ ПРАЕЗДУ ЦЯПЕР НОВЫ

Рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта зменены тарыфы на гарадскія перавозкі пасажыраў і ручной паклажы ўсімі відамі транспарту ў рэгулярных зносінах, а таксама тарыфы на прыгарадныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў і ручнога багажу ў рэгулярных зносінах.

Што датычыцца першых, установлены фіксаваны тарыф на перавозкі пасажыраў аўтобусамі з дазволенай максімальнай масай больш за 5 тон на звычайных і хуткасных маршрутах у памеры 1 100 рублёў за адну паездку. Гранічны фіксаваны тарыф на гарадскія перавозкі на экспрэсных маршрутах — 1 600 рублёў за адну паездку. Фіксаваны тарыф на гарадскія перавозкі ручной паклажы аўтобусамі ў рэгулярных зносінах зараз складае 1 100 рублёў за адно месца ручной паклажы. Пры продажу кіроўцамі білетаў на адну паездку пры карыстанні звычайнымі і хуткаснымі маршрутамі тарыф павялічваецца на 100 рублёў.

Калі гаварыць пра тарыфы на прыгарадныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў, тут цяпер сітуацыя наступная: устаноўлены гранічныя максімальныя тарыфы ў рэгулярных зносінах за адзін кіламетр праезду. На звычайных маршрутах: у аўтобусах агульнага тыпу — 220 рублёў, у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 228 рублёў. На хуткасных маршрутах: адпаведна 286 і 296,4 рубля за адзін кіламетр праезду ў залежнасці ад камфортнасці аўтобуса. На дадатковых рэйсах праезд давядзецца аплачваць з разліку: у аўтобусах агульнага тыпу — 297 рублёў, у машынах з мяккімі адкіднымі крэсламі — 307,8 рубля. На экспрэсных маршрутах дзейнічаюць наступныя тарыфы: 330 рублёў за адзін кіламетр праезду — у аўтобусах агульнага тыпу, 342 рублі — у больш камфортных машынах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі. Гранічныя максімальныя тарыфы на прыгарадныя аўтамабільныя перавозкі багажу (ці ручной паклажы) у рэгулярных зносінах і дадатковых рэйсах за адзін кіламетр праезду цяпер такія: за кожнае маламернае месца — 17,8 рубля, за кожнае сярэдняе — 35,5 рубля, за буйное — 71 рубель.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абнаўленне www.pravo.by

У краіне стала даступнай новая версія Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала Рэспублікі Беларусь. Новую версію www.pravo.by распрацавалі спецыялісты Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Партал, створаны ў 2003 годзе, з'яўляецца асноўным дзяржаўным інфармацыйным рэсурсам глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт.

Паводле слоў **дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алега КРАЎЦОВА,** згаданы інтэрнэт-рэсурс стаў для нашых суайчыннікаў і замежных карыстальнікаў крыніцай аператыўнага атрымання прававой інфармацыі, звестак аб развіцці навукі і практыкі ў галіне прававой інфарматызацыі, а таксама аб дзяржаўных органах улады і кіравання. Сёлета інтэрнэт-карыстальнікі наведалі партал больш за 1100 тыс. разоў. Укараненне новай версіі дае магчымасць усім зацікаўленым больш падрабязна даведацца аб дзяржаўнай палітыцы ў галіне прававой асветы, пазнаёміцца не толькі з прававымі актамі, надрукаванымі ў электроннай версіі афіцыйнага перыядычнага друкаванага выдання «Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь», Канстытуцыяй і кодэксамі краіны, але і атрымаць з дапамогай інтэрнэт-паслугі «ЭТАЛОН-ONLINE» доступ да ўсяго заканадаўства Беларусі, банка звестак «Судовая практыка». Наведвальнікі могуць ацаніць новы карыстальніцкі інтэрфэйс партала і інфармацыйнае напаўненне яго раздзелаў, накіраванае на своечасовае забеспячэнне грамадзян, дзяржаўных органаў і іншых арганізацый поўнай і дакладнай прававой інфармацыяй. Прапановы па далейшай папулярызацыі і развіцці партала можна пакінуць у блогу НЦПІ http://ncpi.gov.by.tut.by і на форуме партала. Прапановы аб супрацоўніцтве неабходна накіроўваць на адрас электроннай пошты portal@ncpi.gov.by.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Блізкая ўлада

Наведайце Нясвіж — і вы не пашкадуеце

Па сутнасці, бясконцы клопат у сельскага працаўніка. Незвычайна ранні сёлета перадзімак ужо няблага пакрывае раніцай першым срэбрам зямлю, а на сельскагаспадарчых палетках па-ранейшаму шчыруе тэхніка. У прыватнасці, на палях Нясвіжчыны на час наведвання раёна поўным ходам ішла ўборка кукурузы. Вядома, на зерне.

А кукуруза на Нясвіжчыне ўдалася як ніколі: сярэдняя ўраджайнасць раёна складала тут 120 цэнтнераў з гектара, прычым у добра вядомым у краіне агракамбінаце «Сноў» яна дасягала ажно 134 цэнтнераў. Дарэчы, яшчэ такі штрых у сельскагаспадарчую палітру Нясвіжчыны: вызваленыя ад сёлетняга ўраджаю палі прама-такі зіхацелі ад густога ізумруднага покрыва азімых будучага ўраджаю. Выдатная рунь. «Толькі б не пашкодзіла надвор'е», — з відавочным клопатам казалі тут ужо менавіта пра будучы ўраджай.

Падчас наведвання раёна мы сустрэліся са старшынёй Нясвіжскага райвыканкама Іванам КРУПКО. І для гэтага, дарэчы, была неблагая нагода: якраз год таму ён стаў на чале раённай «вертыкалі».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

* * *

— Іван Іванавіч, наколькі б і не былі важнымі пытанні гаспадарчага развіцця раёна (і, вядома, у першую чаргу — сельскагаспадарчага), тым не менш, хочацца пачаць з таго, што ваш горад нядаўна аб'яўлены ў краіне яе культурнай сталіцай наступнага года. Варта павіншаваць вас з гэтым і запытацца: не выпадкова?

— Спачатку хачу ўдакладніць: такая акцыя, па прысваенні гораду звання культурнай сталіцы года, узяла свой пачатак летась, і першым у гэтым плане стаў Полацк, потым — Гомель. Ну, а што датычыць пытання «ці выпадкова?», — вядома ж, не. Мы склалі адпаведную конкурсную праграму, ездзілі абараняць яе, ці, дакладней, — рабіць прэзентацыю, а ў выніку абышлі нават такіх грандаў, як Магілёў, Баброўск, Ліда і іншых. Што давядзецца зрабіць у рамках гэтай акцыі? У першую чаргу, прадставіць свае творчыя калектывы, якіх у нас вельмі шмат — на прадпрыемствах, пры раённым ДК, практычна ў кожнай другой гаспадарцы раёна. Нагадаю: у нас, напрыклад, дзейнічае добра вядомы тэатр імя Уршулі Радзівіл — гэта заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь; у нас ужо больш за 15 гадоў штогод праводзіцца міжнародны фестываль камерной музыкі «Музы Нясвіжа»; два гады запар праводзяцца вечары Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі ў замку; 15 самадзейных калектываў раёна носяць званне «народны» і «ўзорны»... Чакаюцца таксама іншыя цікавыя мерапрыемствы культурнага характару.

Ужо цяпер нямала зроблена і будзе зроблена ў рамках падрыхтоўкі да гэтай акцыі. Пачну з таго, што ўжо закончаны будаўніча-мантажныя рэстаўрацыйныя работы на Нясвіжскім палацава-паркавым ансамблі князёў Радзівілаў; у асноўным засталося запоўніць залы экспанатамі ды падрыхтаваць іх належным чынам для наведванняў; хіба што яшчэ чакае немалы комплекс работ у самім парку гэтага ансамбля.

Акрамя гэтага, будзе зроблена рэстаўрацыя Фарнага касцёла Божага Цела, якому, варта нагадаць, ужо больш за 400 гадоў. У свой час таксама ўзведзена на галоўнай плошчы горада цудоўная Ратуша з музеем. У нас дзейнічае выдатна адрэстаўраваны раённы краязнаўчы музей; госці нашай культурнай (па наступным годзе) сталіцы, могуць палюбавацца на вядомую Слуцкую Браму. Адным словам, мы зможам прапанаваць шмат спецыяльных культурных праграм, паказаць гасцям нямала цікавых аб'ектаў. Я звяртаюся да іх: наведайце Нясвіж — і вы не пашкадуеце.

* * *

— Ну, а цяпер, так бы мовіць, паціху пяройдзем ад культуры да вытворчасці. Такім чынам, вы якраз роўна год на гэтай адказнай пасадзе. І можна меркаваць, у добры час занялі яе. Вунь якія паказчыкі па ўраджайнасці кукурузы...

— Калі казаць менавіта пра аграпрамысловы комплекс раёна і пра тыя праблемы, якія напаткалі яго за гэты год, — увогуле, нялёгка прыйшлося ў гэтым першым годзе. На зімні перыяд чатыры адлігі былі — і, адпаведна, азімыя перазімавалі вельмі дрэнна. А ў выніку ажно тры тысячы гектараў перааралі, чатыры тысячы гектараў ушчыльнілі яравымі. А яшчэ да гэтага варта дадаць засуху на пачатку лета. А ў выніку сабралі збожжавых усяго па 54,3 цэнтнера з гектара, хоць, здаецца, і зрабілі ўсё належнае, каб атрымаць больш. Словам, гэта — адназначна мала для нас, гэта — менш за леташні ўзровень. Праўда, разам з тым, сапраўды, кампенсавалі ўсё кукурузай. І сёлета агульны вал збожжавых і зернебабовых павінен перавысіць леташні ўзровень (вядома, з дапамогай кукурузы) на 3—4 тысячы тон. У цэлым гэты вал павінен скласці 169 тысяч тон; 46 тысяч тон, па папярэдніх прыкідках, зойме ў ім менавіта кукуруза. Адсюль жа вынікае і паспяховае выкананне адпаведнага задання па рэалізацыі збожжавых дзяржаве, і належнае забеспячэнне добрымі кармамі нашай маштабнай жывёлагадоўчай галіны.

Вельмі добра ўрадзілі сёлета ў гаспадарках раёна цукровыя буракі. Калі летась іх вал склаў 272 тысячы тон, то сёлета чакаем 300 тысяч тон. А самае галоўнае, сёлета мы маем іх цукрыстасць на ўзроўні 17,4 працэнта пры базіснай цукрыстасці 16 і леташнім паказчыку 15,6. Раён таксама плюсуе да леташняга ўзроўню па малацэ, прычым гадавыя надоі на карову, у сярэднім па раёне, складаюць амаль 7000 кілаграмаў. Раён дасягнуў вельмі высокай шчыльнасці буйной рагатай жывёлы і ў разліку на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў мае 100 галоў, высокай шчыльнасці свіней — у разліку на 100 га раллі 142 галавы; мае добрыя паказчыкі па прывагах як у вырошчванні буйной рагатай жывёлы і свіней, так і ў вырошчванні птушкі.

ДА ВЕДАМА. Жывёлагадоўля (і дадаткова птушкаводства) пры ўсёй важнасці асобных кірункаў раслінаводства з'яўляецца ў раёне вядучай галіной. На жывёлагадоўлю і птушкаводства працуе каля 86 працэнтаў усёй зямлі.

Увогуле ж, чакаем, што закончым сёлетні год з ростам валавай прадукцыі ў АПК адносна папярэдняга года да 107 працэнтаў і грашовай прыбаўкай у 17,5 мільярда рублёў.

Яшчэ раз падкрэслю: дасягнутыя паказчыкі дасталіся для нас нялёгка, нам пры гэтым, вядома ж, увогуле нялёгка трымаць той, бяспрэчна, вельмі высокі ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці, які быў дасягнуты ў раёне ў ранейшыя гады, утрымліваць набраны тэмп развіцця. Але інакш проста нельга: спыніцца ў гэтым развіцці — значыць страціць той жа тэмп, значыць страціць сваё месца сярод лідараў краіны, якое раён упэўнена заняў яшчэ колькі гадоў таму. Нам няпроста, але ў нас ёсць нямала выдатных, узорных гаспадарак, выходзячы з прагрэсіўнага сучаснага вопыту якіх можна сфарміраваць агульную стратэгію развіцця. У нас няма стратных гаспадарак; у кожнай гаспадарцы ёсць кіраўнікі, галоўныя спецыялісты, спецыялісты сяржэнта звяна, якія ўмеюць працаваць, якія бачаць дакладную перспектыву.

ДА ВЕДАМА. Нямала якія гаспадаркі краіны зведваюць такую праблему, як цякучасць спецыялістаў, асабліва маладых, з даволі частай у маладых наступнай установуай: адпрацаваў пасля ВНУ належныя два гады — і з'ехаў. У гаспадарках Нясвіжскага раёна яшчэ 5 гадоў таму таксама зведвалі такую ж праблему, калі замацоўваўся практычна толькі кожны трэці малады спецыяліст — цяпер жа замацоўваецца не менш за 70 працэнтаў.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Іван Іванавіч, тая ж агучаная вамі стратэгія развіцця, вядома, мае на ўвазе нейкія далейшыя дакладныя задачы і праекты?

— Безумоўна. І наша найпершая задача — абнаўленне, а дакладней — тэхнічнае абнаўленне ў жывёлагадоўлі. З 2004-га па 2007 год такое абнаўленне ішло пераважна ў раслінаводстве: гаспадаркі інтэнсіўна набывалі магутныя збожжаўборачныя камбайны, энерганасычаныя трактары, новыя, сучасныя сеялкі, агрэгаты для нарыхтовак і вытворчасці кармоў. А ў 2008 годзе з'явіўся Указ Прэзідэнта аб будаўніцтве ў кожным раёне па новай малочнатаварнай ферме, і гэта дало вельмі неабходны штуршок для тэхнічнага абнаўлення ў жывёлагадоўлі. Увогуле, у жывёлагадоўлі тэхнічная мадэрнізацыя, у адрозненне ад раслінаводства, ідзе больш марудным тэмпамі. І гэта заканамерна. Тут значна большыя аб'ёмы, капітальныя ўкладанні, якія трэба дакладна распланаваць, улічыць, як узятыя крэдыты своечасова вярнуць, пагасіць... І тут жа хачу падкрэсліць: усё ў нас у гэтым плане атрымліваецца вельмі няблага. У 2008 годзе ў сціслы тэрмін была пабудавана выдатная сучасная малочнатаварная ферма ў СВК «Грыцкевічы», сёлета ўведзены рабатызаваныя фермы ў «Нясвіжскіх Астроўках» і «Гарадзеі», а таксама новая, сучасная МТФ у ААТ «Новае жыццё»; сёння ў шэрагу гаспадарак вядуцца работы па рэканструкцыі фермаў. Ідзе актыўная мадэрнізацыя і ў свінагадоўлі і ў птушкагадоўлі. І гэта найперш за ўсё датычыць нашага сельскагаспадарчага флагмана — агракамбіната «Сноў», у якім закладваецца шэраг новых жывёлагадоўчых памяшканняў.

Адным словам, гаспадаркі нармальна адпрацоўваюць грошы, узятыя па крэдытах, своечасова плацяць банкам і адначасова атрымліваюць прадукт, атрымліваюць новыя грошы.

Варта тут жа дадаць: на тэрыторыі раёна на базе жывёлагадоўчых комплексаў узводзяцца біягазавыя энергетычныя ўстаноўкі, якія дадуць гаспадаркам танную электраэнергію. Адна з такіх установак будзе ўведзена ў кастрычніку—лістападзе, у прыватнасці — у агракамбінаце «Сноў». І гэта таксама добрая адметнасць нашага агульнага прагрэсу.

ДА ВЕДАМА. Кожны сельскагаспадарчы працаўнік раёна вырабіў за 2010 год валавай прадукцыі на суму больш за 70 мільёнаў рублёў. Гаспадаркі раёна яшчэ ў 2003—2004 гадах перавысілі ўзровень 1990 года, за апошнюю пяцігодку павялічылі выпуск прадукцыі на 40 працэнтаў.

На долю Нясвіжскага раёна, які займае 3,7 працэнта Мінскай вобласці, прыходзіцца 8 працэнтаў усёй сельскагаспадарчай прадукцыі, што вырабляецца ў вобласці.

* * *

Аднак спынім гэты пералік, безумоўна, вельмі важкіх лічбаў і паказчыкаў, якімі насыцілі нас у раёне. Разбавім іх чым-небудзь, што больш патрэбна, скажам так, для душы. Мы не выбіралі дзень візіту ў Нясвіжскі раён, але так ужо здарылася: адразу ж патрапілі тут у лік амаль што ганаровых гасцей. А ў раёне (і ў прыватнасці ў агракамбінаце «Сноў» урачыста адкрывалі плавальны басейн. Выдатны басейн атрымаўся: вялікі, са стандартнымі плавальнымі дарожкамі і «лягушатнікам» побач жа, з усёй неабходнай інфраструктурай. Спецыяльнага заплыву мы не рабілі і не ведаем, наколькі ў ім было камфортна. Але, калі можна было меркаваць па групе дзяцей, якія паспелі ў басейн раней за тых, хто пераразаў чырвоную стужку, і дружна плёскаліся ў ім, — было ў ім яўна нядрэнна... Такія ж выдатныя басейны ёсць на Гарадзейскім цукровым камбінаце, у самім Нясвіжы. Сёлета ж у агракамбінаце «Сноў» узвялі цудоўную амбулаторыю, якую неяк і не зусім правільна называць амбулаторыяй: хутчэй — гэта сапраўдная паліклініка. Такі ж аб'ект медыцынскага прызначэння ўзвялі нядаўна і ў гаспадарцы «Лань-Нясвіж». Можна назваць тут і іншыя аб'екты сацыяльнага прызначэння, але лепш скажам пра тое, што ў планах. А ў планах будаўніцтва (у Нясвіжы) новага радзільнага дома, новай чатырохзоркавай гарадской гасцініцы, новага, больш прасторнага ДК, новай аўтастанцыі, рэстарана і шэрагу невялічкіх «кафэшак»... Галоўная задача ўсіх гэтых аб'ектаў, вядома ж, заключаецца ў тым, каб зрабіць жыццё жыхароў і горада, і раёна больш камфартабельным, больш прыемным, а таксама ў тым, каб сам Нясвіж зрабіць яшчэ больш прыгожым. Але не толькі гэта мае на ўвазе кіраўніцтва раёна. Яно таксама стаіць перад сабой і наступную задачу: прыцягнуць у горад і раён як мага больш турыстаў.

ДА ВЕДАМА. Яшчэ некалькі гадоў таму, у 2008 годзе, Нясвіжчыну наведала 80 тысяч турыстаў, а сёлета за 9 месяцаў — каля 220 тысяч.

— Іван Іванавіч, узвядзенне падобных аб'ектаў — гэта, вядома, вельмі важна. Але вырашэнне сацыяльных пытанняў, і асабліва ў наш не зусім лёгкі час, напэўна, павінна стаяць на першым плане. І ў першую чаргу ваш, безумоўна, заключаецца ў працаўладкаванні людзей, у тым, каб яны атрымлівалі годную заработную плату...

— І вядома ж, мелі дах над галавой. Дык вось, што датычыцца «даху», раён вельмі шмат будуе, і вастрыня жыллёвай праблемы ў нас няўхільна зніжаецца. У нас пры гэтым паспяхова рэалізуюцца праграмы «Старое жыллё» і «Сацыяльнае жыллё». Напрыклад, цяпер па праграме «Сацыяльнае жыллё» праектуюцца 40-кватэрны дом у Нясвіжы і 12-кватэрны ў пасёлку Гарадзея — у іх атрымаюць кватэры тыя, хто ў свой час, у дзяцінстве, засталіся сіротамі. Не так даўно рашэннем райвыканкама выдзелена ў Паўночным мікрараёне 250 участкаў для індывідуальнага будаўніцтва, прычым тут ужо пракладзены ўсе сеткі інжынернай інфраструктуры. У раёне сфарміравана 15 аграгарадкоў.

А цяпер вернемся да пачатку нашага пытання — аб працаўладкаванні... На гэты конт вось вам прыклады. Да зусім нядаўняга часу практычна на ладан дыхала наша швейная фабрыка. Але дамовіліся з Дзяржынскім «Элізам» і адкрылі на фабрыцы спецыяльны цэх ад гэтага прадпрыемства. Там устанавілі новае абсталяванне, абучылі нашых людзей непасрэдна на «Элізе»... Яны нядаўна атрымалі сваю першую заработную плату — яна намнога вышэйшая за тую, якую тут мелі раней. Цяпер мяркуем пашырацца — набраць яшчэ адну групу дзяўчат, навучыць іх на працягу 2—3 месяцаў на «Элізе» і зрабіць у гэтым цэху другую змену.

Таксама нядаўна, сёлета ж, наш Гарадзейскі цукровы камбінат выкупіў прадпрыемства, якое раней працавала на базе яго сыравіны, але год таму спыніла сваю дзейнасць, збанкруцілася. Тут адноўлена абсталяванне, наладжаны выпуск джэмаў, канфіцюраў і іншай салодкай прадукцыі. Думаем ужо сёлета выйсці на 12 мільярдаў рублёў, намечаныя ж гадавыя аб'ёмы — каля 70 мільярдаў. Пры гэтым мяркуецца, што 97 працэнтаў прадукцыі будзе адпраўляцца на экспарт. На гэтым прадпрыемстве будуць мець працу 100 чалавек.

Увогуле, калі казаць пра нашу прамысловасць у цэлым, мы апошнім часам імкнёмся, каб яна мела менавіта імпартазамяшчальны характар. Ужо ў наступным годзе ў нас пачне работу цэх па размоле зерня кавы натуральнай і яе фасоўцы, прадпрыемства па вырабе алею з насення рапсу. Словам, прамысловасць раёна таксама добра развіваецца, і ў гэтым плане асабліва вылучаецца наш цукровы камбінат, які цяпер, пасля праведзенай на ім рэканструкцыі, здольны перапрацоўваць 8000 тон буракоў за суткі; раней яго сутачная магутнасць была роўная 5—6 тысячам тон.

Такім чынам, калі падвесці нейкую рысу, варта падкрэсліць: раён працуе, яго працаўнікі ўносяць важкі ўклад у агульныя дасягненні рэспублікі, у нас добрыя задумкі і планы на будучыню. У нас усё няблага атрымлівалася да гэтага, раней; усё павінна атрымацца і ў далейшым.

Іван БАРАНОЎСКІ.

Пытальнік

У КАГО ЛЬГОТЫ ПА ЗЯМЕЛЬНЫМ ПАДАТКУ?

Паважаная рэдакцыя! Пішу вам, каб атрымаць кампетэнтнае тлумачэнне па пытанні падатку на зямлю. У адпаведнасці з Падатковым кодэксам, пенсіянеры па ўзросце ў гаражна-будаўнічых і жыллёва-будаўнічых кааператывах вызваляюцца ад выплаты зямельнага падатку. У кааператывах для вядзення агародніцтва без права забудовы, дзе на пяці сотках вырошчваецца гародніна, пенсіянеры па ўзросце плацяць зямельны падатак. Чаму такое адбываецца?

Сяргей Мікалаевіч ХІЛЬКОВІЧ,
г. Бабруйск.

Чытач напісаў адносна праблемы, якая яго хвалюе, агулам, не падмацаваўшы яе канкрэтнымі прыкладамі (напрыклад, з уласнага жыцця). Спадзяёмся, што мы правільна здагадаліся, што ж заяўнік меў на ўвазе.

— З пытаннем, якое агучыў ваш чытач, нам ужо неаднойчы даводзілася сутыкацца. Людзі як часам разважаюць? Ён — пенсіянер, і я — пенсіянер. Чаму тады адным трэба плаціць зямельны падатак, а другім не? Аднак жа далёка не ва ўсіх бывае аднолькавая сітуацыя. Калі гаварыць пра ўчасткі, выдзеленыя для вядзення агародніцтва, трэба абавязкова ведаць: прыватызаваныя яны ці не, — патлумачыла на наш запыт **начальнік аддзела ўліку арганізацый інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Бабруйскім раёне Алена ІВАНОВА**. — Бо ад выплаты зямельнага падатку вызваляюцца ўчасткі, якія знаходзяцца ў спадчынным пажыццёвым валоданні або ў прыватнай уласнасці. Такія фізічныя асобы — уладальнікі ўчасткаў — вышэйназваны падатак не плацяць. Калі ж зямля належыць юрыдычнай асобе (напрыклад, садаводчаму таварыству), яна такой ільготы не мае і павінна ўносіць зямельны падатак. Што і робіць, падзяліўшы яго паміж тымі членамі таварыства, якія не маюць зямлі ў прыватнай уласнасці. Таксама, згодна з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкул 194, глава 18, падпункт 1.25), ад выплаты зямельнага падатку вызваляюцца ўчасткі, якія былі прадастаўлены пенсі

БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ Ў БЕЛАРУСІ З 1 ЛІСТАПАДА ПАВЫШАНЫ НА 29,9 ПРАЦЭНТА ДА BR574 ТЫС. 790

У Беларусі зацверджаны новы бюджэт пражытковага мінімуму, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Пастановай Савета Міністраў № 1450 ад 28 кастрычніка гэтага года зацверджаны бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах верасня гэтага года ў разліку на адзін месяц. Перыяд дзеяння гэтых сацыяльных нарматываў — з 1 лістапада 2011 года па 31 студзеня 2012 года.

Бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва з лістапада складае Br574 тыс. 790. Новы БПМ павысіўся на 29,9 працэнта да нарматыву, які дзейнічае з 1 жніўня па 31 кастрычніка (Br442 тыс. 360).

Для працаздольнага насельніцтва БПМ устаноўлены ў памеры Br621 тыс. 830, для пенсіянераў — Br463 тыс. 570, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br451 тыс. 400, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — Br564 тыс. 540, для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — Br619 тыс. 600, для дзяцей-студэнтаў — Br541 тыс. 730.

Паколькі новы БПМ павысіўся на 29,9 працэнта, адпаведна з лістапада на 29,9 працэнта ўзрастуць памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Будуць павялічаны памеры сацыяльных пенсій, а таксама надбаўкі і павышэнні, устаноўленыя да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў.

Структура бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня 2011 года па артыкулах расходаў наступная: прадукты харчавання — 58,4 працэнта, плата за карыстанне жылым памяшканнем і камунальныя паслугі — 9 працэнтаў, прадметы гардэробу — 17,1 працэнта, тавары бытавога і гаспадарчага прызначэння — 4,5 працэнта, прадметы першай неабходнасці, санітарыі і лякарствы — 2,3 працэнта, бытавыя і транспартныя паслугі — 4,6 працэнта, узносы і плацяжы — 4,1 працэнта.

Бюджэт пражытковага мінімуму штоквартальна зацвярджаецца ўрадам у цэнах апошняга месяца кожнага квартала. У адпаведнасці з законам «Аб пражытковым мінімуме ў Рэспубліцы Беларусь», БПМ прызначаны для аналізу і прагназавання ўзроўню жыцця насельніцтва, аказання дзяржаўнай сацыяльнай дапамогі малазабяспечаным грамадзянам (сем'ям), абгрунтавання мінімальных дзяржаўных сацыяльна-працоўных гарантый. БПМ — гэта вартасная велічыня мінімальнага набору матэрыяльных даброт і паслуг, неабходных для забеспячэння жыццядзейнасці чалавека і захавання яго здароўя, а таксама абавязковыя плацяжы і ўзносы.

Бюджэт пражытковага мінімуму для працаздольнага насельніцтва прымяняецца для вызначэння сумы ўтрымання сродкаў з наймальнікаў, якія маюць запазычанасць па выплаце заработнай платы, і базавага гранічнага нарматыву тарыфнай стаўкі першага разраду для камерцыйных арганізацый дзяржаўнай формы ўласнасці і з доляй уласнасці дзяржавы ў іх маёмасці.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПАМЕРЫ ДЗІЦЯЧЫХ ДАПАМОГ У БЕЛАРУСІ ЎЗРАСТУЦЬ З ЛІСТАПАДА НА 29,9 ПРАЦЭНТА

У Беларусі з лістапада гэтага года на 29,9 працэнта ўзрастуць памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Паводле слоў спецыялістаў, пастановай урада зацверджаны бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ) у памеры Br574 тыс. 790 — на 29,9 працэнта больш за нарматыў, які дзейнічае з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года (Br442 тыс. 360).

Такім чынам, з 1 лістапада 2011 года па 31 студзеня 2012 года штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў складае Br574 тыс. 790, старэйшага за тры гады — Br172 тыс. 440. Аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці дасягне Br5 млн 747 тыс. 900, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей беларускія сем'і будуць атрымліваць Br8 млн 47 тыс. 60. Аднаразовая дапамога жанчыне, якая стала на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, з лістапада гэтага года складае Br574 тыс. 790.

Нагадаем, у Беларусі дзіцячыя дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці з 1 кастрычніка ўзраслі ўдвая. Гэта прадугледжана ўказам № 416 ад 15 верасня гэтага года. На дзяцей, народжаных з 1 кастрычніка, дапамога выплачваецца ў наступных памерах: пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 БПМ, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ. Акрамя таго, пры нараджэнні двайнят дадаткова належыць аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці на кожнае дзіця ў памеры двухкратнай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (выплата гэтай дапамогі праводзіцца ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства).

У Беларусі сістэмай дзяржаўных дапамог на 1 ліпеня гэтага года былі ахоплены амаль 426,1 тыс. дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў (24,4 працэнта дзіцячага насельніцтва краіны).

ЗА МОВУ ЗАМОВЯЦЬ СЛОВА

Беларускі славянскі камітэт выпрацуе рэкамендацыі для ўлад адносна пашырэння беларускай мовы ва ўжытку

Старшыня Беларускага славянскага камітэта Сяргей КАСЦЯН з жалем канстатуе, што хоць па законе дзве дзяржаўныя мовы Беларусі знаходзяцца ў роўным становішчы, «але на самой справе — не». Паводле яго ўражання ад удзелу ў нядаўнім з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі, там такое меркаванне падзяляюць. «Бо ўсе празаікі, паэты, крытыкі, журналісты, якія там прысутнічалі, казалі аб адным. Беларуская мова юрыдычна з'яўляецца дзяржаўнай, але на самой справе ёй мала хто карыстаецца».

Кіраўнік Беларускага славянскага камітэта акцэнтуе, што ў наяўнай сітуацыі ўлада не вінавата. Наадварот, «улада стварыла ўсе ўмовы, каб беларуская мова не толькі існавала, але развівалася і была асноўнай мовай нашых грамадзян». У чым тады справа? «Так склалася гістарычна, што мы, беларусы, паціху перасталі ўжываць беларускую мову», — мяркуе С. Касцян. На яго думку, не апошняя «заслуга» ў тым Мікіты Хрушчова, пры якім «насаджаліся рускія школы ў Беларусі».

— І сёння задача Беларускага славянскага камітэта (а гэта нацыянальная беларуская арганізацыя), Саюза пісьменнікаў, мовазнаўцаў Беларусі — аб'яднаць намаганні. Упэўніць нашых грамадзян, і ў першую чаргу бацькоў, каб яны самі вучыліся размаўляць на беларускай мове; і галоўнае, каб яны не перашкаджалі дзецям ісці ў беларускія школы, беларускія класы. І каб на наступны год большасць бацькоў, дзеці якіх пойдуць у першы клас, напісала заявы аб тым, каб навучанне там вялося на беларускай мове.

Сяргей Касцян сам навучаўся ў школе па-беларуску сем гадоў і цвёрда ўпэўнены, што менавіта праз школу, а таксама сям'ю, шлях да беларускай мовы найкарацейшы. «І ніякага прымусу», — удакладняе ён.

Не забываецца і на ролю СМІ ў пашырэнні беларускай мовы ва ўжытку. І ў гэтым плане ёсць еднасць у Беларускага славянскага камітэта з Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

● Неабходна, каб беларускамоўная газета «Звязда» — адна з найстарэйшых у краіне — стала агульнай нацыянальнай беларускай газетай. Не па юрысдыкцыі, а па неабходнасці. Патрэбна масавая падпіска. Мы зробім усё, каб ужо на наступны год беларуская газета «Звязда» стала настольнай газетай усіх грамадзян — беларусаў нашай краіны, — абяцае С. Касцян.

Ён таксама ўпэўнены, што і па радыё, і на тэлебачанні (на ўсіх беларускіх каналах, удакладняе старшыня БСК) павінны выходзіць праграмы на беларускай мове і пра беларускую мову.

Са свайго боку, Беларускі славянскі камітэт возьмецца гэтую праблему абмеркаваць. Чарговы пленум арганізацыі, які адбудзецца ўжо ў снежні, плануюць прысвяціць менавіта ролі беларускай мовы і яе ўплыву на самасвядомасць нацыі. «Прымем пастанову, накіруем яе ва ўсе органы ўлады, — інфармуе С. Касцян. — Там будзе канкрэтна ўказана, што мы маем на ўвазе, што збіраемся рабіць і што павінна зрабіць улада. Мяркуем правесці сумесны пленум з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, дзе таксама абмеркаваць новыя захады і прапановы наконт развіцця беларускай мовы».

● Усё залежыць ад нас, і ніякія загады Прэзідэнта не дапамогуць, калі беларусы не ўсвядомяць, наколькі патрэбна беларуская мова. Касмічны ўплыў на грамадзян тады дзейнічае адпаведна, калі яны размаўляюць на роднай мове, — упэўнены лідар Беларускага славянскага камітэта.

Аднак папулярызацыя беларускай мовы, на яго думку, не павінна азначаць заганнага стаўлення да рускай: «Гэта таксама наша мова». Апроч таго, «мы ствараем Саюзную дзяржаву, Адзіную эканамічную прастору». Таму і ад рускай адмаўляцца нельга.

— Адраджаючы беларускую мову, робячы ўсё, каб большасць нашага насельніцтва валодала беларускай мовай і размаўляла на ёй, мы павінны добра і дасканала вывучаць рускую, бо без Пушкіна, без Някрасава, без Горкага наша мова не будзе багатай. Яна будзе акрэслена нейкімі рамкамі і не будзе інтэнсіўна развівацца.

Абвяшчэнне Года беларускай мовы, паводле пераканання С. Касцяна, недастаткова: «Кожны год павінен быць годам беларускай мовы». Ён бачыць рацыю ў тым, каб у супрацоўніцтве з міністэрствамі адукацыі, культуры, інфармацыі ствараць агульныя праграмы па пашырэнні ўжывання беларускай мовы ў штодзённым жыцці. А вось ініцыятывы, падобныя да той, якую праявіў кіраўнік Міністэрства культуры Павел Латушка (самому выступаць выключна па-беларуску і справаводства перавесці на беларускую), вітае: «Добра было б, каб і парламент перайшоў на беларускую мову».

— Прыклад павінны паказваць кіраўнікі ўсіх ведамстваў, абавязкова, — рэзюмуе Сяргей Касцян. — Але гэта не значыць, што ўсё трэба рабіць па загадзе — гэта павінна адбывацца свядома. Кожны павінен дайсці не толькі сваёй галавой — але і сэрцам адчуць неабходнасць беларускай мовы. Як можна, калі марозны вечар, не ўзгадаць Багдановіча?

Беларускую мову, на думку старшыні БСК, насамрэч, шмат хто ведае. «Трэба не саромецца, а як мага часцей ужываць беларускую мову ў паўсядзённай працы».

Зоя ВАРАНЦОВА.

Информационное сообщение об отказе от проведения аукциона

Государственный комитет по имуществу сообщает об отказе от проведения объявленного на 17 ноября 2011 г. аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь 53268 акций (91,7 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Новогрудское строительно-монтажное управление».

Извещение о проведении указанного аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 12 октября 2011 г.

11 ноября 2011 г. в 16.00 состоится внеочередное общее
СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «САНТЕХЭЛЕКТРОМОНТАЖ»

Повестка дня:
1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций ОАО «Сантехэлектромонтаж».
2. О внесении изменений и дополнений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.

Собрание будет проходить по адресу: **г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А. Начало регистрации участников собрания — 15.30.**

УНП 400052115

В публикации
Минским районным исполнительным комитетом
Повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность (газета «Звязда» № 207 от 29.10.2011 г.)
СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ:
дата проведения аукциона 17.11.2011 г.;
окончание приема заявлений и документов 11.11.2011 г.

УНП 600068187

СЯМ'Я ПАД АХОВАЙ ДЗЯРЖАВЫ

СЁННЯ ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца шэраг праектаў законаў, якія тычацца пытанняў умацавання сям'і, мацярынства і дзяцінства. Адзін з іх — праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і». Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці і грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» вырашылі правесці «круглы стол» на тэму «Сям'я як сацыяльны інстытут: прававыя асновы і практыка. Шматдзетная сям'я». Разам з дэпутатамі ў «круглым стале» прынялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, юстыцыі, адукацыі і ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў.

— Мяняюцца формы і функцыі сям'і. Таму перыядычна трэба ўносіць змяненні і ў заканадаўства, — заўважае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Антаніна МОРАВА**.— Напрыклад, зараз узнікла такая форма, як шлюбны дагавор. Пэўныя супярэчнасці прыводзілі да таго, што асобы, паміж якімі быў заключаны такі дагавор, справы разбіралі ў судзе. Цяпер палажэнні шлюбнага дагавора будуць дакладна прапісаны. У краіне паніжаецца каэфіцыент шлюбнасці. Таму спрашчаецца парадак рэгістрацыі шлюбу. У канвенцыі па правах дзіцяці запісана, што кожнае дзіця па меры магчымасці павінна ведаць сваіх бацькоў. Доўгі час у нас, калі дзяцей бралі з інтэрнатаў, ім не раскрывалася, хто іх сапраўдныя бацькі. Сёння гэта перастае быць тайнай. Калі дзіця папросіць, яму могуць у адпаведных установах даць усю інфармацыю.

У Беларусі створана адна з самых шырокіх заканадаўчых баз у краінах СНД, якія тычацца сямейнай палітыкі. Шмат робіцца для таго, каб «заахвоціць» жанчын нараджаць. Так, калі раней прагрэсіўныя выплаты рабіліся пры нараджэнні трэцяга дзіцяці, сёння яны ўжо выплачваюцца і пры нараджэнні другога.

Беларусь — адна з нешматлікіх краін, дзе выхаванне дзяцей з'яўляецца грамадска-карыснай справай. Тры гады, на працягу якіх маці знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, уваходзяць у працоўны стаж. Дарэчы, гэтага няма і ў нашых бліжэйшых суседзяў і ўжо некалькі гадоў у Расіі абмяркоўваецца пытанне аб вяртанні такой пазіцыі.

Па індэксе мацярынства (а ён уключае некалькі паказчыкаў — гэта стан здароўя маці і дзяцей, дзіцячая і мацярынская смяротнасць, узровень жыцця) Беларусь займае 33 месца са 173 краін у свеце.

Але вернемся да праекта Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і». Нагадаю, што існуючы Кодэкс аб шлюбе і сям'і быў прыняты ў 1999 годзе.

ТРЫ ДНІ — І ВЫ ЖАНАТЫЯ

Законапраектам прапануецца скараціць мінімальна дапушчальны тэрмін рэгістрацыі шлюбу. Так, з моманту звароту будучым сужэнцам рэгістрацыі трэба будзе чакаць усяго тры дні. У існуючай рэдакцыі можна было шлюб зарэгістраваць не раней, чым праз 15 дзён з моманту звароту. Дарэчы, асабліва нецярплівыя жаніх і нявеста могуць распісацца яшчэ хутчэй, калі органы ЗАГСа прымуць такое рашэнне. Так, нават і трох дзён да шлюбу можна не чакаць, калі нявеста цяжарная альбо калі ў яе і жаніха ёсць агульнае дзіця.

На сёння заключэнне шлюбу праводзіцца рэгістроўчымі органамі па месцы жыхарства жаніха ці нявесты альбо іх бацькоў. Прапануецца дазволіць маладым заключаць шлюб у любым органе на тэрыторыі Беларусі, які рэгіструе акты грамадзянскага стану. Плануецца пайсці насустрач і тым маладым, якія захочуць, каб шлюбная цырымонія праходзіла за межамі ЗАГСаў, напрыклад, побач з помнікамі архітэктуры ці на прыродзе.

Праект прадугледжвае рашэнне праблем па рэгістрацыі шлюбаў паміж замежнымі жыхарамі, хаця б адзін з якіх мае дазвол на пастаяннае жыхарства ў РБ. Сёння такія шлюбы заключаюцца толькі ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах. Законапраект дазваляе рэгістрацыю такіх шлюбаў у органах ЗАГСа.

Апошнім часам усё больш маладых імкнуцца заключыць шлюбны дагавор. Так, калі ў 2009 годзе ў Беларусі такіх дагавораў было заключана 2418, у 2010 — ужо 2811. Праект прадугледжвае канкрэтныя ўмовы, якія могуць змяшчацца ў шлюбным дагаворы. Будуць урэгуляваны ўзаемадносіны паміж сужэнцамі, паміж бацькамі і дзецьмі. Так, прадугледжваецца, што прадметам дагавора можа з'яўляцца толькі агульная сумесная маёмасць сужэнцаў. Калі шлюбны дагавор заключаны ў дачыненні нерухомай маёмасці, то, акрамя натарыяльнага пасведчання, патрабуецца дзяржаўная рэгістрацыя шлюбнага дагавора ў організацыі дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Удакладняецца парадак вызначэння доляў сужэнцаў пры раздзеле маёмасці. Уводзіцца норма, што рэчы індывідуальнага карыстання няпоўнагадовых: адзенне, абутак, школьныя рэчы, музычныя інструменты і іншыя — пры скасаванні шлюбу не ўлічваюцца пры падзеле маёмасці і перадаюцца таму з бацькоў, з кім будзе пражываць дзіця.

Законапраект дапаўняе існуючы Кодэкс нормамі аб уліку дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў. Так, павінны будуць улічвацца пажаданні маленькага чалавека пры выбары апекуна, папячыцеля ці патранатнага выхавальніка, пры вызначэнні парадку зносін з бацькамі, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Пажаданні дзіцяці будуць выяўляцца органам сацыяльнай апекі і папячыцельства па месцы жыхарства дзіцяці.

Уводзяцца і новыя нормы, якія тычацца «неадбыўшыхся» тат. Так, калі сёння разлік запазычанасці вядзецца, зыходзячы з сярэдняй зарплаты ў мясцовасці, дзе пражывае даўжнік, то надалей плануецца, што памер запазычанасці не будзе залежаць ад месца жыхарства.

Зменены некаторыя падыходы да інстытута ўсынаўлення. Прапануецца ўстанавіць максімальную розніцу ва ўзросце паміж усынавіцелем і дзіцем, якое ўсынаўляецца, у 45 гадоў. Практыка паказвае, што ў асноўным людзі хочуць узяць на ўсынаўленне дзіця ва ўзросце да 5 гадоў. Увядзенне максімальнага ўзросту дае магчымасць старэйшым дзецям, падлеткам набыць сям'ю, калі іх усынавяць асобы больш сталага ўзросту.

ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ ПАДРАСТУЦЬ

Як паведаміла **начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера ЛАБКОВІЧ**, пры распрацоўцы нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011-15 гады быў прапанаваны новы механізм пры разліку дапамог па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. З наступнага года ўпершыню ў Беларусі будзе ўведзены новы механізм налічэння дапамогі. Яна будзе вылічвацца не ад бюджэту пражытковага мінімуму, а ад сярэдняй зарплаты па краіне (не па месцы працы мамы, а менавіта зарплаты па краіне). Прычым гэтая дапамога будзе дыферэнцаванай: пры нараджэнні першага дзіцяці яна будзе складаць 35 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты, пры нараджэнні другога і наступных — 40 працэнтаў. Дапамогі на дзяцей старэй 3 гадоў не пераглядаліся і павінны ў бліжэйшы час перайсці ў дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу.

З 1 студзеня 2012 года плануецца павялічыць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда. На працягу дзесяці гадоў гэтая дапамога не пераглядалася і сёння яна складае 65 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. Таксама плануецца павялічыць з 45 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму да 100 працэнтаў дапамогу на дзіця, інфіцыяванае вірусам імунадэфіцыту.

З 2012 года плануецца аказанне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ўсім сем'ям, якія выхоўваюць 3 і больш дзяцей школьнага ўзросту. Зараз такая мера прынятая толькі ў Мінску, а з наступнага верасня будзе ўведзена ва ўсіх рэгіёнах. Прапануецца павелічэнне памераў фінансавай дапамогі шматдзетным сем'ям у пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах, атрыманых на будаўніцтва жылля. Пры нараджэнні трэцяга дзіцяці фінансавая дапамога на гэтыя мэты вырасце на 25 працэнтаў (і складзе 75 працэнтаў ад сумы запазычанасці па крэдыце), а пры наяўнасці 4 дзяцей крэдыт будзе пагашацца стопрацэнтна.

Каб зрабіць вяртанне бацькоў, якія знаходзіліся ў водпуску па доглядзе дзяцей больш камфортным, прадугледжана бясплатнае правядзенне курсаў па перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі.

У нацыянальнай праграме дэмаграфічнай бяспекі прадугледжаны і такія меры, як сістэма льготнага крэдытавання для правядзення экстракарпаральнага апладнення пар, якія пакутуюць на бясплоддзе. Сёння ў краіне звыш 15 працэнтаў сем'яў, якія па тых ці іншых прычынах не могуць мець дзяцей. Прычым палова з іх маюць праблемы «па віне» моцнай паловы, што гаворыць аб тым, што ў краіне не развіта сістэма прафілактыкі і лячэння мужчынскага бясплоддзя.

КОЛЬКАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ СКАРАЧАЕЦЦА

У час «круглага стала» Верай Лабковіч была ўзнята і такая праблема, як павелічэнне колькасці маладзетных сем'яў: «Па апошніх выніках абследавання домагаспадарак — 65,8 працэнта сем'яў — сем'і з адным дзіцем. Летась іх было 62. Вучоныя кажуць, што меры эканамічнага стымулявання нараджальнасці дазволяць павялічыць яе на бліжэйшыя 3-4 гады, а далей усё вернецца на свае месцы. Прыводзяць яны і зусім жахлівыя лічбы, што праз 15 гадоў колькасць насельніцтва Беларусі можа істотна скараціцца».

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА звярнула ўвагу на тое, што ў краіне мала ўвагі надаецца здароўю жанчын. Так, цяжарныя жанчыны абавязаны праходзіць усіх спецыялістаў. Але як толькі жанчына нарадзіла, ніхто не клапоціцца пра яе здароўе. А калі гэта шматдзетная мама, наўрад ці яна знойдзе час — хоць бы з лячэннем малых разабрацца. Жанчына не пойдзе, каб прайсці пэўныя даследаванні, выседжваць пад кожным медыцынскім кабінетам доўгія чэргі. Было б добра, каб хаця б два разы на год усіх шматдзетных мам запрашалі ў паліклінікі па месцы жыхарства. Таццяна Аляксандраўна прывяла прыклад, што шматдзетнай маці з анказахворваннем, каб прайсці даследаванне, трэба было тры месяцы чакаць сваёй чаргі. Усё ж пажадана, каб шматдзетным мамам давалі «зялёнае святло», калі справа тычыцца дыягностыкі і лячэння, бо яны адказваюць за 3-5, а то і больш дзяцей. Таксама трэба нейкім чынам вырашаць праблему з пратэзаваннем. Жанчына, якая нарадзіла і выкарміла 5 і болей дзяцей, у першую чаргу губляе зубы, а ці зможа яна сабе дазволіць паставіць іх?

Сярод пытанняў, якія ўздымаліся на «круглым стале», і такія, што часам маці-адзіночкі маюць больш правоў, чым шматдзетныя. Складваецца ўражанне, што сёння выгадна быць адзінокай мамай. Многія маладыя людзі сёння гэтым карыстаюцца: жывуць нармальнымі сем'ямі, а шлюб не рэгіструюць, каб атрымліваць пэўныя льготы.

Удзельнікі «круглага стала» ўпэўнены, што трэба падымаць статус сям'і. Прычым акцэнт рабіць на асвету і выхаванне.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для его обслуживания, которые составляют единые предметы аукционов

Организатор аукционов:
Фонд «Минскоблгосимущество»,
г. Минск, ул. Чкалова, 5,
тел.: (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13
Место проведения аукционов:
г. Минск, ул. Чкалова, 5

Дата и время проведения аукциона: 1 декабря 2011 г. в 11.00

Капитальное строение (инв. № 615/С-16113) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – одноэтажное **здание столовой** общей площадью 26,0 кв.м, 1970 года постройки, фундамент бутобетонный, цоколь кирпичный, стены бревенчатые, обшиты досками, окрашены, чердачные перекрытия – деревянные балки, дощатые обшиты ДВП, крыша шиферная двускатная по деревянным стропилам, обрешетка – деревянные доски. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0046 га по адресу: Минская обл., г. Червень, ул. Ленинская, д. 49, назначение: земельный участок для обслуживания здания столовой. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование земельного участка для целей, определенных Червенским районным исполнительным комитетом. В отношении капитального строения имеется обременение в виде договора аренды сроком до 22 января 2013 г.

Начальная цена предмета аукциона: 5 729 671 рубль (в т.ч. объект – 5 452 441 рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 277 230 рублей). **Размер задатка: 500 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 833 444 рубля (с НДС 20 %).

Продавец: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности (г. Минск, ул. К. Маркса, 16, тел. (8017) 2274483), имущество находится в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Червенский леспромхоз» (Минская обл., г. Червень, ул. Советская, 47, тел.: (801714) 55579, 55240, 55450). **Арендодатель земельного участка:** Червенский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Червень, пл. Свободы, 1, тел. (801714) 55186).

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **29 ноября 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 29 ноября 2011 г.** включительно.

Дата и время проведения аукциона: 1 декабря 2011 г. в 12.00

лот № 1

Капитальное строение (инв. № 601/С-8095) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – двухэтажное **здание учебного класса № 4/111** общей площадью 1711,3 кв.м, 1973 года постройки, фундамент – фундаментные блоки, стены блочные, перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1158 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания учебного класса № 4/111. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

Начальная цена предмета аукциона: 513 391 936 рублей (в т.ч. объект – 490 195 786 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 23 196 150 рублей). **Размер задатка: 51 000 000** рублей.

лот № 2

Капитальное строение (инв. № 601/С-8061) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – двухэтажное **здание казармы под учебный класс № 4/2** общей площадью 1635,7 кв.м, 1937 года постройки, фундамент – бутобетон, стены и перегородки кирпичные, перекрытия (чердачные и междуэтажные) деревянные оштукатуренные, крыша шиферная, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1106 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы под учебный класс № 4/2. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

Начальная цена предмета аукциона: 437 478 129 рублей (в т.ч. объект – 415 323 602 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 22 154 527 рублей). **Размер задатка: 43 000 000** рублей.

лот № 3

Капитальное строение (инв. № 601/С-8056) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – трехэтажное **здание казармы № 4/125** с двумя террасами и подвалом общей площадью 2490,7 кв.м, 1983 года постройки, фундамент бетонный, стены и перегородки панельные, стены облицованы плиткой, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,4220 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/125. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

Начальная цена предмета аукциона: 1 308 216 962 рубля (в т.ч. объект – 1 223 685 225 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 84 531 737 рублей). **Размер задатка: 100 000 000** рублей.

лот № 4

Капитальное строение (инв. № 601/С-8036) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – трехэтажное **здание казармы № 4/127** с двумя террасами и подвалом общей площадью 2449,9 кв.м, 1984 года постройки, фундамент бетонный, стены блочные, облицованы плиткой, перегородки панельные, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная рулонная, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,2360 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/127. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

Начальная цена предмета аукциона: 1 452 642 138 рублей (в т.ч. объект – 1 405 368 465 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 47 273 673 рубля). **Размер задатка: 100 000 000** рублей.

лот № 5

Капитальное строение (инв. № 601/С-8073) и право заключения договора аренды земельного участка. Капитальное строение – трехэтажное **здание казармы № 4/139** с подвалом общей площадью 3813,4 кв.м, 1987 года постройки, фундамент – фундаментные стаканы, блоки, стены – железобетонные панели, железобетонный каркас, облицованы плиткой, перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, подведены инженерные коммуникации. Имеются бетонные крыльца (63 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,2515 га по адресу: Минская обл., г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/139. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

Начальная цена предмета аукциона: 2 768 152 165 рублей (в т.ч. объект – 2 717 773 653 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 50 378 512 рублей). **Размер задатка: 150 000 000** рублей.

Продавец (лоты №№ 1–5): государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская обл., г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел.: (80177) 757659, 733349). **Арендодатель земельных участков (лоты №№ 1–5):** Логойский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Логойск, ул. Советская, 15, тел. (801774) 55141).

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **29 ноября 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 29 ноября 2011 г.** включительно.

Текущий (расчетный) счет для внесения задатка для участия в аукционах: № 3642000000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Заявления на участие в аукционах с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312.**

Информация о предметах аукционов дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Для участия в аукционах в указанный в извещении срок необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении

Факт

Замест сумесяў — метал на 150 тысяч долараў

У выніку сумеснай аперацыі супрацоўнікамі Віцебскай мытні і Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама выяўлена і затрымана буйная нелегальная партыя каляровых металаў, якая перавозілася пад выглядам будаўнічых сумесяў.

У гарадскім пасёлку Бягомль затрымалі грузавы аўтамабіль «Сканія» пад кіраваннем нашага суграмадзяніна. Грузавік ехаў у бок Віцебска. Згодна з прад'яўленымі кіроўцам дакументамі, у грузавым адсеку аўтамабіля знаходзілася 21 тона будаўнічых сумесяў. Паводле слоў вадзіцеля, груз перавозіўся з Літоўскай Рэспублікі ў адрас аднаго з суб'ектаў гаспадарання ў Маскву. Падчас праверкі ўстаноўлена, што адпаведныя суправаджальныя дакументы абсалютна не адпавядаюць рэчаіснасці і выкарыстоўваюцца для маскіроўкі нелегальнай перавозкі тавару. Аказваецца, затрыманы аўтамабіль з грузам не перасякаў мяжу рэспублікі і не быў афармлены на мытні. А нумарныя пячаткі Ашмянскай мытні на дакументах, як высветлілася, даўно выведзены з абарачэння. Пры правядзенні мытнага дагляду ў грузавым адсеку замест будаўнічых сумесяў быў знойдзены лом каляровых металаў (медзь, алюміній і іншыя) — усяго 25 тон. Паводле апошняй інфармацыі, партыя лому каляровых металаў была сфарміравана ў Рэспубліцы Беларусь і пад выглядам тавару, увезенага з-за межаў Мытнага саюза, незаконна вывозілася ў Расійскую Федэрацыю. У выпадку паспяховага вывазу лому ў Расію яго кошт склаў бы каля $150 тыс. Лом канфіскаваны, вядзецца праверка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Згарэў гараж з аўтамабілем

Гэтае здарэнне адбылося ў сталіцы па вуліцы Рылеева раніцай. Пра пажар па тэлефоне паведаміў невядомы мужчына.

Калі на месца прыбылі падраздзяленні МНС, цагляны аднапавярховы гараж на тэрыторыі прыватнага домаўладання гарэў адкрытым полымем. Было ўстаноўлена, што адбылося загаранне аўтамабіля «Опель Вектра», які належаў пенсіянеру 1955 года нараджэння. У выніку аўтамабіль быў знішчаны, пашкоджана маёмасць у гаражы і дах. Пры самастойным тушэнні пажару пацярпеў гаспадар, які атрымаў тэрмічныя апёкі твару, кісцей рук, правай галёнкі першай, другой, трэцяй ступеняў (15 працэнтаў цела) і ў выніку быў шпіталізаваны. У пажары вінаваты сам грамадзянін, які парушыў правілы эксплуатацыі газавых устройстваў і агрэгатаў (выкарыстоўвалася газавая гарэлка для прыварвання ліста бляхі да глушыцеля).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прамая лінія

ТРЭБА МЯНЯЦЬ СУСТАЎ

На пытанні чытачоў адказаў загадчык кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Алег КЕЗЛЯ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 29 кастрычніка)

☎— Гомель, Міхаіл Пятровіч. Я адчуваю пастаянны боль у спіне. Ці можа гэта быць астэапарозам?

— Так, гэта можа быць астэапароз, але гэта можа быць і спалучэнне астэаартрозу з астэапарозам. Сітуацыя не безнадзейная, такая паталогія лечыцца медыкаментозна, прымяняюцца і фізіятэрапеўтычныя працэдуры. Вам трэба звярнуцца да ўрача-неўролага і ўрача-артапеда. Думаю, яны вырашаць вашу праблему.

☎— Лепель, Ганна. Мне 45 гадоў. Пастаўлены дыягназ «астэапароз». Былі пераломы пазванкоў. Прымаю кальцый. Ці патрэбны мне яшчэ якія-небудзь прэпараты?

— Гэта даволі рэдка, калі жанчына ў 45 гадоў атрымлівае пераломы пазванкоў па-за траўмай. Калі вы правялі дэнсітаметрыю, і ў вас установлены дыягназ «астэапароз», то вам трэба звярнуцца ў Цэнтр метабалічных астэапатый і астэапарозу, які працуе ў Мінску на базе 1-й гарадской клінічнай бальніцы. Звярнуцца да спецыялістаў трэба таму, што астэапароз можа быць рознага паходжання: постменапаўзальны, лекавы і інш. І лячыць яго трэба, зыходзячы з таго, якой формы гэты канкрэтны астэапароз. А вызначыць гэта могуць толькі спецыялісты.

☎— Гродна, Людміла Пятроўна. Маёй маці 75 гадоў. Ёй зрабілі аперацыю на сцягне пасля пераломы. Аперацыя прайшла паспяхова. Падкажыце, як правільна даглядаць маці ў перыяд рэабілітацыі. І яшчэ, як у будучыні можна пазбегнуць пераломаў?

— Усё залежыць ад таго, якую аперацыю зрабілі вашай маці. Калі гэта эндапратэзаванне, рэабілітацыя будзе адна, а калі аперацыя была па іншай прычыне, то і догляд патрабуецца іншы. Што тычыцца таго, як пазбегнуць пераломаў у далейшым... Паколькі вашай маці 75 гадоў, то я параіў бы звярнуцца да ўрача-герантолага, каб ён расказаў вам, якія прэпараты трэба прымаць для таго, каб прадухіліць пераломы. У гэтым узроставым перыядзе з арганізма выводзіцца кальцый, і косць становіцца крохкай, таму яе неабходна ўмацоўваць.

☎— Клецкі раён, Вера Іванаўна. Маёй маці 83 гады, яна інвалід 1-й групы. У яе вельмі баліць нага. Хірургі рэкамендуюць рабіць аперацыю па замене тазасцегнавога сустава. Ці не небяспечна гэта ў такім узросце?

— Наогул рабіць такую аперацыю небяспечна ў любым узросце. Аднак узрост усё ж не з'яўляецца супрацьпаказаннем для яе выканання. Таму звяртайцеся да спецыялістаў-артапедаў па месцы жыхарства, і, думаю, аперацыя вашай маці можа быць выканана паспяхова.

☎— Барысаў, Нэла Пятроўна. 47 гадоў. У мяне і астэапароз, і астэаартроз. Ці існуюць прэпараты, якія можна прымаць адначасова пры абедзвюх гэтых паталогіях?

— Безумоўна, такія прэпараты ёсць. Для лячэння астэаартрозу існуе цэлая група хондапратэктараў. Поўнасцю вылечыць астэаартроз немагчыма, аднак замарудзіць яго развіццё рэальна. На фоне лячэння астэаартрозу існуе астэапароз. Трэба толькі ўстанавіць, якой формы гэты астэапароз: узроставы, гарманальны, траўматычны або іншы. Вызначыць гэта і прызначыць эфектыўнае лячэнне могуць спецыялісты. Таму вам трэба звярнуцца да ўрача-рэўматолага і артапеда.

☎— Магілёў, Пётр Ільіч. У мяне астэаартроз 1-й стадыі. Спачатку балела адно калена, зараз — абодва. Урачы сказалі, што вылечыць мяне немагчыма. Ці так гэта?

— Напэўна, урачы не гэта мелі на ўвазе. Яны хацелі сказаць, што ваш працэс можна замарудзіць, а не спыніць. А такое магчыма. Існуе цэлая група прэпаратаў-хондапратэктараў, якія не спыняюць развіццё астэаартрозу, а зніжаюць яго актыўнасць і ступень развіцця. Вам трэба звярнуцца да рэўматолага або артапеда, і ўрачы падбяруць вам спецыяльную тэрапію.

☎— Мінск, Валянцін Ягоравіч, 59 гадоў. Тры гады таму зламаў нагу ў галёнкаступнёвым суставе. І дагэтуль нага ные пры змене надвор'я. Ці можна неяк з гэтым змагацца?

— У вас быў унутрысустаўны пералом, і ўправіць яго міліметр у міліметр немагчыма, усё роўна застаецца хаця б мікроннае ссоўванне. І яно правакуе праявы вострага атычнага гонартрозу. Дапамагчы пры такой паталогіі могуць прэпараты спецыяльнай групы. Вам трэба звярнуцца да ўрача-траўматолага.

☎— Капыль, Вера Іванаўна. У мяне баляць усе суставы, былі аперацыі. П'ю лекі, але ўсё роўна хаджу з кавенькай. Аднак пытанне такое: апошнім часам моцна баліць спіна, і гэта вельмі турбуе. Як мне быць?

— Гэтак жа, як хварэюць вашы суставы, хварэе і спіна. Але калі на суставах мы можам замяніць шарнір, то замяніць пазванкі ў спіне не атрымаецца. Таму я рэкамендую вам узяць у свайго раённага ўрача накіраванне ў Мінскую абласную клінічную бальніцу. Там вас паглядзяць урач-неўролаг, артапед. Спецыялісты параяць, як вам быць далей. Скажу, праўда, што мы вас канчаткова не вылечым, а толькі падлечым, зможам зняць гэты боль. Але час ад часу ён будзе абвастрацца. Гэта ўзроставыя змяненні пазванка, і вярнуць яму маладосць немагчыма. Аднак затрымаць развіццё хваробы можна, і ў нейкай ступені купіраваць болевы сіндром — таксама.

— А якімі прэпаратамі можна здымаць боль цяпер?

— Можна прымаць німесіл, найз, трамадол, хандраэцін, тэрафлекс. Магчыма, варта набыць аплікатар Кузняцова. Можаце скарыстацца і народнымі сродкамі. Рабіце кампрэсы з выкарыстаннем лопуху, макрыцы.

☎— Асіповіцкі раён, Аляксандр Мікалаевіч. У мяне ўжо доўгія гады шмат хвароб: артрыт, артроз пазваночніка. Але вельмі турбуе трафічная язва правай галёнкі, якая ніяк не загойваецца. Што мне рабіць?

— Вам трэба пад'ехаць у Магілёўскую абласную клінічную бальніцу на кансультацыю да сасудзістага хірурга. Спецыяліст паглядзіць праходнасць вен. Неабходна, каб вам зрабілі ўльтрагукавое даследаванне і санаграфію. І пасля гэтага будзе вызначана, чым вам можна дапамагчы. Бярыце накіраванне і пад'язджайце.

☎— Мінск, Міхаіл Іванавіч, 71 год. Я ўпаў і зламаў шыйку сцягна. Мне наклалі фіксуючую павязку і адправілі дадому. Якія ў мяне далейшыя перспектывы?

— Вас трэба аперыраваць. У гэтым выпадку ніякая фіксуючая павязка не вылечыць. Вазьміце накіраванне ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі або ў 6-ю гарадскую клінічную бальніцу г. Мінска, і там вырашаць пытанне з аперацыяй.

— А без аперацыі нельга?

— Ні ў якім разе.

☎— Івацэвічы, Вера Міхайлаўна. Паўгода таму я ўпала і пашкодзіла левае плячо. Лячэнне не дапамагае, рука віселіць, як бізун. Чым мне можна дапамагчы?

— Хутчэй за ўсё, у вас ёсць пашкоджанне рукатворнай манжэты пляча. Гэта хітры дыягназ, і, на жаль, дактары яго дрэнна ведаюць. Вам трэба прыехаць у Мінскую абласную бальніцу ў Бараўляны на кансультацыю. Тэлефон рэгістратуры: 8 (017) 265 20 53. Думаю, мы зможам вам дапамагчы.

☎— Любанскі раён, Валянціна Васільеўна, 63 гады, інвалід 2-й групы. У мяне астэапароз і іншыя хранічныя захворванні. Трэба прымаць шмат лекаў. Скажыце, ці ёсць на іх зніжка для інвалідаў?

— Я гэтым пытаннем не валодаю. Вам трэба падысці да тэрапеўта, і ўрач скажа, які прэпарат ільготны, а які — не.

☎— Магілёў, Алена Васільеўна, 54 гады. У мяне артроз 2-й ступені каленных і галёнкаступнёвых суставаў, на каленях з'явіліся кісты. Калолі гармоны, але нічога не дапамагае...

— Я параіў бы вам пад'ехаць у Мінск, у кансультацыйна-прафесарскі цэнтр, які знаходзіцца па вуліцы Макаёнка, 17, на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння. Тэлефон для даведак: 8 (017) 265 06 25. Мы вас паглядзім. Улічваючы тое, што вам ужо калолі гармоны ў сустаў і ў вас утварыліся кісты, то, верагодна, прэпаратамі ўжо нельга дапамагчы.

(Працяг будзе.)

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка	Здание трансформаторной подстанции и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Ивацевичский р-н, д. Нехачево	Брестская обл., г. Пинск, ул. Калиновского, 5
Продавец недвижимого имущества	РСУП «Брестплемпредприятие», тел. (0162) 23 26 07	Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь (в лице ОАО «Строительный трест № 2»), тел.: (01653) 2 30 80, 2 43 15
Сведения о предмете аукциона	Здание 1-эт., с холодной пристройкой, кирпичное, 1965 г.п., площадь – 38,8 кв. м. Земельный участок площадью 0,1091 га с ограничениями в использовании земель на площади 0,0042 га и 0,0398 га в охранных зонах линий электропередачи использовать для строительства производственных объектов, объектов общественного питания и торговли, объектов по оказанию услуг; срок аренды – 50 лет	Здание 1-эт., 1989 г.п., кирпичн., площадь – 53,8 кв. м. Земельный участок площадью 0,0070 га; срок аренды – 20 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	2 966 059	54 037 931
Сумма задатка, руб.	296 000	5 403 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by*	

Аукцион состоится **2 декабря 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются*:*

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 1 декабря 2011 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

7. Уполномоченным лицом консолидированных участников (его представителем) – доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

8. Представителем заявителя, уполномоченного лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель), уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 1 декабря 2011 года включительно.

Спорт-тайм

Сталічнае «Дынама» ўзнялося на трэцяе месца

Пасля таго, як чэмпіёнам краіны датэрмінова ў мінулым туры стаў барысаўскі БАТЭ, барацьба ў беларускім чэмпіянаце вядзецца за астатнія месцы на п'едэстале. Сталічнае «Дынама» апярэдзіла «Гомель», які ішоў трэцім.

Такім чынам, на выездзе дынамаўцам удалося перайграць «Нафтан» — 3:1, а вось «Гомель» нечакана ўнічыю (1:1) згуляў з «Дняпром», які ўвесь сезон зорак з неба не хапаў і можа правесці наступны сезон у першай лізе. «Шахцёр» перайграў «Тарпеда-БелАЗ» (3:1), і яго другой пазіцыі пакуль ніхто не пагражае. БАТЭ, які выйграў і гэты чэмпіянат, у перанесеным на пятніцу матчы ўнічыю (2:2) згуляў з «Віцебскам». Вынікі астатніх матчаў: «Мінск» — «Нёман» — 0:0, «Белшына» — «Дынама» (Брэст) — 1:0. Становішча камандаў: БАТЭ — 62 ачкі, «Шахцёр» — 52, «Дынама» (Мн) — 49, «Гомель» — 48, «Белшына» — 42, «Нафтан» — 37, «Тарпеда-БелАЗ» — 34, «Дынама» (Бр) — 33, «Нёман» — 33, «Віцебск» — 32, «Мінск» — 31, «Днепр» — 23.

Азаранка ў фінале саступіла

ЗА МАТЧ З КВІТАВАЙ ТЭНІСІСТКА ЗАРАБІЛА 775 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

На чэмпіянаце свету WTA ў Стамбуле, які падсумоўваў сезон наймацнейшых тэнісістак свету, Вікторыя Азаранка выйшла ў фінал. У групе яна датэрмінова заняла першае месца, адолеўшы Саманту Стосур і На Лі. У матчы супраць Марыён Барталі, які ўжо нічога не вырашаў, Віка выглядала не лепшым чынам і саступіла. Затое ў паўфінале адолела Веру Званарову — 6:2, 6:3.

Фота БЕЛТА.

У фінале Вікторыю чакала 21-гадовая Петра Квітава. Яна прайшла гэты турнір яшчэ больш упэўнена, чым Віка — ніводнага паражэння. У выніку выйгрыш даўся чэшцы няпроста — 7:5, 4:6, 6:3. Пасля матча Віка проста сказала, што пакінула на корце ўсе свае сілы і лепш згуляць не змагла б. Такім чынам, пераможца сёлетняга Уімблдона Квітава заваявала і яшчэ адзін трафей, а разам з ім узнялася на другі радок WTA-рэйтынгу. Вікторыі, якая стала першай беларускай тэнісісткай, якая прабілася ў фінал чэмпіянату свету, таксама ёсць чым суцешыцца. Фінальны матч з Квітавай прынёс ёй 775 тысяч долараў (у выніку перамогі магло б быць 1 мільён 635 тысяч долараў). А Квітава, якая не прайграла ніводнай сустрэчы, за фінал атрымала 1 мільён 750 тысяч.

Еўропа зноў саступіла Азіі

У выхадныя Мінск упершыню прымаў адзін з самых прадстаўнічых турніраў па настольным тэнісе «Еўропа — Азія» з прызавым фондам 85 тысяч долараў. Зборная Еўропы, куды ўваходзіў і беларус Уладзімір Самсонаў, саступіла — 3:7. Спаборніцтвы праходзілі ў сталічным Палацы спорту.

Турнір «Еўропа — Азія» праходзіць двойчы на год, адна сустрэча адбываецца на азіяцкім кантыненце, другая — у Еўропе. Цяпер гісторыя супрацьстаяння мае такі лік: 5:1 на карысць азіятаў. За перамогу на гэты раз зборная Азіі атрымала 57 тысяч долараў, 28 тысяч дасталася камандзе Еўропы.

«Дынама» прайграла «Тарпеда»

Другое паражэнне запар пацярпела мінскае «Дынама» ў чэмпіянаце КХЛ. Пасля няўдачы ў выязным паядынку супраць «Атланта» (2:3 па булітах) каманда Марэка Сікоры 30 кастрычніка ў Ніжнім Ноўгарадзе саступіла «Тарпеда» — 1:3. Пасля 20 матчаў «Дынама» мае 35 ачкоў і займае першае месца ў дывізіёне Тарасава, другое — у Заходняй канферэнцыі і пятае — у агульнай табліцы. Наступныя тры матчы «Дынама» правядзе дома: 2 лістапада — са «Спартаком», 4-га — з «Поўначсталлю», 6-га — з «Віцязем».

«МІЛАН» У МІНСКУ

Адзін з самых тытулаваных і багатых клубаў свету згуляе сёння ў Мінску супраць БАТЭ



Фота Пятра ФАМІНА.

Сёння ў 20 гадзін на стадыёне «Дынама» пачнецца яшчэ адзін гістарычны матч гэтай восені: БАТЭ — «Мілан». Італьянскаму клубу не патрабуецца дадатковае прадстаўленне, гэта адзін з самых тытулаваных клубаў не толькі Італіі, але і Еўропы. Часопіс Forbs уключыў яго ў дзясятку самых багатых клубаў свету: бюджэт «Мілана» на 2011 год складае 838 мільёнаў.

Італьянская каманда прыляцела да нас учора ўвечары (каля 19 гадзін самалёт прызямліўся ў нацыянальным аэрапорце). Трэніроўку сяміразовы ўладальнік Кубка чэмпіёнаў на «Дынама» вырашыў не праводзіць, абмежаваўшыся ранішнімі заняткамі перад вылетам на хатняй базе «Міланэла». Пасялілася каманда ў пяцізоркавым атэлі «Еўропа» (у адрозненне ад «Барселоны», якая аддала перавагу гасцініцы «Краўн Плаза»), але затрымлівацца ў Мінску не плануе — адразу пасля матча каманда пакіне нашу сталіцу.

Як вядома, у першым матчы з «Міланам», які праходзіў два тыдні таму ў Італіі, БАТЭ саступіў 0:2. З той пары справы ў чэмпіянаце Італіі ў «чырвона-чорных» наладзіліся. «Мілан» выйграў тры апошнія матчы, у прыватнасці ў 10-м туры ў гасцях адолеў «Рому» з лікам 3:2. Гэтая перамога дазволіла падапечным Масіміліяна Алегры забрацца на чацвёрты радок у серыі А. БАТЭ за гэты час таксама падняў сабе настрой, паколькі ў мінулыя выхадныя каманда датэрмінова заваявала чарговы трафей на ўнутранай арэне: БАТЭ стаў васьміразовым чэмпіёнам Беларусі. Ці сталі мацнейшымі на самой справе за гэты час «Мілан» і БАТЭ і як беларускі чэмпіён рыхтуецца супрацьстаяць грозналу італьянскаму суперніку сёння ўвечары, расказвае галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка і паўабаронца каманды Дзмітрый Бага.

— Віктар Міхайлавіч, наколькі цяперашні «Мілан» больш небяспечны, чым «Мілан» двухтыднёвай даўнасці?

В.Г. — Можна казаць толькі пра тое, што калі «Мілан» выйграў тры матчы серыі А, то і тут ён будзе гуляць на перамогу. Тым больш цікавай атрымаецца гульня. Але трэба ўлічваць, што да гэтых трох тураў у іх было незайздросная становішча ў табліцы серыі А, і яны яго імкнуліся паправіць, а тут яны і так у групе маюць сем ачкоў.

— Наколькі БАТЭ цяперашні мацнейшы за БАТЭ двухтыднёвай даўнасці?

В.Г. — З «Барселонай» быў дрэнны матч, з «Міланам» на выездзе — лепш, хочацца верыць, што хатні з «Міланам» будзе яшчэ лепш.

— «Мілан» не будзе праводзіць трэніроўку на «Дынама». На ваш погляд, наколькі важна апрабаванне газона?

В.Г. — Не бачу вялікай праблемы. Усе гульнявыя трэніроўкі мы таксама правядзім на нашай базе. «Мілан» — каманда таго ўзроўню, які дазваляе хутка асвоіцца на любым газоне.

— Хто, на ваш погляд, самыя небяспечныя гульцы «Мілана»?

В.Г. — Можна адразу ўзгадаць футбалістаў, якія вызначыліся хет-трыкамі — Батэнг і Начэрына. Але для мяне самы небяспечны гулец у апошніх матчах — Абатэ, чые флангавыя падключэнні пастаянна паражалі супернікам. Вось гэтая тройка, калі вывесці за дужкі Ібрагімавіча.

— Кежман гатовы выйсці на поле на ўвесь матч?

В.Г. — Мяркую, што не. Быў бы гатовы, калі б не выпаў на нейкі час з трэніровачнага працэсу. Хвілін 60-70 ён гатовы сыграць.

— Яшчэ да лёсавання Рэнан Брэсан казаў, што хацеў бы гуляць у групе з «Міланам» і «Барселонай». Як мяркуеце, зараз ён не шкадуе?

В.Г. — Абсалютна ніхто пра гэта не шкадуе. Больш за тое, калі б занава было лёсаванне, то я б абедзвюма рукамі быў за тое, каб гуляць з «Міланам» і «Барселонай». Зараз калі мы паглыбіліся ў аналіз гэтых каманд, знайшлі шмат цікавага і карыснага, што можна пераняць ад «Мілана» і «Барселоны».

— Наколькі перашкаджалі вам рыхтавацца да матча фактары, якія адцягваюць увагу — напрыклад, заява расійскага каментатара Уткіна?

В.Г. — Абсалютна не перашкаджалі, і мы на гэта не звяртаем увагі. Калі б мы рэагавалі на ўсё, не было б часу рыхтавацца. Ёсць выказванні асобна ўзятага чалавека. Чаму яны павінны адцягваць нашу ўвагу?

— Дзмітрый, што для вас больш важна — трапіць у групу з больш слабымі супернікамі ці згуляць з еўрапейскімі грандамі?

Д.Б. — У Лізе чэмпіёнаў няма слабых супернікаў. Наша група — проста фантастычная. Гэта вельмі здорава сыграць з такімі супернікамі. Зразумела, што ў кожным матчы хочацца перамагаць, але мы рэальна глядзім на рэчы. Трэба рабіць правільныя высновы з паражэнняў ад «Барселоны» і «Мілана» і рухацца наперад. Мяркую, гэта шчасце, што такія каманды прыязджаюць у Беларусь. І я рады, што прымаю ўдзел у гэтых матчах.

— Улічваючы клас суперніка, які зыход матча прымальны для каманды?

Д.Б. — Перамога. Нічыя таксама нядрэнна. Але мы настроены на перамогу. Я веру, што прыйдзе поўны стадыён, як і з «Барселонай», будзе такая ж фантастычная атмасфера. Я таксама веру, што ў нас атрымаецца рэабілітавацца перад сваімі балельшчыкамі.

— Дзмітрый, у «Мілане» ты правёў не самы лепшы матч. Якія высновы зрабіў для сябе?

Д.Б. — Згодны, матч праваліў.

В.Г. — Не праваліў, а мог бы лепш згуляць.

Д.Б. — Гульня прайграна, трэба рабіць высновы. Мы разабралі той матч, я ўбачыў свае памылкі. Буду імкнуцца выправіць.

В.Г. — Калі закранулі гэтую тэму... Увесь час кажу Дзіме, што рэзерв каманды — гэта ўзмацненне менавіта яго гульні. Яму шмат дадзена — з яго і спагнанне асаблівае.

— Віктар Міхайлавіч, у гэтым сезоне ваша каманда лепш праводзіць другія сустрэчы ў двухматчавых супрацьстаяннях. Якія рэзервы ўзмацнення вы бачыце ў гэтым матчы?

В.Г. — Калі не казаць пра самую гульню, то каб абыграць такога суперніка ці хаця б забіць гол, мы павінны быць вельмі дзёрзкімі. Гэта халодная галава ў абароне і дзёрзкасць у атацы. Плюс трэба ўлічваць пэўныя тактычныя моманты, размяшчэнне гульцоў «Мілана» на полі, нашы дзеянні. Для нас важная і падтрымка стадыёна, улічваючы, што мы вельмі ўдзячныя балельшчыкам пасля матча з «Барселонай». Калі каманда і стадыён будуць адзінымі, нам шмат па плячы.

— Што перад матчам непакоіць больш за ўсё?

В.Г. — У нас была надзейная звязка Сіміч—Філіпенка. Ягор не можа згуляць — гэта дрэнна. Акрамя таго, няўпэўнена сябе адчувае Сіміч, што таксама засмучае.

— Вы гулялі супраць «Мілана» дзесяць гадоў таму. Параўнайце, калі ласка, тыя і цяперашнія ўражанні.

В.Г. — Тады ў нас не было ніякага ўяўлення, што такое «Мілан». Нас запусцілі і сказалі: гуляйце. Зараз ёсць дакладнае разуменне пра ўзровень суперніка і пра тое, як яму супрацьстаяць. Добра памятаю хатнюю гульню — у нас была дзёрзкая каманда, кураж... Мы прайгралі 0:2, але была задаволенасць, як мы згулялі. І балельшчыкі, пакідаючы стадыён, не былі падманутымі. А што датычыць выязной гульні, то ў нас у камандзе нават жарт ходзіў: калі мы выйшлі на поле, нашу ўвагу адцягвалі электронныя рэкламныя шчыты. Яны шалясцелі, калі пераварочваліся, і мы сачылі не за гульнёй, а за імі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Рукапісы не гараць. Гараць па іх сэрцы

Дзеля памяці

Кажуць, што ёсць адна ноч, калі ўся нячыстая сіла выпаўзае і правіць свой баль сярод людзей. Ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў Беларусі стала крывавай: адразу 100 чалавек былі расстраляны.

Наогул восень 1937 года ў Беларусі была «гарачай»... Ёсць лічбы, што за тры месяцы восені 37-га года было рэпрэсавана больш за 600 вядомых асоб Беларусі, цвет і гонар нацыі. Даўно гэта было, але дагэтуль непакоіць рана ў сэрцы народа.

Прадчуваннем вялікай бяды быў пажар, які здарыўся яшчэ ў жніўні: ва ўнутраным дварэ Мінскай турмы НКУС шугала полымя, распаленае з рукапісаў, — адразу вялікая колькасць беларускіх пісьменнікаў патрапілі ў шэрагі «ворагаў народа». Спачатку творы не прайшлі цэнзуру, але для надзейнасці, каб нават ніводнай думкі з іх не прасачылася да чытачоў, гэтыя творы вырашылі спаліць. Аўтары былі арыштаваны, і іх чакала пакутлівая расправа.

На працягу «чорнай ночы» 29 кастрычніка былі расстраляны 22 беларускія літаратары, у наступную ноч — яшчэ чацвёра. Навукоўцы, нават дзяржаўныя, грамадскія і партыйныя дзеячы не пазбеглі рэспрэсій. Яны жылі і працавалі дзеля БССР, поўныя ідэалаў і планаў на светлую будучыню свайго народа ў агульнай савецкай сям'і, дзе правіў магутны ўладар, на якога працавала сістэма, гатовая знішчыць усё, што выклікала пытанні і было ёй незразумела. За сваімі рэпрэсаванымі роднымі пайшлі «па этапе» іх сем'і.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што за ўсе гады сталінізму ў тагачаснай Беларусі пацярпела больш за паўтара мільёна чалавек, з рэпрэсіямі сутыкнулася кожная трэцяя сям'я.

Больш за 70 гадоў прайшло з таго часу, але дагэтуль удар адчувальны і памяць жывая. Хто ведае, якой была б незалежная Беларусь сёння, калі б таленавітыя сыны, лепшыя розумы яе працавалі б дзеля дабрабыту сваёй Радзімы?

Ларыса ЦІМОШЫК.

Погляд

НЕ БУДЗЕМ ГУЛЯЦЬ У ХОВАНКІ?

У горадзе праводзіцца планавая паверка вадамераў. Баранавіцкі «Водаканал» разаслаў даведкі, паспадары кватэр патэлефанавалі ў арганізацыю, і кожнаму прызначылі дату, калі работнікі «Водаканала» прыедуць па лічыльнікі, каб зняць іх і праверыць.

А неўзабаве ўзнікла непразуменне. Мікрааўтобус з надпісам «Водаканал» пад'язджае да пад'езда, і рабочыя ў адной з кватэр здымаюць вадамер. Праз два дні зноў прыязджаюць, і ўбачыў дэмантуюць лічыльнік у іншай кватэры гэтага ж пад'езда. Нехта з жыльцоў убачыў работнікаў «Водаканала» і папрасіў: «Зніміце вадамер і ў мяне, вы ж у нашым пад'ездзе, а то мне праз дзень чакаць давядзецца».

«Які нам далі расклад, то мы так і ездзім», — чуецца ў адказ.

Дайшла чарга і да майго пад'езда, і ўсё паўтарылася, як апісана вышэй. А чаму б вадамеры не зняць у пад'ездзе ці доме ў «адзін прысест»? А то ганяюць дзяржаўны транспарт туды-сюды.

— У нас складзены графік, і па ім нашы работнікі працуюць, — растлумачыў **кіраўнік «Водаканала» Віктар КАЛАСОЎСКІ.** — Кожны вадамер мае свой тэрмін праверкі.

— Віктар Вікенцьевіч, калі б гэты тэрмін меў разбежку хоць месяц, а то адзін-два дні. Хіба гэта істотна? Вось у майго вадамера тэрмін закончыўся 16 кастрычніка, а здымаць яго будуць 22-га, то чаму ж нельга было лічыльнік адкруціць 14-га, 16-га ці 19-га, калі вашы людзі прыязджалі? Адмовілі. А што, бензін ужо танны?

— Мы стараемся падладзіцца пад людзей. Вось чалавек кажа, што не можа адлучыцца з работы ў вызначаны намі дзень. І прызначае свой час. Ідзём яму насустрач.

— Калі чуеш, што вашых людзей трэба чакаць з 14 да 20 гадзін, то ўзнікае пытанне: «А ці не маглі б вы скараціць гэтае чаканне? Напрыклад, прыкінулі б, колькі часу трацішца на адзін вадамер і ўстанавілі б чалавеку перыяд з 15 да 16 гадзін ці як там атрымліваецца. І ўвогуле, калі ўжо працуе ў пад'ездзе, то чаму не зняць вадамер і ў суседа, які просіць?

— Разумееце, калі нашы работнікі будуць рэагаваць на такія просьбы, то мы паломім графік і не прыедзем своечасова да чалавека, які адпрасіўся з працы і чакае нас.

Гэты выпадак — дробязь. Але ён — люстэрка нашага штодзённага жыцця.

Сістэма павінна працаваць стабільна, як добра адладжаны механізм, дзе спачатку ўсё прадумваюць, а потым робяць так, як найбольш выгадна — для ўсіх. Да ўсяго яна павінна быць прыстасткай, каб усё зноў ды ўсім было зразумела. Адсутнасць апошняга фактара стварае праблемы не толькі для грам

Частка 3

ЗА АКІЯН З ПУСТЫМІ КІШЭНЯМІ

Як вярнуцца дадому, калі на іншым кантыненце ў вас скралі грошы і пашпарты?

Мы працягваем друкаваць гісторыю пра тое, як сямейная пара з Беларусі вандравала па амерыканскім кантыненце.

Нагадаем, што журналістка Жэня і геолаг Верасень пераляцелі ў ЗША, падзарабілі там грошай ды пайшлі на аўтабан спыняць фуры.

Так яны забясплатна даехалі да Мексікі, мінуўшы самы крымінагенны горад свету Сьюдад-Хуарэс. Паглядзелі Гватэмалу, Гандурас, сфатаграфавалі беларускі трактар у Нікарагуа, пакаталіся на сёрферы па акіянскіх хвалях у Коста-Рыка. Потым бясплатна пераляцелі самалётам у Калумбію, дзе пражылі каля месяца ў доме са слугамі.

Вандроўка працягвалася...

— Калі захочаце набыць новую добрую майстравую гітару — едзьце ў Эквадор, — *працягвае Верасень свой захапляльны расповед.* — Цэны надзіва недарагія, а якасць цудоўная.

Эквадор — вельмі цікавая краіна. Першае, што вылазіць у рускамоўным інтэрнэце, — «эміграцыя ў Эквадор». Людзі там добрыя, іх тэмперамент пастаўлены ў пэўныя межы. Усе пераходзяць вуліцу на святлафоры, ніхто нікога не падманвае, заўсёды даюць чэкі. Гэтым Эквадор нечым падобны да Беларусі. У іншых краінах, дзе мы пабылі, трэба быць пільнымі. Табе ўвесь час спрабуюць нешта прадаць у два, у тры разы даражэй, даць меншую рэшту. Узровень жыцця там добры. Далей мы паехалі ў Перу.

За два дні ў гарах беларусы паспелі стаць хроснымі і нават удзельнічалі ў адпяванні

Чамусьці менавіта гэту краіну большасць знаёмых людзей хоча наведаць. Насамрэч Перу пакінула неадназначныя ўражанні. Краіну можна падзяліць на пустэльню і горы. Там, дзе пустэльня, ёсць гарады пад два мільёны чалавек, якія знешне нагадваюць вялізную вёску. Там у нас зніклі відэаматэрыялы, якія мы здымалі пяць месяцаў. Адна дзяўчынка, якая прыляцела да нас у Эквадор, не была вельмі пільная. У яе «ўвялі» вялізны заплечнік, калі яна адвярнулася ў рэстаране. Уражанні былі не найлепшыя.

А перуанскія горы — зусім іншая гісторыя. Аднойчы мы ехалі на грузавой машыне. Кіроўца спыніўся: «Хадземце паядзім!» А ў нас на той момант былі фінансавыя праблемы. Кіроўца кажа: «Не-не, тут усё бясплатна». Прыходзім, а ў памяшканні стаіць труна, гараць свечы. Прынеслі ежу.

Было незразумела, што рабіць. Нам прапанавалі: «Заставайцеся ў нас, заўтра мы вас завязём». І мы засталіся. Як аказалася, адпявалі бабулю Дэльфіну — маці вялікага сямейства. Адтуль мы паехалі на машыне, якая прывезла цэглу. Таму што там горы вышынёй пад 4000 метраў, і магілу ужо не выкапаеш, трэба будаваць...

А ў наступным горадзе, які называўся Акаюка, мы праходзілі побач з адным домам, куды нас таксама запрасілі. Было нейкае мясцовае свята. І так атрымалася, што ўвечары ў нас з'явіўся хрэснік. Хлопчыка пахрысцілі.

— Ты што!!! Як яго завуць?

— Хуан Карлас.

Па якім маршруце вандравалі Жэня і Верасень?

З Украіны пераляцелі ў ЗША. Па ЗША аўтастопам на фурах і легкавіках пад'ехалі да Мексікі. Далей вандравалі на фурах, пікапах і легкавіках: Гватэмала—Гандурас—Нікарагуа—Коста-Рыка—Панама. У Калумбію пераляцелі грузавым самалётам. Далей на фурах, пікапах і легкавіках даехалі да Эквадора, Перу, Балівіі, Бразіліі, Аргенціны.

У Беларусь Жэня і Верасень вярнуліся сёлета ў маі 2011 года, праехаўшы каля 30 тысяч кіламетраў.

— Дык зноў давядзецца вяртацца ў Перу...

— Трэба будзе. Горы ў Перу — гэта нешта неверагоднае. Магічныя і касмічныя адчуванні.

Чым у Балівіі ажыўлялі беларускую Казу?

З Перу мы паехалі ў Балівію. Беларускі Новы год адзначалі на нейтральнай тэрыторыі. Купілі бутэльку мясцовага недарагога алкаголю, маленькую бутэлечку. І калі ў Беларусі на гадзінніку было 12 ночы (у Балівіі, для параўнання, гэта тры-чатыры гадзіны дня), мы пачалі крычаць, чым прыцягнулі ўвагу мясцовых памежнікаў. А побач з намі аказаліся жанчыны, якія з Балівіі везлі розную кантрабанду. Жанчыны далі памежнікам на рукі хабар — і ўсё нармальна.

Мы ж пайшлі далей і працягнулі святкаваць Новы год на возеры Ціцікака.

— І як там у Балівіі?

— Гэта самая танная краіна, у якой мы былі. Зняць хостэл каштуе паўтара-два долары. Столькі ж каштуе паесці: першае, другое і трэцяе. Людзі ўсе вельмі душэўныя, шмат індзейцаў.

У Балівіі легальная кока, яны яе ўвесь час жуюць.

Тут мы арганізавалі фестываль — «Беларускія калядкі». Зрабілі Казу, звязду, вывучылі песні. Далучылі да справы мясцовых дзяцей — і пайшлі па хатках.

А людзі ж не разумелі, што такое калядкі. Каб неяк ім патлумачыць, у нас каза танчыла-танчыла, а потым падала. Каб яе ажывіць, трэба было даць казе нечага салодкага. Так мы накалядавалі сабе мех ежы.

На якія гарады падобны Мінск?

З Балівіі мы паехалі ў Бразілію. Розніца была ашаламляльная — нібы патрапляеш у Еўрасаюз. Там ужо — кандыцыянеры, зніклі джунглі, не было камароў, дажджы. На вялізных плошчах Бразіліі джунглі высеклі і пасадзілі сою. Можаш два тыдні ехаць на аўтамабілі, а міма — соя, соя, соя.

У бразільскіх гарадах шмат багатых людзей. Праехацца па Рыа-дэ-Жанейра на грамадскім транспарце каштуе два долары. Па цэнах як у Францыі.

Мінск вельмі падобны на сталіцу Бразіліі — Бразіліа. Яе таксама збудавалі ў 60-х гадах: шырокія праспекты, вялікія кавалкі неба над галавой. І вельмі-вельмі горача. Ёсць будынкі кшталту Палаца Рэспублікі, маштабныя дарожныя развязкі.

З Бразіліі мы паехалі ў Аргенціну, каб трапіць у самую паўднёвую кропку зямлі — на Вогненную Зямлю. Якраз там мусіла скончыцца наша вандроўка. У Аргенціне ёсць рэгіёны, дзе вельмі шмат эмігрантаў з Беларусі. Польшчы, Украіны. Яны выехалі яшчэ некалі даўно. Таму ідзеш і паўсюль пазнаеш нашы твары.

— А як там жывуць у Аргенціне?

— Ёсць розныя месцы. Напрыклад, на поўдні яны вырошчваюць матэ, якое мы зараз п'ём. Там райскія кліматычныя ўмовы, увесь час цёпла, але не надта горача. Зімы няма, але і вялікай спёкі таксама. Аднак заробкі па іх мерках не надта вялікія. Хоць і большыя, чым у нас. А яшчэ далей на поўдзень пачынаецца Патагонія. Даволі пустая зямля, і таму гарадоў там усяго штук пяць. Напрыклад, стаіць горад, дзе здабываюць нафту. Кшталту Нафтаюганска такога. І там ужо ў людзей вельмі шмат грошай. Чым далей на поўдзень — павялічваюцца цэны на прадукты, з-за дастаўкі. Там нічога не расце. І ўсё, нават дрэва і бетон, прывозіцца туды здалёк. Прытым на фурах. Бо чыгунку ў іх выкупіла адна з кампаній аўтаперавозак, і перавозкі цягнікамі замарозіла.

— І што, на такія эканамічныя тэмы вы з мясцовымі размаўлялі па-іспанску?

— Так, вывучылі ж мову. У Бразіліі навучыліся размаўляць па-партугальску. Можа, на нейкія касмічныя тэмы не гаварылі, але пра тое, адкуль я, хто я, як тут жывецца, не было праблем. Ды і людзі душэўныя.

— Па тваіх расповедах — паўсюль душэўныя людзі.

— Так.

— А беларусы ў параўнанні з імі якія?

— Ды нармальныя, добрыя людзі. Тэмперамент толькі іншы. У нас людзі больш спакойныя і халодныя. Не ў тым плане, што яны табе чымсьці не адмовяць. А ў тым, што яны не такія гарачлівыя. Гэта ўсё, я думаю, залежыць ад сонца. Вось у нас зараз такое асенняе надвор'е, і ўсе спакойна, павольна ходзяць па вуліцах. Тэмпература, клімат, сонца — усё гэта вельмі ўплывае на людзей. Пакуль мы ездзілі, у нас было лета, лета, лета, а потым вясна, і зноўку лета. І заўжды было цёпла. І калі на цябе год свеціць сонца, то мяняюцца густы, якія нібыта гадамі былі акрэслены. Музычныя прыхільнасці мяняюцца, вобраз мыслення.

Край зямлі

— Калі мы трапілі на Вогненную Зямлю і даехалі да горада Ушуая, то далей дарог ужо не было. Гэта самы паўднёвы горад планеты.

— Што гэта за месца?

— Вогненную Зямлю дзеляць Аргенціна і Чылі. Гэта такі востраў, край свету. Вельмі прыгожа там. Маленькія дрэвы, пачынаюцца горы. Там непадалёк Антарктыда, холадна.

Ці ўзнікалі на працягу экспедыцыі небяспечныя сітуацыі?

Гэта адзіная тэма, пра якую Верасень цягам нашай гутаркі размаўляў неахвотна. Каб лішні раз не напалохаць сваякоў. Аднак пра тое-сёе мне даведацца ўдалося.

З усёй даўжэзнай вандроўкі толькі аднойчы беларуская сямейная пара села ў фуру да «заклапочанага» кіроўцы, якога давялося супакойваць табурэткай. І канфлікт быў вычарпаны. У асноўным кіроўцы фураў і легкавікоў — добразычлівыя асобы. Але трымаць нос па ветры ўсё ж неабходна.

Аднойчы беларусаў развярнулі падчас перасячэння мяжы. Нашы не разабраліся з правіламі і аказаліся нелегаламі. Аднак абышлося тым, што спагналі 120 долараў на падрыхтоўку дакументаў. І больш ніякіх санкцый.

Як патлумачыў Верасень, важна ставіцца да людзей прыязна, але адначасова паказваць, што ты не дурань, якога можна падмануць на кожным кроку. Таму ніякіх нападаў і гвалту ў дачыненні да Верасня і Жэні падчас вандроўкі і блізка не здаралася. Наадварот, нашых паўсюль клікалі, паўсюль саджалі за стол і аказвалі дапамогу. Праўда, гэта беларуская парачка па-сапраўднаму ўмее навязваць кантакты. Куды яны б ні паехалі, экзатычных гасцей з Беларусі запрашалі на TV-шоу, вячэры. Мясцовыя чыноўнікі таксама ішлі насустрач. Таму ў выпадку небяспечных сітуацый было куды звяртацца.

За ўвесь год беларусы толькі аднойчы хадзілі да ўрача. Медыцынская страхоўка, якую зрабілі на Бацькаўшчыне, тут не спрацавала. Урач выпісаў пілюлі, якія аказаліся даволі таннымі, і алергія прайшла.

— У што вы былі апрануты?

— Усё, што ў нас было, — усё на сябе апранулі. Выратоўвала тэрмабялізна.

— А ў Чылі ведалі, што іх нацыянальны герой Дамейка — беларус?

— Пра Дамейку ведаюць толькі прасунутыя чылійцы. І лічаць, што ён з Польшчы прыехаў.

— А калі б вас дзе-небудзь абрабавалі? Як выйсці з сітуацыі, вярнуцца?

— Можна ж вярнуцца на баржы. Мы маглі, напрыклад, вярнуцца з Ушуаі на караблі. У буйных портах заўжды ёсць караблі з Расіі — з Санкт-Пецярбурга і Калінінграда. Нават калі ў цябе няма грошай і дакументаў, на гэтым караблі ты можаш апынуцца за тое, што ты там будзеш працаваць. Табе за гэта могуць нават заплаціць.

Але мы пакінулі табурэтку ў акіяне і вырашылі вяртацца дадому самалётам. Так наша экспедыцыя была завершана.

Гутарыў Яўген ВАЛОШЫН.

Самы моцны беларус Кірыл Шымко скрануў з месца і працягнуў 55-тонны кар'ерны самазвал «БелАз», дзякуючы чаму ў чарговы раз стаўшы рэкардсменам Кнігі рэкордаў Гінэса. Для Кірыла гэты рэкорд не першы — яму «паддаўся» пасажырскі самалёт «Боінг-737», чыгуначны састаў з пяці пасажырскіх вагонаў, транспартны самалёт «Іл-76», танк «Т-34», а ў 2009 годзе самы моцны чалавек Беларусі першым устанавіў рэкорд і скрануў з месца на два метры 30-тонны самазвал. Рэкорд праводзілі падчас акцыі БРСМ «Моцная Беларусь» у Мінску, дзе гледачы змаглі таксама паназіраць за аўтамабільным і мота-шоу, паслухаць канцэрт зорак беларускай эстрады, паўдзельнічаць у конкурсах.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Шануй сваё!

Хачу пабачыць свайго ўладара!..

ЯК ТРАПІЦЬ НА ПРЫЁМ ДА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВІТАЎТА І КАРАЛЯ ЯГАЙЛЫ?

ПЕРАМОЖЦЫ Грунвальда разам у музеі ў адкрытым доступе. Але толькі да 3 лістапада на іх можна паглядзець вось так проста: скульптурныя рэканструкцыі выстаўлены ў Нацыянальным гістарычным музеі.

Кіраўнікі вялікіх краін, кожнаму з якіх у гісторыі Беларусі выпала свая роля (што знайшло адлюстраванне, напрыклад, у тэатры), стрыечныя браты, якія не заўсёды добра ладзілі (і гэта мякка сказана!), кожны з якіх быў магутным уладаром у сваёй дзяржаве... У поўны рост, на пастаментах, нібыта на троне. Яны ў музеі стаяць побач — і канула ў вечнасць суперніцтва, і адкінутая памяць пра інтрыгі і страты. Яны побач, бо ў галоўны момант здолелі забыцца на асабістыя крыўды і амбіцыі і праявілі розум сапраўдных правіцеляў: аб'ядналі свае народы ў барацьбе супраць агульнага і магутнага ворага на Грунвальдскім полі.

Кожны, хто ведае і любіць гісторыю, мае ўласнае ўяўленне пра ўладара Вялікага Княства Літоўскага князя Вітаўта і караля Польшчы Ягайлу. Як мае і ўласнае стаўленне да кожнага з іх. Таму ў кожнага маглі скласціся ва ўяўленні свае вобразы Вітаўта і Ягайлы.

Таксама як і ў скульптара Паўла Лука і мастака Юрыя Піскуна ёсць асабістыя ўяўленні, але іх было недастаткова, каб стварыць скульптуры дзвюх гістарычных асоб. Мастакі вывучалі дакументы, якія маглі падказаць, як насамрэч выглядалі Вітаўт і Ягайла, гравюры, пячаткі з выявамі, каб як мага дакладней паказаць нашым сучаснікам, як выглядалі гэтыя дзяржаўныя асобы. Кожны з гэтых аўтараў ужо меў досвед стварэння вобразаў з гісторыі Беларусі. Паўлу Луку давялося прыкласці рукі да стварэння скульптур Францыска Скарыны і Кастуся Каліноўскага. Юрый Піскун апошнія гады працаваў над рэканструкцыяй гістарычных касцюмаў для Нясвіжскага і Мірскага замкаў.

Партрэтныя скульптуры Вітаўта і Ягайлы спецыяльна замовіў Нацыянальны гістарычны музей, адзначыў яго дырэктар Сяргей Вечар. Цяпер кожны наведнік, хто лічыць сябе нашчадкам Вялікага Княства Літоўскага, зможа пахваліцца: я бачыў свайго ўладара, я бачыў героя Грунвальда!..

Вобраз Вітаўта даўся няпроста. Скульптару давялося вывучаць яго выяву на асабістай пячатцы князя, таксама мініяцюру пачатку XVI ст. і гравюру з кнігі Гваньіні 1578 г. Але важна было аднавіць і гістарычную вопратку. У Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі захоўваецца рэальны «пояс Вітаўта» — вось тое галоўнае, што павінна яго вылучаць. І на скульптуры — такі ж. Вобраз Ягайлы аднаўлялі на падставе выявы з надмагілля польскага караля, падказку наконт яго вопраткі знайшлі ў абразе «Пакланенне трох каралёў».

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота БЕЛТА.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 29 ноября 2011 г. проводит повторный открытый аукцион № 16-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).

Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право аренды на 5 лет 9 земельных участков для строительства в г. Минске:

№ п/п	Место расположения земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1.	ул. Кижеватова (ПДП поз.17.1)	500000000004004465	0,2000	Объект общественного питания	149 177 448	14 000 000	4 356 428	–
2.	ул. Карвата в районе КПП	500000000001005326	0,1000	Кафе	74 588 724	7 000 000	4 341 284	–
3.	ул. Радиальная	500000000002007532	0,1500	Станция технического обслуживания	40 796 022	4 000 000	5 822 967	Возмещение потерь сельхозпроизводства в размере 947 904 руб.
4.	ул. Радиальная	500000000002007531	0,1000	Мойка автомобилей	27 135 078	2 000 000	5 045 897	Возмещение потерь сельхозпроизводства в размере 631 936 руб.
5.	ул. Матусевича	500000000006006046	0,4000	Размещение детских аттракционов на земельном участке в парке 60-летия Октября	336 353 472	33 000 000	4 786 333	–
6.	Микрорайон Каменная Горка-2	500000000006005862	0,3695	Блок бытового обслуживания на 23 рабочих места с кафе на 50 посадочных мест и общественным туалетом на 10 приборов по генплану № 20	277 066 588	27 000 000	5 622 178	Возмещение затрат УКСу Мингорисполкома в размере 27 505 071 руб.
7.	ул. Барамзиной в жилом районе Сокол	500000000004004553	0,2000	Многофункциональный комплекс с объектами общественного питания, торговли и обслуживания населения	205 072 140	20 000 000	4 616 907	–
8.	ул. Фучика – ул. Ангарская	500000000002007550	0,1500	Объект общественного питания на 50 посадочных мест с магазином и кулинарией	193 924 430	19 000 000	4 722 152	–
9.	ул. Ваупшасова в районе пересечения с ул. Солтыса	500000000001033627	0,1500	Объект торговли с помещениями общественного питания	193 422 140	19 000 000	4 676 904	–

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **29 ноября 2011 г. в 11^{00} по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (не позднее 23 ноября 2011 г.) в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 2 ноября 2011 г. по 23 ноября 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

МАЗ пачне выпускаць школьныя аўтобусы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыступка ў школьнага МАЗаўскага аўтобуса выпаўзае адначасова з адкрыццём дзвярэй, і вышыня гэтай прыступкі — 175 мм (хоць стандарт дазваляе і 250 мм). Таксама ўваход зроблены так, каб дзіця, стоячы на дарозе, пры ўваходзе ў салон магло дацягнуцца да поручня. У салоне ўсе сядзенні накіраваны па ходзе руху аўтобуса, маюць рамяні бяспекі і абсталяваны падлакотнікамі з боку праходу. І толькі адно сядзенне каля кіроўцы павернута супраць руху аўтобуса: яно прызначана для таго, хто суправаджае дзяцей: ён павінен бачыць усіх сваіх выхаванцаў. Падлога ў гэтым аўтобусе са спецыяльным пакрыццём, каб не быць слізкай. Свае асаблівасці ёсць нават у багажных паліц: яны прадугледжаны такім чынам, каб на кожнага школьніка прыходзілася не менш чым па 20 кубічных дэцыметраў прасторы. Паліцы нахілены так, каб ранец ці заплечнік не мог выпасці падчас руху аўтобуса.

Люстэркі школьнага аўтобуса зроблены з электрападагрэвам. Акрамя таго, у іх відаць уся прастора ад самага асфальту, каб кіроўца добра бачыў, як заходзяць ці выходзяць дзеці. Варта таксама адзначыць, што гэты аўтобус можа разганяцца толькі да хуткасці 60 кіламетраў за гадзіну. Такое абмежаванне ўведзена спецыяльна, бо толькі з такой хуткасцю, згодна з правіламі, можна перавозіць школьнікаў.

Што тычыцца цаны на новы аўтобус, то Васіль Владыцкі пераканаты, што ён будзе каштаваць менш, чым звычайны, на якім у базавай камплектацыі ставіцца больш дарагі рухавік «Cummins»:

— Рухавік на школьным аўтобусе айчынны, Мінскага маторнага завода, экалагічнага стандарту ЕЎРА-4. Ён мае 177 конскіх сіл — гэтага цалкам дастаткова для поўнай масы ў 9 тон. Каробка кітайская — яна ўжо даўно прымяняецца ў аўтамабілях. А вось на аўтобусах такая каробка ўпершыню. Проста хацелася зрабіць школьны аўтобус танным.

Васіль Владыцкі таксама паведаміў, што першыя МАЗаўскія школьныя аўтобусы будуць ездзіць у Беларусі, але пры гэтым адзначыў, што да новай распрацоўкі МАЗа цікавасць праяўляюць Малдова і Расія.

Дарэчы, у 2012 годзе канструктары Мінскага аўтазавода плануюць надалей развіваць аўтобусную тэматыку і выпусціць гарадскі аўтобус з гібрыдным прывадам:

— Тэма гібрыднага прыводу ў аўтабудаўніцтве не новая, а дастаткова прасунутая, — тлумачыць **Анатоль ДЗЯДКОЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара МАЗа.** — І большасць брэндаў гэтую тэму развілі і маюць такія мадэлі. Мы хочам таксама заняць сваё месца — у нашай лінейцы тэхнікі павінен быць аўтамабіль з гібрыдным прывадам. І гэта будзе аўтобус, бо ён працуе ў населеных пунктах, дзе пытанні экалогіі вельмі актуальныя. У гібрыднага аўтобуса будзе традыцыйная сілавая ўстаноўка, а таксама другая, якая працуе ад акумулятара.

Калі ж вяртацца да ўжо зробленых мадэляў, то журналістам таксама прадэманстравалі і некаторыя навінкі грузавых аўтамашын. У прыватнасці, быў паказаны сядзельны цягач МАЗ-5440В9, які адрозніваецца ад свайго папярэдніка абноўленым інтэр'ерам кабіны. У ім канструктары МАЗа імкнуліся стварыць максімальна камфортныя ўмовы для кіроўцы: усталяваны пнеўмападрэсорнае сядзенне, новыя рулявая калонка і панэль прыбораў, а таксама кандыцыянер з аўтаматычнай падтрымкай тэмпературы. Яшчэ былі прадэманстраваны абноўлены бартавы аўтамабіль для гарадскіх ды прыгарадных перавозак, а таксама некалькі новых мадэляў самазвалаў з U-падобнай платформай, якая дазваляе паскорыць працэс разгрузкі, з-за адсутнасці вострых вуглоў забяспечваецца поўнае ссыпанне грузу.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Анатоль АКАНЦІНАЎ:

«НАМ ЗАЎСЁДЫ ПРЫВІВАЛІ, ШТО БЕЛАРУС НЕ МОЖА МЕЦЬ СВОЙ ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ»

ШВЕЙЦАРЫЯ знакамітая сваёй банкаўскай сістэмай і гадзіннікамі, Францыя — віном, Германія — якаснымі аўтамабілямі. А што ведае свет пра Беларусь? Які імідж мае наша краіна? Гэтым пытаннем айчынныя маркетолагі задаліся яшчэ летась, калі арганізавалі форум «Імідж Рэспублікі Беларусь». Сёлета ў канцы лістапада пройдзе другі такі форум, дзе тэма краінавага іміджу зноў будзе абмяркоўвацца спецыялістамі і прадстаўнікамі дзяржорганаў. Напярэдадні гэтай падзеі мы сустрэліся з Анатолем АКАНЦІНАВЫМ, адным з ініцыятараў форума, генеральным дырэктарам Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы», членам праўлення ГА «Гільдыя маркетолагаў», і паразважалі пра тое, якім можа быць імідж нашай краіны і што для гэтага трэба зрабіць.

Фота Юліі МАЦКЕВІЧ.

— Імідж краіны — першапачаткова для мяне гэты тэрмін быў больш маральнага плану. Але потым, калі я больш глыбока акунуўся ў гэтую тэму, паслухаў меркаванні калег, партнёраў, іншых зацікаўленых людзей, то ўбачыў, што імідж краіны — гэта рэч не нейкая аморфная, а дастаткова прагматычная. Скажам, калі дзяўчына хоча некаму спадабацца, то яна павінна прывесці сябе ў парадак: навесці марафет, апрануцца, паводзіць сябе адпаведным чынам. Вось можна ўмоўна так расцэньваць і імідж краіны. Але спачатку, вядома, мы павінны спадабацца самі сабе. Бо калі мы не будзем упэўнены самі ў сабе, калі ў нас не будзе самаідэнтычнасці, калі мы не будзем ганарыцца сваёй краінай (за наш розум, за нашы дзеянні, за нашы дасягненні, за нашу прадукцыю, за нашу гісторыю і г. д.), то мы будзем вельмі нязграбна і няўпэўнена сябе адчуваць.

Прагматычнасць іміджу краіны ацэньваецца і з пункту гледжання прыцягнення інвестыцый. Але не абы-якіх, а менавіта тых інвестыцый, якія нам цікавыя — пад нашы галіны, пад нашы нацыянальныя каштоўнасці: гэта і экспарт, які мы хацелі б развіваць, гэта і турызм, і іншыя. Далей трэба казаць пра непасрэдныя механізмы рэалізацыі: сродкі камунікацыі, тавараправодныя сеткі, нашы прадстаўніцтвы, фестывалі, выставы і г. д. Пры гэтым, яшчэ раз паўтаруся, мы павінны дакладна ведаць, чым адрозніваемся ад іншых і ў чым нашы перавагі.

Пакуль мы ствараем імідж краіны стыхійна, недзе несвядома і бязладна. Чым, дарэчы, часта іншыя краіны карыстаюцца: маніпулююць нашай краінай у нейкіх сваіх палітычных або эканамічных інтарэсах. Таму нам трэба ўсё ўсвядоміць, асэнсаваць сябе, убачыць свае моцныя бакі, вызначыць прыярытэты, вырашыць, з чаго будзем пачынаць, з якіх галін, з якіх напрамкаў, і далей крок за крокам замацоўваць нейкія дасягнутыя гарызонты, глядзець, дзе мы гэтыя гарызонты можам пашырыць. Імідж — гэта ўсё-такі такое прагматычнае, прыгожае, мэтанакіраванае паняцце.

— Як сёння ўспрымаецца Беларусь у свеце?

— Першае, з чым я сутыкаюся, — гэта тое, што нашу краіну недастаткова ведаюць. Але, па вялікім рахунку, нам і не трэба, каб пра нас усе ведалі. Галоўнае, каб інфармацыяй пра нас валодалі мэтавыя аўдыторыі, у кім мы маем патрэбу.

Па-другое, Беларусь моцна палітызаваная. Як унутры краіны, так і звонку. Чамусьці імідж з пункту гледжання палітыкі пануе над усімі іншымі іміджамі краіны. У нас жа ёсць шмат іншых станоўчых момантаў — і «Славянскі базар», і нейкія спартыўныя мерапрыемствы, і той жа экспарт. Я лічу, што якраз іншыя моманты — скажам, эканамічнага ці культурнага характару — павінны быць вышэй, гучней. Гэта больш выйгрышная пазіцыя, якая прынясе дывідэнды ўсім, у тым ліку і палітыкам. А пакуль што нас на Захадзе ўспрымаюць больш негатыўна, і ў асноўным гэта з-за палітыкі.

> **«...Дзяржава павінна толькі рэгуляваць (гэта трацейскі суд паміж бізнэсам і насельніцтвам), і яе задача — збалансаваць інтарэсы бізнэсу і ўсіх астатніх грамадзян...»**

У сённяшніх складаных і крызісных часы трэба адыходзіць ад ментальнасці беднаты і недасканаласці. Бо калі мы будзем заставацца ў гэтым «балоце», то не зможам дасягнуць нейкіх значных поспехаў. Нам проста трэба зараз псіхалагічна мяняць акцэнты, перанесці цяжар з адной нагі на другую. Тады мы будзем верыць у сябе, мы ўбачым новыя мэты, гарызонты, і рух будзе зусім іншым.

— У свеце ведаюць беларускую прадукцыю?

— Гістарычна ў нас і сёння захоўваюцца пэўныя пазіцыі: калійныя ўгнаенні, БелАЗ, трактары «Беларус». Ёсць і дастаткова новыя брэнды — «Савушкін прадукт», «Мілавіца», «Санта-Брэмар». Гэтыя пазіцыі пазнавальныя як беларускія брэнды, і, вядома, яны з'яўляюцца элементам іміджу. Іх трэба падтрымліваць, узмацняць і развіваць. Разам з тым, яшчэ існуюць брэнды, якія фармальна не аформлены: напрыклад, беларускія прадукты харчавання, мэблю, трыкатаж, санаторыі. Гэта, як я называю, «брэнды-беспрытульнікі», якія ствараюцца стыхійна.

— Як лічыце, каб выбудаваць пэўны імідж нашай краіны, нам трэба развіваць усе галіны адначасова, ці засяродзіць увагу на нейкай адной — скажам, на турызме, на транзіце, на лёгкай прамысловасці?

— Тут ёсць як мінімум два прынцыпы развіцця: па вертыкалі і па гарызанталі. Калі мы выбіраем па гарызанталі, то ў гэтым выпадку можна развіваць усе галіны. Але трэба разумець, што краіна ў гэтым выпадку павінна канцэнтравацца на паслугах. Па прыкладу Ганконга, які спецыялізуецца на прадстаўленні пэўных умоў для вядзення бізнэсу. Гэтак і наша дзяржава павінна будзе стварыць нейкую пляцоўку і ўмовы, а далей нам, па вялікім рахунку, усё роўна, што будзе развівацца: мэбля, прадукты харчавання, лёгкая прамысловасць ці нешта іншае. Трэба добра разумець, што самі мы не можам укладваць грошы ва ўсё. Значыць, нам трэба даць магчымасць іншым інвестарам і замежным кампаніям прыйсці сюды, стварыць транснацыянальныя кампаніі і на свой густ і колер арганізоўваць тут вытворчасць. Мы ж будзем спецыялізавацца толькі на паслугах і развіваць інфраструктуру — дарогі, жыллё і г. д.

> **«...Хацелася б, каб беларускіх назваў было больш, бо яны адразу ствараюць перавагі для краіны і асацыіруюцца з нацыяй, а не проста з гандлёвай маркай...»**

Другі сцэнарый па вертыкалі: калі мы хочам быць сусветнай дзяржавай па нейкім напрамку, то мы павінны канцэнтравацца. Як у любой сям'і ў крызіс падлічваюць грошы і думаюць, на што іх выдаткаваць (на тэатр, на хлеб ці на будаўніцтва кватэры), так і ў цэлым у краіне трэба выразна вызначыць, якія галіны нам прынясуць дывідэнды зараз (гэта, як правіла, традыцыйныя галіны, дзе мы маем моц, — прадукты харчавання, калійныя ўгнаенні), а якія галіны — заўтра. Дарэчы, я лічу, што той жа парк высокіх тэхналогій — гэта бізнэс сённяшняга дня, і нам трэба глядзець яшчэ далей, можа, звярнуць увагу на сферу нанатэхналогій ці біятэхналогій. Карацей, нам трэба і «назапашваць будучыню», і трымацца за прыярытэтнае сённяшняе.

А на тых галінах, якія, на жаль, не патрапілі ў гэты спіс, я б таксама крыж не ставіў; іх можна прапанаваць замежным інвестарам. Я б іх максімальна аддаў тым, хто зможа іх выкарыстаць лепш. Дзяржава павінна ўкладвацца толькі ў тыя галіны, якія сапраўды з'яўляюцца нейкай нацыянальнай глебай, падтрымліваць іх. Пры гэтым падкрэсліваю, што не ўдзельнічаць у бізнэсе, а менавіта падтрымліваць. Гэта розныя рэчы: дзяржава павінна толькі рэгуляваць (гэта трацейскі суд паміж бізнэсам і насельніцтвам), і яе задача — збалансаваць інтарэсы бізнэсу і ўсіх астатніх грамадзян. А калі дзяржава пачынае захапляцца бізнэсам, калі яна пачынае канкураваць з бізнэсам, то ад гэтага атрымліваюцца непрыемныя моманты і для насельніцтва, і для краіны ў цэлым.

— Вы сказалі, што беларусам неабходна спачатку самім зразумець, чаго ім трэба і ў якой краіне яны хочуць жыць. Як лічыце, беларусы гэта ўжо зразумелі?

— На жаль, не. Напэўна, прычына ў тым, што беларусам апошнія некалькі пакаленняў не давалі магчымасці пра гэта задумацца. Нам заўсёды прывівалі, што беларус не можа мець свой пункт гледжання. З-за таго, што Беларусь мае выгаднае геаграфічнае становішча, па тэрыторыі праходзіла вельмі шмат інтэрвенцый, войнаў. Гэта наша ноша, але мы павінны яе ўсвядоміць, усвядоміць негатыў гэтых працэсаў і, безумоўна, паспрабаваць гэта скарэктаваць, выкарыстаць неяк пазітыўна. Ну і трэба зразумець, у чым мы моцныя, якое наша «я», за што мы павінны трымацца, што мы павінны зберагаць (прыроду, людзей, культуру, нашы вытворча-іміджавыя напрамкі і г. д.), якія рысы характару ўмацоўваць і выкарыстоўваць, а якія нікому не дэманстраваць і замяняць.

— А як лічыце, наколькі беларуская мова можа дапамагчы сябе ўсвядоміць, паўплываць на імідж краіны? Ці гэта не важны аспект?

— Калі капаць глыбей, то, безумоўна, беларуская мова з'яўляецца асновай. І яна таксама дапамагае паказваць Беларусь як самабытную краіну. Але трэба разумець яе ступень і глыбіню прымянення, выкарыстання. За ўсё трэба змагацца, і за мову таксама.

Сёння мы бачым шмат прыкладаў, калі ў назвах, скажам, украінскай прадукцыі выкарыстоўваецца іх мова. І на расійскім рынку такая прадукцыя адразу па назве пазнавальная. А хто нам замінае рабіць падобнае? Вось у нас ёсць гарэлка «Бульбаш» — магчыма, гэта першая ластаўка. Хацелася б, каб беларускіх назваў было больш, бо яны адразу ствараюць перавагі для краіны і асацыіруюцца з нацыяй, а не проста з гандлёвай маркай.

— Наколькі я ведаю, у канцы 2008 года была створана міжведамасная група па краінавым маркетынгу. Яна зараз працуе?

— Яна адразу ж спыніла існаванне пасля таго, як распрацавала план дзеянняў. Але насамрэч гэты план заключаўся ў тым, што са шматлікіх дзяржаўных праграм проста выцягнулі пэўныя пункты і аб'ядналі ў адно. У дзейнасці гэтай групы я не ўбачыў нічога новага, але яна сваю ролю выканала: гэта быў першы крок да асэнсавання таго, што іміджам краіны трэба займацца. Ужо сам факт фарміравання гэтай групы быў маленькім крокам. Пасля гэтага ўжо пачаліся іншыя працэсы, чыноўнікі зразумелі, што ёсць такая рэч, як краінавы маркетынг. І сёлета я ўжо ўбачыў некаторыя працэсы, накіраваныя ў гэты бок: напрыклад, Мінпрыроды ініцыявала праект па папулярызацыі прыроднага патэнцыялу Беларусі, Нацыянальнае агенцтва па турызме глыбей стала вывучаць расходы замежных грамадзян на тэрыторыі Беларусі, Мінск заняўся распрацоўкай брэнда горада... Так што працэс ідзе, хоць павольна, але ідзе.

— А як лічыце, нейкі падобны савет або група ўвогуле патрэбныя?

— Гэты было б добра, але ўсяму свой час. Не трэба прыспешваць падзеі. Сёння фармат форумаў, якія мы праводзім, дастатковы, пакуль людзі даспяваюць. Наступны фармат — гэта, скажам, лакальныя праекты ў рамках міністэрстваў, а потым узнікне і патрэба ў нейкай каардынуючай групе. Але важна, каб у гэтых працэсах не было адміністрацыйнага рэгулявання. Тут павінны быць творчы пачатак, а толькі потым ужо, калі праект створаны — і выразная арганізацыйная структура, празрыстае фінансаванне і г. д.

Павел БЕРАСНЕЎ.



НЕ ЎКРАДЗІ!

...Пасля інстытута працаваў я на розных пасадах, у розных калгасах і таму ведаю, што кралі там заўжды. Некага сквапнасць штурхала, некага зайздрасць ці хітрасць, а найчасцей — звычайнае жаданне выкруціцца, з меншымі затратамі пратрымаць сваю гаспадарку, пракарміць сям'ю...

І вось тут ужо вынаходніцтва межаў не мела! Толькі адзін прыклад. У той год падчас жніва збожжа ў нас ссыпалася пад навесы, пад брызент, а то і проста ў кучы пад адкрытым небам — каб прасохла. Сушыць, дасушваць яго прыходзілі вяскоўцы, і адзін з іх — высокі, худы, ногі тонкія — пастаянна чамусьці ў ботах. «Лявоне, хай бы ты абутак змяніў! Табе ж горача, — пашкадаваў небараку кладаўшчык. — Ты ж у гэтых гумовіках ледзьве ногі цягаеш».

Кажа так і прыкмячае, што гарачыня тут абсалютна ні пры чым: той Лявоне ў халявы вялізных ботаў... жыта насыпае і дамоў валачэ. З палову мяшэчка — па дарозе на абед, з палову — вечарам. Як той казаў, курачка па зернетку дзяўбе і сытая бывае...

Цяпер калгасаў ужо няма: ператварыліся ў сельскагаспадарчыя кааператывы, у прыватныя фермерскія гаспадаркі. Але ж прынцып «усё вакол калгаснае — усё вакол маё» дзейнічае па-ранейшаму. Гэта значыць, крадуць людзі. І баяцца хіба таго, каб не злавілі. А варта ж і іншага.

Адну жанчыну (яна з мужам даўно разведзеная, дзеці асобна жывуць) падбілі знаёмцы «ў калгасную бульбу схадзіць». Яна, можа, і не пайшла б, бо колькі ёй адной трэба?.. Але ж апошнім часам у яе каханак з'явіўся... І як быццам сур'ёзны, з сур'ёзнымі, дай Бог, намерамі. Зачасціў, дранічкі яе палюбіў, бабку... А цэны ж цяпер вядомыя...

Карацей — наважылася кабета. У прыцемку, у прызначаным месцы сустрэлася з тымі знаёмцамі, селі ўсе на веласіпеды — паехалі. Толькі ўзяліся капаць — у жанчыны гэтай... мабільнік на ўсё поле звініць. «Вырубі!» — шыпяць «падзельнікі». А як жа ты «вырубіш», калі каханы «на провадзе»?! Яму ж адказаць нешта трэба! То шапнула, што дужа занятая, што потым сама пераззвоніць... і «адключылася».

А таму, як на ліха, цікава, чым канкрэтна яна занятая? Ён яшчэ раз звоніць.

«Бульбакрады» на яе ледзь не з рыдлёўкамі...

Выключыла тэлефон, «на аўтапілоце» назбірала бульбы.

І няшмат, здаецца, часу прайшло — вярнулася дамоў, тэлефануе свайму каханаму, а той размаўляць з ёй не хоча. Яна шчыра, як на духу: «Не магла адказаць. У бульбу хадзіла... Дзеля цябе... Каб было з чаго бабку рабіць». Ён у адказ: «Не падманвай. Там мужчынскія галасы былі». Вось так і пасварыліся...

Дзякаваць Богу, не надоўга! Праз тыдзень-другі той каханак прыехаў. Прывёз ёй чатыры мяхі бульбы. На ўсю зіму. Сказаў, каб болей ніколі не крала.

А мог жа і не прыехаць?

В. ГАЎРЫШ,

г. Чавусы.

ДОКТАР? ЧАРАЎНІК!

У адной вёсачцы жылі сабе дзедды баба. Жылі дружна, добра, мелі сякую-такую гаспадарку: кароўку, свіней, курэй. Хоць і цяжкавата ім было, ды неяк жа спраўляліся. Але ж да часу, бо раптам надарылася бяда — захварэў той дзед. І так яго скруціла, што з ложка не ўстае! Хоць-нехаць трэба ў «хуткую» званіць.

Дакторка, што на той машыне прыехала, хворага абмацала, абгледзела, распытала, што баліць, як баліць. «Ныркі, — дыягназ паставіла, — але ж нічога страшнага... Хоць без бальніцы ніяк... Там паратунак! Там спецыяліст... І вельмі ж добры! Усе яго хваляць! За пару дзён на ногі паставіць...»

Што казаць: не хацелася старому з дому з'язджаць, але нідзе ж не дзенешся, мусіш.

Жонка ўсё патрэбнае стала збіраць: тапкі, брытву, кашулю, што-кольвек з'есці яму, хоць там і кормяць... Бо сваё — яно смачнейшае і не зашкодзіць. Спехам паклала ў пакет колца кілбасы сваёй, «пальцам пханай», шматок сала, слоічак тварагу... Хуценька збегала ў куратнік, схапіла там з дзясятак свежанькіх яец. Бруднаватых, праўда, бы мыць-выціраць не было калі: доктарка ж чакае, а дзед іх любіць — сырымі...

Адвіталіся...

Мігам, можна сказаць, даставілі хворага ў бальніцу, завялі ў палату, палажылі. Той хвалёны ўролаг тут жа прыйшоў — і насамрэч вельмі сур'ёзны, спрактыкаваны, а ўжо, казалі, строгі... Крый Божа не паслухацца яго альбо запярэчыць...

Агледзеў ён дзеда, паразважаў-падумаў, як лячыць, запісаў назначэнні ў картку... Ужо з крэсла ўставаў — кінуў позірк на тумбачку, дзе ляжаў пакет з прывіянтам.

— Памыйце гэтаму дзеду яйцы, — сказаў маладзенькай медсястры.

Апошнія словы дзяўчо зразумела па-свойму. Таму паклікала санітарку, удваіх яны ўзялі хворага пад рукі і павялі ў ванны пакой — выконваць «працэдуру», якую прызначыў доктар.

Назаўтра падчас абходу той зноў выслухаў хворага. Сыходзячы, зноў заўважыў пакет.

— Чаму яйцы не памылі? — спытаў медсястру, што стаяла крыху паводдаль.

— Дык мы ж мылі... Праўда, — зачырванеўшыся, сказала дзяўчына.

— Дрэнна мылі, — незадаволена буркнуў доктар, — хіба спаласнулі, а трэба добра памыць, можа, і рукой дзе пацерці.

Факт, што пасля абходу дзеда зноў павялі пад душ — у строгай адпаведнасці з тым, як загадаў урач, паўтарылі ўсю ўчарашнюю «працэдуру».

Пад абед у палаце хворага з'явілася жонка — праведаць прыехала. Адразу ж згледзела, што дзед не ў гуморы... Ды што там — аніякі зусім: ледзь жывы, спахмурнелы, нават глядзець на яе не хоча, не тое, што размаўляць. Яна ў роспыты: што з табою, чаму?

Той доўга ўпарціўся, але ж ад бабы хіба адчэпішся — прызнаўся:

— Мусіць, мяне кастрыраваць будуць, бо во гэтае месца, — паказаў на ніз жывата, — усё мыюць і мыюць.

Бабка тут жа — у кабінет да ўрача.

...Што яна гаварыла яму, не чуў ніхто, як ён рагатаў — уся бальніца, усе хворыя, з усіх палат. А потым — асобна — з дзедавай, дзе доктар развейваў страхі...

Што далей? Далей, ужо назаўтра, дзед быў абсалютна здаровы. Казалі, што дамоў з той бальніцы ледзь не подбегам бег: доктарка з «хуткай дапамогі» чыстую праўду казала: добры доктар! За пару дзён на ногі паставіў!

Іван КУРСЕВІЧ, *в. Суботнікі, Іўеўскі раён.*

ЛЮБА — З ЛЮБАЙ

Трыццатага верасня, калі адзначаюцца імяніны Веры, Любові, Надзеі, Соф'і, Ільі і Ніла, мы ходзім да суседзяў, бо гэта, як той казаў, сам Бог загадаў: у іх кватэры ледзь не ўсе імёны «сышлія»: гаспадыню завуць Соф'я Іванаўна, яе дачку — Люба, унучку — Надзея, зяця — Ілья...

Ён — у мінулым вайсковец, але пра службу сваю распавядаць не любіць. Так што гісторыю гэту мы пачулі ад жонкі...

Здарылася яна даўно: Ілья тады ваеннае вучылішча скончыў, першы год жанаты быў, першы год працаваў. А сам па сабе ён чалавек сарамлівы... Грэх, вырашылі байчэйшыя сябры, не пасмяцца над такім, нейкі здзек не ўчыніць. Вось і прыдумалі: па дарозе з вайсковых збораў прэзерватывы купілі і падклалі... Думалі, ён дадому прыедзе — жонка, як звычайна, стане рэчы разбіраць. І ўбачыць... І спытае... А ўжо як «падваліць»!

Яны правільна ўсё прыдумалі: прыехаў Ілья, пайшоў мыцца, а абед гатовы быў, таму Люба ўзялася рэчы яго распакоўваць, адбіраць, што трэба памыць... Ну і, вядома ж, пакет знайшла.

— Што гэта? — папыталася ў мужа, калі той памыўся.

Той глядзіць, як баран на новыя вароты, але ж гаворыць:

— Ды гэта... Перад зборамі нам выдавалі... Усім лейтэнантам. На той выпадак, калі нехта з салдатаў пальцы параніць.

(Хлусіць, вядома ж, а жонка за чыстую манету ўсё...)

— І што, — пытаецца, — абышлося? Ніхто не параніў?

— Не.

— Ну, і дзякуй Богу.

Кропка на гэтым? Канец гісторыі? Не! Пачатак, бо назаўтра раніцай Люба ў краму пайшла, па дарозе сваіх знаёмых сустрэла — жонак такіх жа лейтэнантаў. Слова за слова, глядзіш — да збораў размова дайшла, да прэзерватываў. Люба кажа, што выдавалі ўсім. Ілья прывёз.

А іх жа мужы не прывезлі! Дзе падзелі? Ну, вядома ж... Здраджвалі ім! Скарысталі...

Баба, кажуць, сем дум перадумае, пакуль з печы ляціць, а тут дзень да вечара жыць прыйшлося... Ды з падазрэннямі! У абедзвюх, у думках, ледзь да разводаў справа не дайшла!

Карацей, вечарам таго самага дня ў пакоі, які займалі Люба і Ілья, было, як заўсёды, ціха. Сваркі кіпелі ў тых, хто... хацеў з імі жарт састроіць!

Так што продкі нашы праўду казалі: хто яму капае, той сам туды трапляе.

І. КАРОЛЬ, *г. Мінск*

ДАВЯРАЙ ДЫ ПРАВЯРАЙ

У нашым гаражным кааператыве ўсе ведалі, што Мікітавіч — нячысты на руку. Але ж за яе, за гэту руку, як быццам, ніхто не злавіў? Значыць, чалавек — не злодзей?! Да таго ж ён заступнік добрага меў — свайго суседа па гаражы і кума. Той за яго гарою стаяў, заступаўся, ледзь не ў бойку лез, пакуль...

У адну з субот прыйшоў той заступнік у свой гараж (жонка сказала паліцы падрыхтаваць для сваіх «закатак»), адразу ж спусціўся ўніз, у яму, як звычайна, шмат непатрэбнага знайшоў. Паскідваў усё ў мяшок — панёс выкідаць на сметнік. Гараж, вядома ж, не замыкаў. І назад не спяшаўся. Навошта: усе свае там, да таго ж і кум паблізу, у сваім гаражы калупаецца... Так што забавіўся, хвілін праз 20 толькі вярнуўся...

Бачыць — вароты як быццам не так зачынены. А ўнутры... Мікітавіч стаіць. Збялелы... Лапоча, што вось зайшоў, кума нямашака... А сам бокам, бокам — крадзецца да выхаду і пад куртказ хавае штось. Толькі дроцік тырчыць.

— Нешта ты патаўсцеў? Як баба на рассыпанні, — вачам не верыць Мікола. І за дрот той — шморг!

Крысо куртказ тут жа аб'ехала, «агаліла»... скрутак кабелю — навюткага, ва ўсёй красе. Мікола зусім нядаўна яго купіў, збіраўся новую антэну паставіць каля хаты сваёй, дзе бацькі жылі яго, а не кумавы!

— Ах жа ты сладзюга, — кажа таму, — ах жа мярзотнік! Я ж нікому не верыў! Думаў, што людзі брэшуць на цябе. А гэта, выходзіць, праўда?!

— Не, куме, — узмаліўся злодзей, — не вінаваты я! Не краў... Не хацеў: гэты дрот... сам за мяне зачапіўся.

— Я табе пакажу зараз «сам»!..

Народу ў гаражах, лічы, не было, і таму ніхто не бачыў, як Мікола, размахваючы пустым мяшком, гнаўся за кумам.

Сябраваць пасля той «прабежкі» яны перасталі. Тым больш што Мікітавіч неўзабаве гараж свой прадаў. А Мікола толькі праз тры гады (і то пасля пятай чаркі!) расказаў мужыкам пра гэта здарэнне: раней — не мог: сорамна было, што так верыў дрэнаму чалавеку.

Раіса АЎРАМОЎСКАЯ, *г. Гомель*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж чарговае і настойлівае — пішыце!

Чаму чарговае, тлумачыць не трэба. Чаму настойлівае? Ды таму, што амаль кожны з новых расказчыкаў «вясёлых і праўдзівых гісторый» у першых радках ліста прызнаецца, што «Звязду» чытае даўно (нядаўна), але з задавальненнем, што «за гэты час многія аўтары сталі любімымі, а рубрыкі — чаканымі», што «...Народ на провадзе» — гэта жывое сведчанне дабрадушнасці і вынаходлівасці нашых людзей, што кожная падборка — падымае, мяняе настрой, што, прачытаўшы чарговую, і самому хацелася ўзяцца за пяро, нешта распавесці, але...

Якіх толькі прычын чалавек не прыдумляе: «не мог надрукаваць», «баяўся, што напішу з памылкамі...», «не адважваўся», «саромеўся», «адкладваў»...

А... не трэба!

Бацька мой (светлай памяці!) казаў, што адзін — з'еш хоць вала, адна й хвала. А вось разам — ну згадзіцеся — што з'есці, што пасмяяцца... Ды што там — нават паплакаць!

Дай Бог, ад смеху! Пішыце!

Усходні гараскоп на тыдзень

Авенам самы час звярнуцца да начальства з ініцыятыўнай прапановай, а Ракі могуць заняцца карэкціроўкай рыс характару

АВЕН. Надыходзіць светлая паласа ў жыцці. Адна з галоўных задач тыдня — рэалізацыя здольнасцяў. Давядзецца мабілізавацца. Сачыце за сваімі ўчынкамі і словамі — яны павінны быць прадуманымі. Прыслухайцеся да інтуіцыі, выберыце ўдалы момант і падыдзіце з ініцыятыўнымі прапановамі да начальства — яно гэта ацэніць. Імкніцеся кантраляваць эмоцыі і не спрачацца з калегамі, бо станоўчых вынікаў гэта не прынясе.

ЦЯЛЕЦ. Лепш займацца паўсядзённымі справамі, не замахваючыся на нешта новае або ўвогуле глабальнае. У чацвер вас можа адолець раптоўны прыступ ашалелай энергіі — скарыстайце яе з розумам і паспрабуйце не перашкаджаць іншым людзям працаваць і адпачываць. Калі хочацца нешта зрабіць — рабіце, але права змяняць планы навакольных у вас няма.

БЛІЗНЯТЫ. Цяжкасці пераадолены, і таму зараз можна спакойна спачываць на лаўрах. Калі ў вас з якой-небудзь нагоды запланавана на гэты тыдзень вечарынка, усё добра прадумайце. Галоўнае — вызначыць, якую колькасць гасцей вы здольныя прыняць. Карысна знаёміцца і сустракацца з цікавымі людзьмі: выслухоўвайце розныя меркаванні па адным і тым жа пытанні і рабіце свае высновы.

РАК. Можна заняцца карэкціроўкай рыс характару. Плануйце важныя сустрэчы і перамовы на сярэдзіну тыдня. Чым больш актыўнымі вы будзеце — тым большага поспеху дасягнеце. Падзеі чацвярга дазволяць набыць каштоўны практычны досвед. Калі вы ў чымсьці сумняваецеся, не саромейцеся задаць пытанне. Часткай працы можаце падзяліцца з калегамі — яны не пакрыўдзяцца.

ЛЕЎ. Давядзецца разлічваць толькі на свае сілы і ўменне хутка змяняць планы. Вакол вашай персоны могуць закруціцца інтрыгі, і ў нейкай ступені ў гэтым будзе ваша віна: няма чаго спрабаваць выведаць чужыя тайны — сваіх бы не выдаць! Лічыцеся з інтарэсамі дзелавых партнёраў, не стаўце свае амбіцыі вышэй за ўсё. Тыдзень багаты разнастайнымі паломкамі — мае сэнс звярнуць увагу на тэхнічны стан прадметаў, якія вас акружаюць. І заадно — на ўласнае здароўе.

ДЗЕВА. Давядзецца странна рыхтавацца да вечарынкі, калі хочаце, каб яна прынесла задавальненне. Варта праявіць трохі цярпення, каб ажыццявіць сваю задуму. Праўда, для таго, каб усё сапраўды атрымалася так, як хочацца, спатрэбіцца яшчэ трохі шанцавання. У другой палове тыдня магчымы нечаканы паварот да лепшага ў адносінах з навакольнымі: яны вырашаць паднесці вам сюрпрыз, і — о цуд! — ён будзе не толькі прыемным, але і карысным.

ШАЛІ. Перыяд вашага валадарання на небасхіле ўжо скончыўся, час саступаць першынство і ў зямным жыцці. Няхай не ва ўсім, але ў чымсьці адступіць давядзецца, так што загадзя пастаўцеся да гэтага прасцей. Паспрабуйце не выхваляцца яшчэ не даведзенай да канца справай: аб вашай дзейнасці павінны ведаць толькі ў вузкім коле надзейных сяброў. Не варта змагацца за лідарства на працы: чым больш калегіяльнасці, тым больш паспяховымі будуць вашы дзеянні на гэтым тыдні.

СКАРПІЁН. Тыдзень будзе напоўнены разнастайнымі падзеямі і прыемнымі сустрэчамі. Вам можа пашанцаваць шмат у чым — усё залежыць ад таго, да чаго вы зараз імкняцеся. Паспрабуйце раскрыць свой творчы патэнцыял. Можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Калі ў вас з'явіцца пачуццё ўнутранага пратэсту па стаўленні да змены месцаў, варта адмовіцца ад далёкіх камандзіровак.

СТРАЛЕЦ. Ёсць шанц стварыць трывалы падмурак для наступных дасягненняў у працы і творчасці. Поспех будзе грунтавацца на пунктуальнасці і добрасумленнасці. Не дазваляйце навакольным маніпуляваць вамі, не ідзіце на бясконцыя кампрамісы. Уважліва кантралюйце дзейнасць памочнікаў і калег, дзейнічаючы згодна з правілам: «Давярай — але правярай».

КАЗЯРОГ. Аб'ёмы працы могуць значна ўзрасці. Выратуюць толькі ўстойлівасць псіхікі і пачуццё абавязку. Лепш плыць па цячэнні і не фарсіраваць падзеі. У канцы тыдня блізкія людзі нарэшце зразумеюць, хто ў доме сапраўдны гаспадар, і будуць слухацца вас практычна ва ўсім. Так што выхадныя вам прыйдзецца правесці, раздаючы каштоўныя ўказанні.

ВАДАЛЕЙ. Новыя ідэі і планы лепш уважліва прааналізаваць, звярнуць увагу на недахопы і выправіць іх — і толькі пасля гэтага пачаць увасабляць задуманае ў жыццё. Тыдзень будзе вельмі насычаным: верагодныя знаёмствы, сустрэчы, паездкі, паступленне велізарнай колькасці інфармацыі. Не спрабуйце прымаць удзел ва ўсім і выкарыстаць усе магчымасці адразу: гэта прывядзе толькі да таго, што вы наогул нічога не паспееце.

РЫБЫ. Гэты перыяд насычаны разнастайнымі падзеямі, клапатлівы і непрадказальны. Пажадана адкласці сур'ёзныя справы на наступны тыдзень, а цяпер займіцеся творчасцю і рашэннем асабістых праблем. У аўторак разлічвайце на дапамогу сяброў, але паспрабуйце не ўвязвацца ў сварку, якія могуць азмрочыць ваш добры настрой. Пажадана не расказваць пра сябе лішняга, інакш гэта паслужыць падставай для інтрыг і плётак.

МАЦІ НАПАДПІТКУ ЗАКУРЫЛА, ЛЯГЛА СПАЦЬ. СЫН РАТАВАЎСЯ САМ

Пра пажар у жылым доме па вуліцы Савецкай у вёсцы Цішкаўка Рэчыцкага раёна выратавальнікам паведаміла суседка.

Драўляны дом належаў жанчыне 1970 г. н., якая знаходзілася ў дэкрэтным водпуску. У ім пражывала мнагадзетная сям'я з дзевяці чалавек. Муж і трое старэйшых дзяцей былі на працы, сярэдні сын гасцяваў у сябра ў гэтай жа вёсцы, дачка і сын былі на вучобе. Да прыбыцця падраздзялення МНС аднаявскоўцы знайшлі на ганку сына гаспадыні 2007 г.н., які самастойна пакінуў дом падчас пажару. Хлопчыка з падазрэннем на атручэнне прадуктамі гарэння шпіталізавалі, аднак дыягназ пазней не пацвердзіўся. Як высветлілася, маці падчас здарэння была дома — у нецвярозым стане. Падчас пажару яна самастойна пакінула памяшканне, але сына з сабой не забрала. Жанчына вусна патлумачыла (пісаць нешта адмовілася па вышэй згаданай прычыне), што раніцай ужывала спіртныя напоі, а калі прыйшла дадому, закурыла і лягла спаць. Пасля абследавання медыкамі жанчыну шпіталізавалі з дыягназам «апёкі верхніх дыхальных шляхоў».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітара Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПАГОДА Ў ДОМЕ

Канстанцін Міхайлавіч Барэль, што на здымку, узначальвае службу, якая імкнецца, каб у Свіслацкім раёне была добрая пагода ў кожным доме. Афіцыйна — ЖКГ РУП. Вось ужо ў восьмы раз рашальнікі пазіцый на 64-клетачных дошках спаборнічаюць на прызы працаўнікоў калектыву. Конкурс мы так і назвалі «Пагода ў доме». Яго лаўрэатамі былі звяздоўскія чытачы Аляксандр Белы (Наваполацк), Леанід Вітошкін (Гомель), Аляксандра Камінская (Вілейка), Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў), Канстанцін Козел (Гродна), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) і інш.

І ўсё гэта не выпадкова, бо ў Свіслацкім раёне ды і ў цэлым у вобласці старадаўняя гульня ў пашане. Напрыклад, Андрэй Валюк з Гродна — міжнародны гросмайстар, двухразовы чэмпіён свету па рускіх шашках, экс-чэмпіён па бразільскіх. Сам жа дырэктар прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі — кандыдат у майстры. А ў 45-м завочным чэмпіянаце Беларусі ён выканаў норму для прысвоення яму ганаровага звання нацыянальнага майстра спорту: заваяваў залатыя медалі адразу ў абодвух турнірах вышэйшай лігі — па класічнай версіі і з лёсаваннем дэбютаў. Пазнаёмцеся з фрагментам трывалай гульні чэмпіёна ў рамках нашага **бліца-63/5:**

Белыя (Чэлядзюк): a

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Усміхнемся

92% гутарак расіян па тэлефоне — пустая балбатня, — паведамляе сацыялагічная служба Федэральнай Службы Бяспекі.

☺

— У мяне нарадзілася дачка, і я запрашаю вас гэтую справу адзначыць. Але вы самі разумееце, які цяпер час, як цяпер цяжка... Карацей, прыходзьце ўжо п'янымі!

☺

Тлумачальная: «Без камп'ютара я нічога не магу зрабіць, а з камп'ютарам я нічога не раблю».

☺

Маці і сын.

— Сынок, ты навошта ўсім расказаў пра тое, як матэматычка з фізруком цалаваліся?

— Яна сама пра гэта папрасіла.

— Як сама?

— Сказала мне: «Пятроў, ты чаго на задняй парце рагочаш? Раскажы ўсім, мы таксама пасмяемся!»

АДКАЗЫ
НА СКАНВОРД
Па гарызанталі: Гімнастыка. Рань. Жарт. Кол. Хата. Кіоск. Волга. Акно. Лік. Кнопы. Нерв. Ідэя. Гай. Рота. Анук. Мак. Кактус. Арава. Прагнік. Ула. Вечар. Дора. Зра. Кір. Спас. Бокс. Рассада. Кардон. Лот. Тунэль. Тэлепнік. Май. Карамель.
Па вертыкалі: Гімнаст. Ракета. Арка. Кенар. Ком. Манто. Арава. Док. Ягня. Гай. Рота. Анук. Мак. Кактус. Арава. Прагнік. Ула. Вечар. Дора. Зра. Кір. Спас. Бокс. Рассада. Кардон. Лот. Тунэль. Тэлепнік. Май. Карамель.

І Ў «ЛІСТАПАДА» ЁСЦЬ ВОЧЫ

XVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» пройдзе ў Мінску з 5 па 12 лістапада. Днямі агучылі назвы фільмаў-удзельнікаў, імёны журы і некаторыя цікавыя асаблівасці сёлетняга кінафэсту.

Кінафестываль «Лістапад» пройдзе пад дэвізам: «З шырока расплюшчанымі вачыма». То бок, будзе працягваць канцэпцыю мінулага года пра тое, што кіно павінна не падпарадкоўвацца гледачу, а выхоўваць яго. Здзіўляць і «расплюшчваць» вочы. Нездарма сёлета і дызайн фестывалю крыху змяніўся — усю друкаваную прадукцыю і новую версію сайта «Лістапада» ўпрыгожваюць вочы людзей розных нацыянальнасцяў.

— Думаю, што хопіць ужо гэтага надта спажывецкага стаўлення да кінематографа, — мяркуе **дырэктар праграмы ігравога кіно Ігар СУКМАНАЎ**. — Мы хочам, каб наш кінафестываль сапраўды адпавядаў культурнаму ўзроўню сталіцы і каб яго не сорамна было параўнаць з кінафестывалямі іншых еўрапейскіх сталіц.

Менавіта таму і праграма сёлетняга «Лістапада» адрозніваецца высокім мастацкім узроўнем і нават пэўнай экзотыкай. У трох галоўных конкурсах (ігравое кіно, дакументальнае кіно, дзіцячае кіно) возьмуць удзел кінематаграфісты з усяго свету. І ўпершыню на «Лістападзе» пакажуць карціны з Аргенціны, Бразіліі, Мексікі, Ірландыі, Тайланда. У асноўным конкурсе праграмы ігравога кіно шмат фільмаў, якія ўжо высока ацанілі на іншых міжнародных кінафестывалях класа «А». Беларускі глядач зможа ацаніць і скандальны расійскі «Шапіто-шоу» Сяргея Лобана, і «Паляўнічага» Бакура Бакурадзэ, і польскі фільм «Эратум» Марэка Лехкія, а таксама шмат чаго іншага. Не менш цікавымі будуць праграмы дакументальнага і дзіцячага кіно. «Лістападзік», які прэзентуе шмат цікавых дзіцячых фільмаў, пачнецца святам дзіцячага кіно 4 лістапада ў кінатэатры «Піянер».

Наогул, конкурсны і пазаконкурсны паказы «Лістапада» пройдуць у Мінску на чатырох пляцоўках: дакументальнае кіно ў «Цэнтры-відэа», ігравое ў кінатэатрах «Цэнтральны» і пазаконкурсныя паказы ў «Доме кіно» і кінатэатры «Перамога». Сёлета «Лістапад» часова акрэдытаваны Міжнароднай асацыяцыяй кінапрадзюсараў, прычым адной з галоўных умоў гэтай акрэдытацыі быў паказ конкурсных фільмаў у цэнтральных кінатэатрах горада.

Святлана ШЫЦІКАВА, в.а. дырэктара Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры, распавядае:

— У апошні час Міністэрства культуры праводзіць палітыку па прыцягненні пазабюджэтных крыніц фінансавання на правядзенне разнастайных буйных фестываляў. Напрыклад, сёлета доля спонсарскай дапамогі на «Славянскім базары ў Віцебску» стала ў 2,8 раза большай, чым летась. Што тычыцца «Лістапада», то каля 45% фестывальных расходаў узялі на сябе спонсары фестывалю. Што змянілася ў правядзенні і арганізацыі кінафэсту? У нас створана пастаянная дырэкцыя. Сёлета яна ўдзельнічала ў найбуйнейшых міжнародных фестывалях і кінарынках: Каны, Берлін, Кракаў, Санкт-Пецярбург, Ераван і інш. І ў гэтым годзе мы ўпершыню закупляем 100% фільмакопій. Летась толькі 40% купляла Міністэрства культуры, астатнія 60% — УП «Кінавідэапракат».

Цікава, што пакуль бюджэт фестывалю «Лістапад-2011» так і не назвалі. Для параўнання: на мінулагодні фэст было патрачана 1 млрд 400 млн руб. Па словах **Анжэлікі КРАШЭЎСКАЙ, дырэктара «Лістапада»,** сярэдні кінафестываль у Еўропе абыходзіцца ў 500 тысяч долараў, і айчынны «Лістапад» яшчэ істотна недацягвае да гэтай сумы.

Судзіць удзельнікаў «Лістапада» будуць кінематаграфісты з сусветна вядомымі імёнамі. Варта назваць хоць бы старшыню журы. Уладзімір Граматыкаў, рэжысёр славутых дзіцячых фільмаў «Вусаты нянь» і «Ішоў сабака па раялі» ўзначаліць журы дзіцячага кіно. Расійскі сцэнарыст і рэжысёр Марына Разбежкіна і прэзідэнт Расійскага фестывалю антрапалагічных фільмаў Андрэй Галаўнёў узначаляць секцыі дакументальнага кіно. Старшынёй журы маладога ігравога кіно стане аўстралійскі прадзюсар Кэтрын Шэлпер, якая летась прывезла на «Лістапад» фільм «Самсон і Даліла», а журы асноўнага конкурсу ўзначаліць вядомы ў свеце рэжысёр, акцёр і сцэнарыст з Кыргызстана Актан Арым Кубат. Дарэчы, летась яго фільм «Свет Аке» атрымаў некалькі ўзнагарод на беларускім кінафестывалі.

Мноства пазаконкурсных мерапрыемстваў будзе адбывацца ў межах «Лістапада». Беларускія сінефілы змогуць паглядзець карэйскае, польскае, расійскае, беларускае кіно, сабранае ў асобныя праграмы-панарамы нацыянальных кінематаграфій. Прычым жанрава гэтыя праграмы будуць вельмі стракатымі: ад радыкальнага аўтарскага кіно да дынамічных прыгодніцкіх фільмаў. Гэта і «Мая дзяўчына — спецагент» карэйца Тэры Шына, і «Нуль» паляка Паўла Бароўскі, і «У стылі jazz» Станіслава Гаварухіна. Захапляльным відовішчам стане кінаканцэрт «Жорж Мельес», які ладзіцца пры падтрымцы пасольства Францыі ў Беларусі. 11 лістапада ў малой зале Палаца Рэспублікі нашчадкі піянера сусветнага кіно Жоржа Мельеса Мары-Элен Леерысэ і Лорэнс Леерысэ прэзентуюць арыгінальныя кінаролікі Жоржа Мельеса, якія будуць суправаджацца, як у 1900-ыя гг., піяністам і зазывалам.

Адкрыццё «Лістапада-2011» адбудзецца 5 лістапада ў Палацы Рэспублікі. Фестываль адкрыце стужка Андрэя Звягінцава «Алена». Прадставіць фільм беларускай публіцы прыедзе сам рэжысёр разам са здымачнай групай. Праўда, фільмам закрыцця сёлета не стане фільм-пераможца — гэта звязана з тэхнічнымі нюансамі. Фільмы, якія бяруць удзел у «Лістападзе» — нашумелыя ў свеце кінакарціны, копіі якіх адразу пасля паказу ў конкурсе «Лістапада» адпраўляюцца на іншыя фестывалі. Таму на закрыцці гледачам пакажуць вытанчаную французскую трагікамедыю «Жанчыны з шостага паверха» Філіпа Ле Гюэ. Такім чынам, раўнавага паміж экстрэмальным аўтарскім кіно і якасным кіно для масавага гледача будзе дасягнута.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

У шматкватэрных дамах могуць забараніць трымаць сабак патэнцыйна небяспечных парод

Забарона на ўтрыманне ў шматкватэрных дамах сабак патэнцыйна небяспечных парод і іх мяшанцаў (за выключэннем нямецкага дога, усходне-еўрапейскай і нямецкай аўчарак) прадугледжана законапраектам «Аб абыходжанні з жывёламі». Пра гэта паведаміў намеснік начальніка аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мацукевіч. Паводле яго слоў, сабак такіх парод змогуць заводзіць толькі ўладальнікі прыватных дамоў пры ўмове, што прастора гадаванца на прыдамавой тэрыторыі будзе абмежавана вальерам або жывёла будзе сядзець на прывязі за двухметровай агароджай. Акрамя таго, згодна з законапраектам, у кватэры або прыватным доме дазваляецца трымаць не больш за двух сабак на сям'ю (на аднаго ўласніка або наймальніка). У Беларусі зацверджаны пералік з 40 патэнцыйна небяспечных парод сабак.

«Мінск—Навіны».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.09	17.37	9.28
Віцебск —	8.02	17.23	9.21
Магілёў —	7.59	17.27	9.28
Гомель —	7.51	17.28	9.37
Гродна —	8.23	17.53	9.30
Брэст —	8.19	17.58	9.39

Месяц

Першая квадра 2 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Пелагеі, Мікалая, Сяргея, Юльяна.*

К. *Ірэны, Віталя, Яна.*

Дзве даты

1 лістапада

1908 год — нарадзілася (г. Мінск) Яўгенія Пфляўмбаум, беларуская паэтэса. «Мой лёс круты, як лес густы...» — менавіта гэтакі быў яе лёс, беларускай паэткі з нямецкім прозвішчам (маці Алена Кандратаўна Лагун, родам з Сенніцы, а бацька, Эргард Карлавіч Пфляўмбаум, — з запрошаных для працы ў мінскім дэпо нямецкіх чыгуначнікаў). Пачынаўся яе жыццёвы шлях светла, шчасліва. Рана захапілася родным друкаваным словам і ў шаснаццацігадовым узросце дэбютавала на газетнай старонцы вершам «Пялёсткі восені». Гэта ў той час (1925 год), калі вучылася ў знаным Белпедтэхнікуме і з захапленнем слухала лекцыі Якуба Коласа і Міхаіла Пятуховіча. Неўзабаве выдала разам са сваімі равесніцамі, таварышкамі па вучобе ў педтэхнікуме зборнік пад сарамліва-сціплаю па-дзявочы назваю «Вершы». Затым працавала ў Кніжнай палаце пры Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі, у газеце «Звязда». У 1933 годзе выехала ў Сібір услед за сваім рэпрэсаваным мужам Максімам Лужаніным. У 1935-45 гадах працуе ў Абаронным дзяржаўным выдавецтве ў Маскве. З 1945 г. жыла ў Мінску. Аўтар калектыўнай кнігі «Вершы», паэтычных зборнікаў «Сувой жыцця», «На заходзе сонца». Памерла ў 1996 годзе.

1993 год — уступіў у сілу Маастрыхцкі дагавор, які паклаў пачатак Еўрапейскаму саюзу і які ўрэгулёўваў фінансавыя і палітычныя пытанні ўзаемаадносін краін Еўропы. Менавіта Маастрыхтскі дагавор «уводзіў» у абарачэнне новую грашовую адзінку — еўра, а таксама вызначаў шэраг пытанняў, якія тычацца эканомікі і сацыяльнай палітыкі, міжнародных адносін і бяспекі, правасуддзя і ўнутраных спраў. Дагавор быў падпісаны дванаццаццю краінамі — Бельгіяй, Германіяй, Італіяй, Нідэрландамі, Люксембургам, Францыяй, Вялікабрытаніяй, Даніяй, Ірландыяй, Грэцыяй, Партугаліяй, Іспаніяй.

Цытата дня:

«Штодзённа сама прырода нагадвае нам, як мала ёй трэба».

Марк Тулій Цыцэрон (106—43 да н.э.), рымскі палітычны дзеяч, пісьменнік.

Казкі для дарослых

ЯК ХВАРОБА...

ІМА ў той год была неверагодна марозная і снежная. Палова іх курса хварэла і не хадзіла на лекцыі. Астатнія, карыстаючыся момантам, хадзілі бессістэмна і хаатычна. Нават выкладчыкі, якіх да гэтага рэспіраторна-вірусныя інфекцыі абыходзілі бокам, пачалі прыкметна здаваць пазіцыі. Гісторык Барыс Альбертавіч, спазніўшыся на пятнаццаць хвілін на ўласную пару, якая ў раскладзе значылася апошняй, заявіў, што нарэшце зразумеў, чаму армія Напалеона прайграла вайну, і адпусціў рэшткі курса па дамах.

— Ты чуеш, Марго, нас адпраўляюць на ўсе чатыры бакі!..

Яна адарвалася ад сшытка, дзе за хвіліну да гэтага малявала невядома які па ліку барадаты твар у акулярах, які нагадваў ці то сонную фізіяномію Барыса Альбертавіча, ці то пакамечаны «фэйс» піцерскай рок-зоркі, і паглядзела на аднакурсніка адчужаным позіркам.

— Што?

Іх адпускаюць? Куды? Навошта?.. Яна ж дамовілася з Косцем, што ён будзе сустракаць яе з заняткаў толькі праз дзве гадзіны. І што цяпер рабіць? Патэлефанаваць? Не, ён не дазваляе тэлефанаваць яму, калі знаходзіцца на працы. Ды і нічога яе звонак не зменіць: праца для Косці — святое. Ці ўсё ж патэлефанаваць? Ну, можа ён хоць раз зрабіць для яе выключэнне? Усіх хворых усё роўна не вылечыш, хоць Косця і імкнецца. Ён стараецца, а хворыя не заканчваюцца. І Косця сядзіць у сваёй паліклініцы да апошняга, у сэнсе, пакуль не прыме апошняга пацыента. А яны, ведаючы гэта, ідуць і ідуць...

* * *

— Канстанцін Віктаравіч, вас да тэлефона!

— Ірына Вікенцеўна, я ж прасіў не турбаваць мяне падчас прыёму!

— Сказалі, гэта тэрмінова, пытанне жыцця і смерці...

— Так ужо і смерці... Хто сказаў?

— Прыемны жаночы голас...

— Жаночыя галасы, Ірына Вікенцеўна, усе прыемныя.

— Дык вы падыдзеце?

— Падыду...

Прахожыя хуталіся ў футры і смешна перасоўваліся па заледзянелых дарожках сквера. Тысячы сняжынак мітусіліся вакол ліхтароў, выконваючы свой вар'яцкі танец... Марго, закінуўшы назад галаву і заплюшчыўшы вочы, чакала, пакуль яны апусцяцца на твар. Твар, нягледзячы на мінус пятнаццаць па Цэльсію, быў гарачым.

Косця мякка павярнуў яе да сябе. З валасоў пасыпаліся сняжынкі.

— Маруська, ну колькі можна табе гаварыць? Надзень шапку!.. Замерзнеш, захварэеш, пачнеш кашляць, хлюпаць носам... Нос, між іншым, стане чырвоным, распухне... Як тады з табой цалавацца?

Марго прыціснулася да яго, зарываючыся тварам у каўнер яго цёплага світара. Світар ледзь улоўна пах ёдам і бальнічнымі бінтамі...

— ...І ў наступны раз, калі ласка, не трэба так палохаць Ірыну Вікенцеўну, — сказаў ён ужо больш строга.

— Яе напалохаеш... Гэта ж доктар Хаус у спадніцы! Увесь час да ўсіх чапляецца, робіць заўвагі... А ў самой, напэўна, адно ў галаве...

— Маша, як табе не сорамна! Ірына Вікенцеўна мае права рабіць мне заўвагі. Па-першае, яна ўжо сто гадоў працуе медсястрой, а па-другое, у яе залатыя рукі...

— ...І зубы!

— З чаго ты ўзяла?!

— Ну, калі яна працуе сто гадоў і ўвесь час кагосьці грызе...

Ён пачаў смяяцца, спачатку ціха, потым гучна і залівіста. Падхапіў яе на рукі і закружыў... Вакол кружыліся ліхтары і танцавалі сняжынкі... Марго скасочыла з рук і паваліла яго на снег. Удваіх яны качаліся ў гурбе і рагаталі. Выпадковыя прахожыя шарахаліся ў бакі.

— Усё, Маруська, злазь, няма чым дыхаць, — узмаліўся ён.

Яна неахвотна паднялася, страсаючы з курткі і боцікаў снег, падала яму руку. Ён лёгка ўскочыў на ногі і стаў побач з ёю — высокі і худы. Шалік разматаўся, не па сезоне лёгкае паліто раздзімалася ад ветру.

— Ой, ты, напэўна, галодны? — спытала Марго.

— Ну... калі можна лічыць вячэрай ранішні бутэрброд, то... не, не галодны.

— Тады ўставай і пойдзем вячэраць.

— Вось дык сюрпрыз! Ты навучылася гатаваць?

— Я — не, але мая сястра робіць гэта выдатна.

— Угаварыла... Толькі надзень шапку, а то прастудзішся.

— А ты не будзь занудам...

Фота з сайта

* * *

Ангеліна прыдзірліва агледзела іх з ног да галавы, фыркнула, загадала скідваць вопратку, пераабувацца ў тапачкі, мыць рукі (пра гэта можна было б і не нагадваць, але сястра такая) і садзіцца за стол. Стол, накрыты даўнейшым бабуліным абрусам, стаяў пасярод невялікай залы, абстаўленай у стылі мінімалізму — нічога лішняга, усё самае неабходнае. З кухні даносіўся пах пірага з карыцай...

Яна што, кагосьці чакала?

— Ты кагосьці чакала? — спытала Марго.

— Чаму ты так вырашыла?

Гэта не вельмі ветліва — адказваць пытаннем на пытанне, але Ангеліна заўсёды так робіць.

— Дык чаму ты вырашыла, што я чакаю кагосьці?

— З-за пірага.

— Падумаеш, — сястра пацяснула плячыма. — Я апошнім часам часта нешта пяку, гэта абсалютна нічога не азначае.

— І вяжаш шкарпэткі?

— У сэнсе? — яе акуляры спаўзлі на кончык носа, і Ангеліна паглядзела на Марго зверху іх.

— Ну, там, дзе ёсць пірагі, абавязкова павінны прысутнічаць і вязаныя шкарпэткі. Глядзі, сама не заўважыш, як ператворышся ў векавуху.

— Закрый рот і ідзі мыць кубкі, інакш твой аднакурснік застанецца галодным.

— Косця не аднакурснік, ён хірург, — пакрыўдзілася Марго.

— Як быццам хірургі не бываюць галоднымі! — адрэзала сястра.

— Гэта азначае, што можна садзіцца за стол? — удакладніў Косця.

— Які ён у цябе здагадлівы!

* * *

Пірог з яблыкамі і карыцай аказаўся проста фантастыкай, таму Марго настроена міралюбіва. Яна амаль засынае, паклаўшы галаву на сашчэпленыя далоні. Галава перыядычна звальваецца, але Марго апошнім намаганнем волі вяртае яе ў зыходнае становішча. Ангеліна ўпарта і мэтанакіравана скануе Косцю, спрабуючы дакапацца да сутнасці і вычапіць нешта такое, што дасць ёй патрэбную інфармацыю пра «аб'ект» даследавання.

— Канстанцін, вы любіце Маркеса?

— Я не люблю Маркеса, я люблю Вішнеўскага.

— Спадзяюся, вы маеце на ўвазе не мазь? — кпліва ўдакладняе Ангеліна.

Ну ўсё, зараз яна яго з'есць і закусіць сваім пірагом. Неабходна тэрмінова яго ратаваць. Марго паднімаецца з крэсла.

— Ліна, нам трэба ісці. Косціку заўтра рана ўставаць.

— Не так ужо і рана, — пярэчыць ён. — У мяне другая змена, так што паспею выспацца.

* * *

...Калі гэта не каханне — тады што? А калі гэта каханне, чаму ўвесь час так балюча? Хто і ў якім законе напісаў, што закаханыя павінны пакутаваць? Чаму нельга кахаць лёгка і прыгожа, а абавязкова трэба дзяўбсці адно аднаму душу і рваць сэрца? Прычым не адразу рваць, а адшчыкваць па кавалку, пераконваючы сябе, што менавіта гэта і ёсць каханне, што менавіта так яно і павінна праяўляцца...

Марго ляжыць у ложку пад тоўстай коўдрай, у цёплай піжаме і вязаных шкарпэтках. У яе тэмпература і моцны кашаль, які не дае засарадзіцца на галоўным. Яна спрабуе славіць гэтае галоўнае, выхапіць яго з бяздоння думак, прэпарыраваць і раскласці па паліцах. Але яно ўвесь час выслізгвае і выкручваецца, быццам гуляе ў хованкі... Марго нікога не хоча бачыць, акрамя Косці. А Косця, як заўсёды, заняты працай. У яго, як заўсёды, процьма хворых.

Патэлефанавала маці — зразумела, з камандзіроўкі. («Уяўляеш, тут цвітуць мімозы!.. Я купіла сабе цудоўную сумачку з кракадзілавай скуры, хоць цэны проста жудасныя. Не сумуй... Цалую!») Заехала Ангеліна, прывезла курыны булён з піражкамі. Правяла пальцам па паліраванай паверхні стала, паморшчылася, сказала, што мікробы ў такіх умовах не гінуць, а ловяць кайф, загадала залезці пад коўдру з галавой і расчыніла ўсе форткі...

Косця забег праз некалькі дзён «на пару хвілін». Сеў побач, памераў ёй тэмпературу, папрасіў адкрыць рот і паказаць язык.

— Жыць будзеце, хворая, — сказаў напаўжартам. — Прычым доўга і шчасліва.

Яна ўзяла яго за руку — далонь была сухая і халодная з марозу, прыклала да сваёй шчакі.

— Застанься...

— На ноч?

— На ноч, на дзень... Назаўсёды. Хачу засынаць і прачынацца побач з табой, бачыць твой твар, цалаваць яго, праводзіць цябе на працу, чакаць, гуляць з табой вечарам па парку, шукаць на небе Вялікую Мядзведзіцу, слухаць дождж...

Ён падняўся, пагладзіў яе па валасах і пацалаваў — некуды паміж носам і шчакой.

— Ты ўся гарыш... Можа, выклікаць «хуткую»?

— Баюся, яна мне не дапаможа.

— Тады прымі хаця б гэтыя лекі.

— У цябе ёсць лекі ад кахання? Які ты дзіўны...

— Марго, я патэлефаную тваёй сястры і скажу, што ты...

— А пры чым тут мая сястра?

* * *

...Зіма скончылася гэтак жа нечакана, як і пачалася. Снег абсеў і стаў шэрым, з дахаў капала, пад вокнамі лямантавалі каты...

Недзе ў сярэдзіне вясны Косця перабраўся да Ангеліны, і яго жыццё набыло, нарэшце, пэўную ўпарадкаванасць. Па вечарах яна корміць яго баршчом і блінамі, а ён яе — гісторыямі хвароб сваіх пацыентаў. Здаецца, яны знайшлі адно аднаго.

Не так даўно Марго была ў іх у гасцях... Ну, не тое каб была і не зусім у гасцях... Дайшла да парога, пастаяла перад дзвярыма, пераступаючы з нагі на нагу... Але так і не адважылася пазваніць.

Сапраўды, навошта перашкаджаць чужому шчасцю?

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

КОШКА І КОТ

Кошка (кот) — хатняя жывёла, да якой у народзе заўсёды ставіліся неадназначна. З аднаго боку, кату дазвалялася жыць у хаце ў непасрэднай блізкасці з чалавекам, з другога боку, яго лічылі прадстаўніком свету нячыстай сілы. Ката паважалі за яго бязмежную грацыёзнасць літаральна ва ўсім: у руху, у посадцы, пры мыцці ці на паляванні, што таксама было знешняй праявай глыбокага ўнутранага спакою і самадастатковасці. Сярод іншых хатніх жывёл кошка вылучалася чысцінёй. Нашы продкі разводзілі катоў, у першую чаргу, каб ахоўваць зернясховішчы ад пацукоў і іншых грызуноў. У народным паданні аб Ноевым каўчэгу Ной заткнуў шчыліну, якую прагрыз пацук — д'ябальскае стварэнне, хусткай, а Бог ператварыў хустку ў кошку, каб яна лавіла пацукоў.

● Нашы прашчуры пакланяліся Сонцу як крыніцы жыццёвай энергіі, Месяцу — як пасрэдніку паміж святлом і цемрай. Кошкі надзяляліся сімвалічнымі якасцямі абодвух целаў: з аднаго боку, кот — донар жыцця, з другога, кашэчыя вочы свецяцца ў цемры, таму яго надзялялі якасцямі Месяца.

● У народным асяродку цанілі характар гэтай жывёлы і адводзілі ёй ролю хатняй, блізкай да чалавека істоты. Нашы продкі лічылі, што мурканне кошкі — гэта своеасаблівая малітва за выратаванне гаспадара, які ў гэты момант знаходзіцца па-за межамі хаты.

● Разам з тым існаваў і такі вобраз кошкі, які сімвалізаваў ляноту і сладастраснасць. Часам жанчыну параўноўвалі з кошкай і надзялялі яе такімі якасцямі, як распушчанасць, схільнасць да варажбы і магіі. Незалежны нораў кошкі, начныя вандроўкі, агеньчык у вачах, які можна заўважыць нават у цемры, — усё гэта выклікала хутчэй жах, уздзейнічала, як пагроза. Кашэчыя вочы называлі «акенцамі ў іншы свет».

● Асаблівая сімвалічная роля прыпісвалася чорным і трохкаляровым кошкам. Лічылася, што трохкаляровыя кошкі ахоўваюць хату ад пажараў. Той, хто забіваў такую кошку, на працягу сямі гадоў павінен быў чакаць пакарання за здзейсненае. Па меркаваннях старых людзей, трохкаляровая (а асабліва сямікаляровая) кошка прынясе ў хату шчасце, а чорная кошка абароніць ад рабаўнікоў.

● Сярод славян здавён жыве вера ў тое, што чорная кошка, якая перайшла дарогу, нясе непрыемнасці, няўдачу, і таму няма сэнсу працягваць надалей свой шлях — лепш вярнуцца дадому. Цікава, але ў Англіі, наадварот, лічаць, што няшчасце нясуць белыя кошкі, а чорныя — поспех.

● Для тых, хто ішоў у мора, кошкі заўсёды былі талісманам, які ахоўваў іх ад злых духаў. Жонкі маракоў трымалі ў хаце чорную кошку, таму што яна павінна была ахоўваць мужа ад няшчасцяў, а на кожным караблі можна было заўсёды знайсці хаця б адну кошку. Прысутнасць гэтай жывёлы засцерагала таксама ад нашэсця пацукоў, якія знішчалі прадукты.

● Усе акцёры і супрацоўнікі тэатраў трымалі кошак, бо лічылі, што яны прыносяць поспех.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Валютчыка будуць судзіць

Упраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў дачыненні да полацкага «індывідуальнага банкіра».

Устаноўлена, што гэты жыхар Полацка 1987 года нараджэння сёлета з чэрвеня па верасень, ажыццяўляючы незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з правядзеннем валютна-абменных аперацый, атрымаў прыбытак у памеры 42,4 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5231 Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12